WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 КАСТРЫЧНІКА 2010 г.
СУБОТА
№ 208
(26816)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Падчас акцыі ахвотныя змогуць набыць дровы па сімвалічных цэнах

У добраахвотнай акцыі Міністэрства лясной гаспадаркі «Наш чысты лес», што запланаваная на 23 кастрычніка, будуць браць удзел каля 10 тысяч чалавек.

Дарэчы, як удакладніла карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар міністэрства Ружэна Навіцкая, у месцах, дзе будуць весціся работы па добраўпарадкаванні, усе ахвотныя — члены садаводчых таварыстваў, вяскоўцы з навакольных населеных пунктаў — змогуць па сімвалічных цэнах набыць на дровы ветравальна-бураломную драўніну. На месцы будзе прысутнічаць бухгалтар лясніцтва, якому адразу на месцы наяўнымі грашыма па квітанцыі можна будзе аплаціць неабходны чалавеку аб'ём драўніны. Калі такі грамадзянін цалкам самастойна будзе займацца нарыхтоўкай дроў: прыедзе на сваім транспарце, будзе сам выцягваць ствалы, пілаваць іх як яму патрэбна і грузіць у транспарт, тады адзін кубічны метр драўніны будзе каштаваць такому нарыхтоўшчыку ад 400 да 500 рублёў у залежнасці ад пароды драўніны. Самая «дарагая» — бяроза, 490 рублёў за кубаметр. Калі ж ахвотнаму такім чынам падчас нарыхтоўкі дроў спатрэбіцца дапамога брыгады з лясніцтва, тады выпісаць іх будзе каштаваць 13-15 тысяч за кубічны метр.

Сяргей РАСОЛЬКА.

З БУДУЧЫНЯЙ — НАЧЫСТУЮ!

Учора кіраўнік дзяржавы сустрэўся з удзельнікамі Усебеларускай акцыі «Пытанне Прэзідэнту», наладжанай Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі і піянерскай арганізацыяй краіны. Магчымасцю задаць пытанне першай асобе дзяржавы ў рамках акцыі скарысталася каля трох тысяч чалавек. У асноўным — школьнікі, навучэнцы прафтэхвучылішчаў, студэнты з розных куткоў Беларусі. 60 хлопцаў і дзяўчат, чые пытанні аказаліся самымі цікавымі ці хвалявалі вялікую колькасць прадстаўнікоў падрастаючага пакалення, запрасілі ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі. Тут іх цікавасць задаволіў асабіста Аляксандр Лукашэнка. Трэба адзначыць, што дзяцей і моладзь хвалявалі як вузкія, асабістыя моманты, так і тэмы адукацыі, службы ў войску, міжнародных адносін, развіцця нашай краіны. Каля 15 працэнтаў удзельнікаў акцыі задалі кіраўніку дзяржавы пытанні асабістага характару.

Фота БЕЛТА.

Адкрываючы сустрэчу, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў значнасць падобных акцый. На яго думку, пытанні ад моладзі — своеасаблівы барометр не толькі таго, што цікавіць Беларусь сёння, але і таго, якія праблемы краіна хацела б вырашыць заўтра. Таму, калі Прэзідэнт даведаўся пра акцыю моладзевых арганізацый, папрасіў, каб усе пытанні, вырашаць якія патрэбна на дзяржаўным узроўні, былі прапрацаваныя адпаведнымі органамі ўлады.

Фота БЕЛТА.

Звяртаючыся да моладзі, Прэзідэнт адзначыў: «Тое, што вы маеце, успрымаецца як належнае. Вам, напэўна, цяжка ўявіць, што можа быць інакш. Але ж усё пазнаецца ў параўнанні. Вы наўрад ці добра помніце тое, што было пасля распаду Савецкага Саюза». «Вашы бацькі помняць, што адбывалася, калі наша краіна толькі набыла незалежнасць, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Было нялёгка, але мы далі сабе слова, што пабудуем краіну, у якой будзе камфортна жыць людзям, і будучыя пакаленні будуць ганарыцца сваёй зямлёй і сваёй краінай. Мы нямала ў гэтым напрамку зрабілі і нават у чымсьці дасягнулі поспехаў».

Удзельнікаў акцыі цікавіла, як Аляксандр Лукашэнка ставіцца да БРСМ, а таксама пра тое, ці не з'яўляецца гэтая арганізацыя вяртаннем да мінулага — да камсамола.

Паводле слоў Прэзідэнта, ён каля сямі гадоў працаваў у камсамоле і бачыў усе недахопы гэтай арганізацыі. «Я бачыў тую недарэчнасць, якая была тады, фармалізм, бесталковасць, калі ад нас патрабавалі незразумела што», — сказаў ён. Разам з тым у дзейнасці камсамола было і шмат добрага, і гэтага добрага было больш.

«Гады, праведзеныя ў камсамоле, прасувязі з гэтым ён падкрэсліў значнасць моладзевых і дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў. «Калі наша моладзевая арганізацыя будзе такой уплывовай, як калісьці быў камсамол, думаю, я буду шчаслівым чалавекам, таму што мне некалі давялося ініцыіраваць адраджэнне гэтай моладзевай арганізацыі. А наогул я асабіста ганаруся нашай моладдзю, нашым падрастаючым пакаленнем, тымі дзецьмі, якія, напрыклад, перамагаюць на міжнародных прадметных алімпіядах, праславілі краіну на дзіцячым «Еўрабачанні», адстойваюць гонар Беларусі ў спорце, і ўсімі юнымі беларусамі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Хлопчык з Баранавічаў, які ў будучым хацеў бы працаваць на знакамітай птушкафабрыцы «Дружба» і нават узначаліць яе, пацікавіўся ў кіраўніка дзяржавы сакрэтамі поспеху. На думку Прэзідэнта, галоўнае — гэта настойлівае імкненне да мэты.

«Галоўны складальнік поспеху — гэта тваё імкненне, тваё жаданне ісці, паўзці, караскацца да той вяршыні, якую ты бачыш і якую вызначыў сабе як мэту ў жыцці», — лічыць кіраўнік дзяржавы. Сярод якасцяў чалавека, неабходных для дасягнення поспеху, Аляксандр Лукашэнка вылучыў таксама адукаванасць і цвёрды характар. Акрамя таго, на яго думку, неабходна быць сумленным, шчырым і справядлівым.

Гаворачы пра сябе, пра той час, калі ён стаў Прэзідэнтам, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Гэта, напэўна, поспех — стаць прэзідэнтам, першым у дзяржаве — гэта пачэсна, ды яшчэ ў 38 гадоў. У гэтым узросце чалавек, напэўна, яшчэ не зусім гатовы быць прэзідэнтам. Мы вырашылі зрабіць жыццё людзей лепшым, народ паглядзеў і даверыў гэтую пасаду». «Сказаць, чаму гэта адбылося, я не магу, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Тут сышлося вельмі многае, але я не хачу цяпер аналізаваць гэтае пытанне».

Безумоўна, многіх юнакоў хвалюе пытанне тэрміновай службы ў войску.

Поўны перавод арміі на кантрактную аснову ў Беларусі не плануецца, паведаміў Галоўнакамандуючы. Часта паняцці аб «прафесійнай» і «кантрактнай» арміі падмяняюцца. «... І што значыць — перавод арміі на прафесійную аснову? У нас уся армія прафесійная».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі завершаная рэформа Узброеных Сіл, у далейшым жа будуць дашліфоўвацца асобныя моманты. Прэзідэнт адзначыў, што ў краіне вызначаныя тыя пасады, дзе людзі павінны служыць прафесійна. Ёсць вялікі пласт прафесій і спецыяльнасцяў, дзе маладыя хлопцы нясуць тэрміновую службу. У той жа час Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што існуе праблема: з той колькасцю Узброеных Сіл, якая існуе, не ахопліваецца службай усё мужчынскае насельніцтва.

СТАР. 2

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

АВІЯРЭЙСАЎ ВА УКРАІНУ — БОЛЬШ

З лістапада колькасць авіярэйсаў паміж Беларуссю і Украінай павялічыцца да дзесяці ў тыдзень.

Кампанія «АэраСвіт — Украінскія авіялініі» з 1 лістапада прыступае да выканання ўласных палётаў у нашу сталіцу. Адсюль і вышэйназванае сумеснае павелічэнне — у паўтара раза — колькасці рэйсаў паміж Кіевам і Мінскам. Падчас зімовай навігацыі «АэраСвіт», што базіруецца ў кіеўскім аэрапорце «Барыспаль», будзе выконваць рэйсы ў нашу сталіцу тройчы на тыдзень — па панядзелках, серадах і суботах. Яны дапоўняць штодзённыя рэйсы па маршруце Мінск — Кіеў — Мінск кампаніі «Белавія», якая базіруецца ў Нацыянальным аэрапорце Мінск.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У МАГІЛЁВЕ СУТЫКНУЛІСЯ 5 АЎТАМАБІЛЯЎ

22 кастрычніка а 9-й раніцы на мосце па вуліцы Каралёва на слізкай дарозе занесла аўтамабіль «Форд», і ён ударыўся ў металічную агароджу, якая падзяляе палосы. За ім у патоку аўтамабіляў спрабавалі затармазіць, але без поспеху: яшчэ адна за адной сутыкнуліся тры машыны. І нарэшце, апошнім урэзаўся ў іх грузавы аўтамабіль «Ман», які зусім пераламаў агароджу і высунуўся на сустрэчную паласу.

У гэтай буйной аварыі людзі не пацярпелі, толькі аўтамабілі атрымалі механічныя пашкоджанні. Паводле інфармацыі Магілёўскай ДАІ, адной са спадарожнай прычын гэтага дарожна-транспартнага здарэння з'яўляюцца летнія шыны (больш таго, і з розным малюнкам пратэктара на пярэдняй восі) на аўтамабілі «Форд», які занесла на месце першым.

Ілона ІВАНОВА.

ПРЫЙШОЎ У БАНК З ПАДРОБНЫМ ПАШПАРТАМ

У Мінску на чыгуначным вакзале праваахоўнікі затрымалі 24-гадовага махляра, які спрабаваў атрымаць у аддзяленні банка чужыя грошы па падробных дакументах.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар упраўлення ўнутраных спраў на транспарце МУС Беларусі Аляксандр Марчанка, беспрацоўны вясковы хлопец з Любанскага раёна, які раней працаваў таксістам, прыйшоў у банк з чужым пашпартам. Дарэчы, гэты дакумент яго ўладальнік, 60-гадовы мінчанін, згубіў калісьці ў машыне падазронага, калі расплачваўся за паслугі таксі. А праз некаторы час прайдзісвет, у якога, паводле яго слоў, склалася цяжкае фінансавае становішча, вырашыў пабагацець за кошт былога пасажыра. Тым больш, што ў згубленым пашпарце аферыст знайшоў выпіску з банкаўскага рахунку мінчаніна і даведаўся, што ў таго на рахунку засталіся грошы. За імі ён і прыйшоў у банк, папярэдне «папрацаваўшы» над пашпартам пацярпелага: аферыст пераклеіў фотаздымак у дакументе і дамаляваў асобныя элементы ў даце нараджэння. Праўда, касір банка адразу распазнала падробку і цягнула час з выдачай грошай, націснуўшы на трывожную кнопку. Махляра, які нічога не падазраваў і падпісваў квітанцыі, затрымалі супрацоўнікі міліцыі. У адносінах да падазронага, які змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання, заведзеная крымінальная справа за падробку дакументаў і замах на махлярства.

Ігар ГРЫШЫН.

ГАНДЛЯВАЎ ЭЛЕКТРОННЫМІ ГРАШЫМА

Упраўленнем Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю па Віцебскай вобласці заведзена крымінальная справа ў дачыненні да жыхара Віцебска, які незаконна займаўся ажыццяўленнем аперацый па куплі-продажы электронных грошай.

Атрымаў «віртуальны мяняла» нядрэнны рэальны даход — 35,7 мільёна рублёў. Вядзецца следства.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

Кватэрнае пытанне

З ЧАРГІ. У ЧАРГУ

Наша сям'я з трох чалавек больш за 10 гадоў пражыла ў інтэрнаце. Зараз падыходзіць чарга на будаўніцтва сваёй, асобнай кватэры, на атрыманне льготнага крэдыту. Аднак грошай, каб будаваць двухпакаёўку, у нас няма. Кажуць, што ў такой сітуацыі мы можам, напісаўшы заяву на зняцце з кватэрнай чаргі, пабудаваць аднапакаёвую, засяліцца і зноў стаць у чаргу. Ці так гэта? І ці зможам мы яшчэ раз разлічваць на льготны крэдыт?

В. Багданаў, *Магілёў.*

У адпаведнасці з падпунктам 161 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2000 г. № 185 «Аб выдачы грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў» грамадзянам, якія ажыццяўляюць будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў агульнай плошчай менш за 15 кв. метраў на аднаго чалавека, ільготны крэдыт выдаецца пры ўмове добраахвотнага волевыяўлення гэтых грамадзян і членаў іх сем'яў, уключаных у спісы на атрыманне льготных крэдытаў, на зняцце з уліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў.

СТАР. 2

Пенсіянер вёскі Будча Ганцавіцкага раёна Мікалай Іванавіч Хандрыка дакладна не ведае, колькі чаравікаў стаптаў на вясковых вяселлях і колькі разоў дзяліў вясельныя караваі, але ўпэўнены дакладна, што распаліся толькі дзве вясельныя пары. Ён быў, бясспрэчна, лепшым сватам не толькі ў сваёй вёсцы — на ўсім Заходнім Палессі.

Вялікая калекцыя прыгожых ручнікоў дагэтуль ашчадна захоўваецца ў доме Мікалая Хандрыкі — як падарункі, напамін, нарэшце, сведчанне, што ён сапраўды быў вясельным сватам. Мы налічылі больш за трыццаць белых палотнішчаў, упрыгожаных арнаментам і кветкамі. Мікалай Іванавіч перакладвае іх і прыгадвае:

«Гэты ад Надзі Віткавай, гэты ад Любы Рыбчынай, гэты ад Вольгі Лактышкі... Гелі Канцавых, Надзі Бабушынай, Марусі Казачышкі...». Самога ж Мікалая Хандрыку ў Будчы з дзяцінства называюць Байкам — за ўменне сачыняць на хаду, нешта выдумваць, быць дасціпным і вясёлым. І сапраўды Байку ведае кожны вясковы жыхар, незалежна ад узросту — бо гэткіх не ведаць немагчыма: іх адзінкі на белым свеце.

— Урадзіўся вясёлым, умеў рабіць языком, — кажа пра сябе Мікалай.

Першы раз Байка быў сватам у 1969 годзе — на вяселлі швагра. Пасля таго разу не было адбою ад прапаноў на ролю свата. Калі не свата, дык дзяліць вясельны каравай. Сватам ён быў 26 разоў. Дзяліў каравай — больш чым на 60 вяселлях. Дзяльба каравая — не толькі пачэсная, але і дужа адказная справа. Ці не галоўная на бяседзе. Каравай — сімвал новага жыцця. Байка дзяліў весела, не шкадаваў нікому добрых слоў і не лез за імі ў кішэню. Сват «завязваў» бяседу, гэта значыць, вёў вяселле (па-сучаснаму — тамада), хадзіў выкупляць маладую, «адбіраў перапоі» (калі перад вяселлем выносілі сталы і трэба было адкупіцца), запрашаў на танцы, частаваў гарэлкаю «запарожных гасцей» (тых, хто прыходзіў паглядзець на вяселле). А як ён вытанцоўваў, як выдаваў уласныя прыпеўкі, якіх ведаў не менш за 150:

«Нашу Будчу-весялуху
Можна горадам назваць:
Семсот хат і восем вуліц —
Недзе з мілай пастаяць».

А вось звычайны байкаўскі пачатак вяселля:

«Вып'ю першую чарку
За вашую гаспадарку!
Яшчэ вып'ю другую
За красавіцу маладую!»

Лічылася, што ягоныя вершаваныя тосты мелі незвычайную моц, якая звязвала маладых. Сасваталыя ім пары былі ў жыцці добрымі сем'ямі.

— Разводы ў людзей не атрымліваліся, — кажа пра свае паслявясельныя назіранні колішні сват.

Уся Будча збіралася пад вокнамі вясельнай хаты, каб пачуць і хоць адным вокам убачыць байкаўскія выхадкі. Як ён умудраўся з усімі выпіць, а сам не напіцца? Як умеў вялікую папойку ператварыць у вясёлую гульню? Гэта быў тэатр — адзіны і непаўторны спектакль.

— Каб маладыя запомнілі на ўсё жыццё сваё вяселле, — кажа Мікалай Іванавіч. — Многія і дагэтуль перакананыя, што іхнія моцныя сем'і — гэта дзякуючы мне. Але самае галоўнае, што цанілі ўва мне землякі акрамя розных жартаў, — захаванне нашых мясцовых традыцый, абрадавасць, дакладнасць абавязкаў і роляў кожнага ўдзельніка свята нараджэння новай сям'і.

Яму давяралі. Пра яго хадзілі байкі. Ён і дагэтуль застаецца непераўзыдзеным майстрам вясельнай справы. Хоць гадоў з дзесяць да вясельляў ужо не мае ніякага дачынення.

Сам жа Мікалай Іванавіч ажаніўся ў 1967 годзе з аднавяскоўкай Вольгай. Жывуць душа ў душу. У іх два сыны і чатыры ўнукі. Разам з жонкай спявае на клубнай сцэне, не паверыце, 45 (!) гадоў.

Пасля вайсковай службы Мікалай асушаў палескія балоты, загадваў будчанскім клубам.

У адрозненне ад сучаснай тамады, ніколі за ролю свата грошай з вясельляў не браў. Сват — гэта не прафесія, гэта — місія.

Анатоль КЛЯШЧУК.

Вёска Будча Ганцавіцкага раёна.

ПРАКАВЕТНАЕ



ЛЕПШЫ СВАТ ПАЛЕССЯ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ПЕРШАЯ ЗАВІРУХА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Прэм'ера рубрыкі «Шчасце, калі ў доме Гаспадар»

«ЗА ГЭТЫМ ЧАЛАВЕКАМ Я І НА КРАЙ СВЕТУ ПАЕХАЛА Б...»

Сям'я КРЫЛОВЫХ кінула горад і разводзіць коз на хутары бліз Дзяржынска

Мінчанка Галіна, педагог па адукацыі, і думаць ніколі не думала, што будзе жыць на хутары. Дзмітрый жа, хоць і быў «кватэрным» дзіцем, колькі сябе памятае марыў пра ўласны дом. Але пабудаваць апошні за капеечную зарплату, якую ў пачатку 90-х плацілі на заводзе электронікі, было нерэальна...

«90 коз даілі з мужам у чатыры рукі»

— Складаныя былі часы, — уздыхае Дзмітрый Крылоў. — Школьнік, які падпрацоўваў на запраўцы, і тое больш атрымліваў, чым дыпламаваны спецыяліст на заводзе. Мяне, зразумела, такое жыццё не задавальняла, вось і вырашыў зрабіць крок у бок сваёй мары — паспрабаваць сябе ў якасці фермера.

18 гадоў таму на месцы, дзе зараз размяшчаецца фермерская гаспадарка «ДАК», было голае поле. Ні праехаць, ні прайсці.

— Першыя гады ўзімку, калі замятала ўсё скрозь, на лыжах за тры з паловай кіламетры ў краму, якая знаходзіцца ў бліжэйшай вёсцы, ездзіў, — распавядае гаспадар. — Паступова праклаі дарогу, правялі электрычнасць, ваду. У 97-м пачалі будаваць ферму для свіней.

Апошнімі Крыловы займаліся больш як тры гады. Да таго часу, пакуль, на сваю бяду, не прывезлі племянных свінак з Рагачова. Але ж хто мог ведаць, што яны былі хворыя... У Крыловых тады яшчэ было мала вопыту.

— Адным словам, больш страцілі, чым зарабілі, — рэзюмуе суразмоўца. — Ды і зерне раптоўна падаражэла. Жыццё прымусіла шукаць нешта іншае, эксклюзіўнае.

Думка займацца «казіным» бізнэсам прыйшла падчас чарговага наведвання прадуктовай крамы. На вочы патрапілася казінае малако, якое на той час каштавала ажно 17 тысяч. А чаму б і не? — падумалі Крыловы. І пачалі скупляць «Белак» (так у той час клікалі на вёсцы практычна ўсіх белых коз) у мясцовага насельніцтва.

З цягам часу кампанію Белкам склалі літоўскія і латышскія козы зааненскай малочнай пароды. Праўда, такія мянушкі, як Ёнас, Юзэф альбо Кірас, на ферме Крыловых не прыжываліся. Таму называлі коз на свой капыл — Архіп, Каця, Рамашка...

«Усё самае складанае засталося за плячыма. Зараз у нас ёсць не толькі даільныя апараты, але і даяркі. А былі ж часы, калі ўручную даілі 90 гадаванак. У чатыры рукі з мужам. І дзеці, як маглі, дапамагалі. Так што, калі не дай Бог, адключаць электрычнасць, то, паверце, не прападзём.»

— Па першым часе кожнай казе давалі мянушку, — уступае ў размову Галіна Крылова. — Зараз іх у нас больш як 250 (з іх 190 дойных. — **Н.Д.**), дзе ж усіх запомніш.

На дасягнутым фермеры спыняцца не збіраюцца. У планах — павялічыць колькасць дойных коз да 300 (!). Ужо і сучаснае абсталяванне закупілі для новай даільнай залы.

— Усё самае складанае засталося за плячыма, — усміхаецца гаспадыня. — Зараз у нас ёсць не толькі даільныя апараты, але і даяркі. А былі ж часы, калі ўручную даілі 90 гадаванак. У чатыры рукі з мужам. І дзеці, як маглі, дапамагалі. Так што, калі не дай бог, адключаць электрычнасць, то, паверце, не прападзём *(пераглядваюцца)*.

Тэрапія казіным сырадоем

Сёння няма патрэбы даказваць, наколькі карыснае казінае малако. Крыловы ўпэўненыя, што яно павінна стаць здаровай альтэрнатывай кока-коле, неад'емным складнікам харчавання ў дзіцячым садку, пачатковай школе.

— Не сакрэт, што ў некаторых дзетак ёсць алергія на бялок, які ўтрымліваецца ў каровіным малацэ, — кажа Галіна. — У гарадах такіх з кожным годам усё больш і больш. Напрыклад, прывозіла да нас маладая маці з Мінска сваю хваравітую дачушку. Ні дня не прапускала — паіла малечу казіным малаком. І што вы думаеце — неўзабаве дзяўчынка пачала расці, стала менш хварэць.

— Жыла ў нас два тыдні і пенсіянерка, былая настаўніца з Мінска, — дадае Дзмітрый. — Ёй урач параіў знайсці ў вёсцы казу і пажыць там, каб аздаравіць свой страўнік. Раніцай і ўвечары жанчына хадзіла на дойку, дзе выпівала ад сваёй любімай казы шклянку сырадою. Пасля тэлефанавала, казала, што значна лепш сябе адчувае.

І дзеці Крыловых, калі прастынуць, то лечацца выключна казіным малаком з мёдам. А казіны сыр, ёгурт ды тварог уласнага прыгатавання дык і наогул штодзень займаюць пачэснае месца на сталі фермераў.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.10.2010 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▲ 1 долар ЗША	3 003,00	1 чэшская крона	168,93	USD	30,4977
▼ 1 еўра	4 175,07	1 польскі злоты	1048,68	10 UAH	38,3691
1 латвійскі лат	5 880,74	▲ 1 расійскі рубель	98,47	1000 BYR	10,1557
1 літоўскі літ	1 208,40	1 украінская грыўня	377,85	EUR	42,5351

Агенцтва Уладзіміра Грачова

Правы ўласніка пры зносе дома

Я атрымаў у спадчыну 1/3 частку прыватнага дома. Асабістыя рахункі мае кожны гаспадар сваёй часткі. Уваходы ў кожную частку дома таксама асобныя. У маёй частцы дома ніхто не жыве і на плошчы ніхто не прапісаны (не зарэгістраваны). Цяпер, у сувязі з забудовай раёна, на тэрыторыі якога знаходзіцца дом, ходзяць чуткі пра яго знос. Растлумачце, што я маю права атрымаць па законе ў выніку зносу дома? Ці патрэбна для гэтага быць зарэгістраваным у прызначаным да зносу доме?

В.А., *г. Мінск*

Гэтыя пытанні рэгулююцца Жыллёвым кодэксам Рэспублікі Беларусь (артыкул 104) і Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 2 лютага 2009 года № 58 «Аб некаторых мерах па абароне маёмасных правоў пры адабранні зямельных участкаў для дзяржаўных патрэб», якім зацверджанае Палажэнне аб парадку рэалізацыі маёмасных правоў грамадзян і арганізацый пры адабранні ў іх зямельных участкаў.

У адпаведнасці з названым Указам, зямельны ўчастак можа быць прадастаўлены ўпаўнаважаным выканкамам для дзяржаўных патрэб толькі пасля яго адабрання ў адпаведнасці з заканадаўствам у былога карыстальніка (уладальніка, уласніка або арандатара).

Да прынясця рашэння пра адабранне зямельнага ўчастка выканкам або па яго рашэнні асоба, якой гэты ўчастак будзе прадастаўлены, абавязаныя прапанаваць і забяспечыць уласніку жылога дома або кватэры ў блакіраваным або шматкватэрным доме адзін з варыянтаў на выбар:

— тыпавую кватэру ва ўласнасць агульнай плошчай не менш чым агульная плошча дома (кватэры), што падлягае зносу. Са згоды ўласніка плошча можа быць меншай за плошчу дома, але не меншай за агульную плошчу, якая вызначаецца з разліку па 15 кв.м на ўласніка і на кожнага члена яго сям'і, зарэгістраванага ў доме па месцы жыхарства. Пры гэтым, калі рынкавы кошт прадастаўляемай кватэры меншы за кошт дома (кватэры), што падлягае зносу, розніца кампенсуецца ўласніку грашовымі сродкамі;

— грашовую кампенсацыю ў памеры рынкавага кошту дома (кватэры), што зносіцца, збудаванняў і насаджэнняў пры ім, але не менш, чым расходы, неабходныя для будаўніцтва раўнацэнных дома або кватэры і збудаванняў пры іх.

Пры наяўнасці аб'ектыўнай магчымасці, у тым ліку пацверджанай генеральнымі планамі населеных пунктаў, выканкам абавязаны прапанаваць уласніку на яго выбар дадаткова да вышэйназваных варыянтаў права на:

— будаўніцтва і (або) атрыманне ва ўласнасць дома, збудаванняў і насаджэнняў пры ім, роўных па добраўпарадкаванні і агульнай плошчы тым, што зносяцца;

— перанос і ўзнаўленне дома, збудаванняў і насаджэнняў, якія зносяцца.

Калі гэта адбываецца ў сталіцы, то Мінскі гарвыканкам абавязаны дадаткова да пералічаных правоў прапанаваць уласніку права на прадастаўленне яму зямельнага ўчастка для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома ў любым іншым населеным пункце рэспублікі па-за чаргой і без правядзення аўкцыёну з выплатай грашовай кампенсацыі за дом, збудаванні і насаджэнні, якія зносяцца.

З усіх пералічаных варыянтаў выбраць можна толькі адзін.

У выпадку, калі пры рэалізацыі выбранага ўласнікам права рынкавы кошт прадастаўляемых кватэры або жылога дома са збудаваннямі і насаджэннямі, перавышае кошт зносімых, то розніца з уласніка не спаганяецца.

Таксама пры зносе жылога дома (кватэры) забяспечваецца пакрыццё расходаў, звязаных:

— з пераездам, у тым ліку са змяненнем месца жыхарства ў межах рэспублікі;

— з часовым карыстаннем іншымі жылымі памяшканнямі да прадастаўлення дома (кватэры);

— з афармленнем права ўласнасці на прадастаўлены дом (кватэру);

— з афармленнем дакументаў і правоў на прадастаўлены ўзамен зямельны ўчастак;

— з пакрыццём убыткаў.

Для атрымання любога з відаў кампенсацыі за дом (кватэру), што падлягаюць зносу, уласніку не абавязкова быць у ім зарэгістраваным па месцы жыхарства — дастаткова пацвердзіць сваё права ўласнасці. Для членаў сям'і гэта не так. Пры выбары ўласнікам права на атрыманне кватэры яе памер вызначаецца з разліку плошчы на яго і тых членаў сям'і, якія зарэгістраваныя па месцы жыхарства ў доме, што будзе зносіцца. Пры гэтым не ўлічваюцца наймальнікі і грамадзяне, якія ўсяліліся ў дом (кватэру) пасля атрымання копіі або выпіскі з рашэння пра будучае адабранне зямельнага ўчастка (акрамя ўласніка, а таксама яго мужа (жонкі), непаўналетніх і паўналетніх непрацаздольных дзяцей, непрацаздольных бацькоў як уласніка, так і членаў яго сям'і, якія ўсяліліся ва ўстаноўленым парадку і пражываюць у гэтым доме(кватэры)).

Пры немагчымасці прадастаўлення ва ўласнасць адной кватэры ў адпаведнасці з нормай агульнай плошчы, ва ўласнасць можа быць прадастаўлена некалькі кватэр.

Члены сям'і ўласніка, зарэгістраваныя па месцы жыхарства ў доме (кватэры), што зносіцца, і іншыя грамадзяне, якія маюць права карыстання ім, набываюць права карыстання жылым домам (кватэрай), які перадаецца ўласніку, на тых жа ўмовах, на якіх яны займалі былы дом (кватэру).

Калі ўласнік выбірае грашовую кампенсацыю, на гэта патрэбна згода членаў сям'і, зарэгістраваных па месцы жыхарства ў доме (кватэры), што падлягае зносу, і органаў апекі і папячыцельства, калі там зарэгістраваныя непаўналетнія члены сям'і.

Пры выбары асобамі, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі агульнай уласнасці, аднаго з правоў, прадастаўленых ім Указам, іх долі ў гэтым праве павінны адпавядаць долям у праве кожнага з іх на аб'екты нерухомасці, што падлягаюць зносу. Гэта значыць, не выключана, што замест зносімага дома, які знаходзіцца ў агульнай уласнасці некалькіх асоб, узамен можа быць прадастаўлена ўсім уласнікам адна кватэра, што адпавядае па плошчы гэтаму дому, з афармленнем яе таксама ў іх агульную ўласнасць.

У адпаведнасці з артыкулам 119 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь, уласнікі па ўзаемнай згодзе маюць права раздзяліць жылое памяшканне з утварэннем двух і больш асобных жылых памяшканняў. Пры неабходнасці гэта можа быць зроблена шляхам перабудовы і перапланіроўкі жылога памяшкання са згоды мясцовага выканкама. Калі жылыя памяшканні, утвораныя ў выніку раздзелу, зарэгістраваныя належным чынам як асобныя кватэры, то ўласніку кожнай кватэры павінна прадастаўляцца асобная кампенсацыя.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Андрэйчанку Уладзіміру Паўлавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ .

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Андрэйчанку Уладзіміру Паўлавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Андрэйчанку Уладзіміру Паўлавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ .

Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» выказвае шчырае спачуванне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Андрэйчанку Уладзіміру Паўлавічу ў сувязі з напаткаўшым яго непапраўным горам — смерцю МАЦІ — Ніны Браніславаўны.

Глыбоцкі раённы выканаўчы камітэт, раённы Савет дэпутатаў, жыхары Глыбоцкага раёна смуткуюць і выказваюць глыбокае спачуванне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дэпутату ад Глыбоцкай выбарчай акругі № 22 Андрэйчанку Уладзіміру Паўлавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ — Ніны Браніславаўны.

Лёзненскі раённы выканаўчы камітэт, Лёзненскі раённы Савет дэпутатаў выказвае глыбокае спачуванне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзіміру Паўлавічу Андрэйчанку ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю МАЦІ.

З БУДУЧЫНЯЙ — НАЧЫСТУЮ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што ў беларускай арміі няма страшэнных фактаў дзедаўшчыны, а калі дзесьці і ёсць такія факты, то іх вельмі жорстка адсочваюць.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што кожны малады чалавек павінен прайсці службу ў арміі — гэтую своеасаблівую школу мужнасці. «Калі мы пачалі скарачаць набор ва Узброеныя Сілы маладых людзей, я падумаў: што гэта будзе за мужчына, калі ён не паслужыў у арміі?» — сказаў Прэзідэнт. Ён дадаў, што яго старэйшыя сыны таксама неслі службу ў арміі.

«Армія робіць маладога чалавека сапраўдным мужчынам. Гэта школа мужнасці, — лічыць кіраўнік дзяржавы. — У арміі трэба служыць, калі ты хочаш быць сапраўдным чалавекам, сапраўдным мужчынам. А дзяўчатам раю, каб яны знаходзілі сабе спадарожнікаў жыцця сярод тых, хто ведае, што такое армейскае жыццё. Тады ён будзе перадольваць усе нягоды вашага жыцця і не будзе скардзіцца».

Адно з пытанняў Прэзідэнту з дапамогай канферэнц-сувязі задала школьніца са Слуцка Паліна Сыцько, якая з-за хваробы мае абмежаваныя магчымасці. Яна пацікавілася ў Прэзідэнта, ці можа чалавек з абмежаванымі магчымасцямі атрымаць паўнацэнную адукацыю і знайсці дастойную работу, каб прыносіць карысць сваёй сям'і і краіне. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі ствараюцца ўсе ўмовы, каб людзі з абмежаванымі магчымасцямі маглі нармальна жыць і працаваць, атрымліваць вышэйшую адукацыю. У тым ліку і з дапамогай высокіх тэхналогій. У той жа час, на яго думку, такі чалавек усё роўна павінен канкурыраваць разам з усімі, паказваць свае здольнасці. «Мы такім людзям дапамагаем, і яны знаходзяцца на кантролі», — сказаў Прэзідэнт.

Паліна Сыцько нядрэнна малюе. Яна скарысталася магчымасцю і падарыла кіраўніку дзяржавы адну са сваіх карцін, чым вельмі яго расчуліла.

Што ж датычыцца інфармацыйных тэхналогій, то кіраўнік дзяржавы адзначыў, што «недалёкі той дзень, калі высакаскорасны інтэрнэт прыйдзе ў вёску». Ён падкрэсліў, што ў гэтым плане Беларусь не адстае ад іншых дзяржаў. Як дадаў начальнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта, памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Усевалад Янчэўскі, кіраўніком дзяржавы прынятыя ўсе неабходныя рашэнні, і ўжо да канца года ў Беларусі павінна адбыцца сапраўдная «рэвалюцыя» ў гэтай галіне.

Адна з удзельніц акцыі пацікавілася ў кіраўніка дзяржавы яго меркаваннем наконт ролі жанчыны ў сучасным грамадстве: яна ў першую чаргу павінна выхоўваць дзяцей або будаваць кар'еру?

«Тое, што Бог прадвызначыў жанчыне быць маці, неаспрэчна. Якая кар'ера ні была б, вам давядзецца займацца выхаваннем сваіх дзяцей. Я хачу, каб наша жанчына нараджала не менш за трох дзяцей», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, дзяржава вельмі шмат робіць для абароны мацярынства і дзяцінства, а ў будучым будзе рабіць яшчэ больш. Прыярытэтная ўвага ў гэтым плане будзе ўдзяляцца забяспечанасці жыллём. «Калі нарадзіла трое дзяцей, ты атрымаеш жыллё за невялікую цану, а можа, і бясплатна — у залежнасці ад развіцця эканомікі. Калі ў сям'і чацвёра-пяцёра дзяцей, то гэта сапраўды бясплатная кватэра. Мы будзем узмацняць падтрымку такіх сем'яў. На гэта мы будзем нацэльваць наш урад і грамадства», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што забеспячэнне дэмаграфічнай бяспекі становіцца адным з асноўных напрамкаў дзейнасці дзяржавы. Паводле яго слоў, неабходна, каб у Беларусі пражывалі як мінімум 20 млн чалавек.

Акрамя таго, Прэзідэнт падкрэсліў, што жанчына не павінна адна выхоўваць дзяцей, і ў гэтым важная роля адводзіцца мужчыну. «Адказнасць за выхаванне дзяцей ляжыць не толькі на жанчыне, але і на мужчыне, і яшчэ цяжка сказаць, на кім больш», — сказаў ён.

Што датычыцца кар'ернага росту, то Прэзідэнт адзначыў, што жанчынам асабіста ён давярае больш, чым мужчынам. Жанчыны больш акуратныя, асцярожныя, адказныя і менш карумпаваныя. Гаворачы пра ўдзел жанчын у жыцці грамадства, кіраўнік дзяржавы прывёў у якасці прыкладу тое, што больш за 30 працэнтаў членаў беларускага парламента — жанчыны. Амаль палову месцаў яны займаюць у органах мясцовай улады, многія жанчыны працуюць на розных кіруючых пасадах.

Не пагадзіўся кіраўнік дзяржавы з меркаваннем наконт таго, што працуючыя пенсіянеры займаюць пасады і не даюць ходу моладзі. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што востра праблемы ў Беларусі з беспрацоўем няма, асабліва ў процілеглай тэндэнцыі. Безумоўна, вельмі расчараваныя ад паражэння. Нам трэба вучыцца забіваць, — наракаў на сваю каманду Стаянаў.

У другім матчы гадандскі АЗ прымаў кіеўскае «Дынама» і саступіў — 1:2.

Становішча ў групе:

БАТЭ — 7 ачкоў

«Дынама» — 4 ачкі

«Шэрыф» — 3 ачкі

АЗ — 3 ачкі.

Наступны матч барысаўскі клуб правядзе на сталічным стадыёне «Дынама» зноў супраць малдаўскага «Шэрыфа». Гульня адбудзецца 4 лістапада ў 20 гадзін. Білеты на гэты матч пачалі прадавацца ўчора ў касах стадыёна «Дынама», офісе «АБФФ—Падарожжа» і касах барысаўскага гарадскога стадыёна. Іх кошт — 10, 20 і 30 тысяч рублёў.

ТЫМ ЧАСАМ

Барысаўскія балельшчыкі вызначыліся тым, што ўчынілі беспарадкі на стадыёне ў Тыраспалі. Пасля таго, як Сяргей Сасноўскі забіў гол, фанаты запалілі на сектары флаеры. Іх давялося тушыць пажарным, якія знаходзіліся на стадыёне. Стычкі заўзятараў з праваахоўнікамі адбываліся на працягу ўсяго матча. Паведамляецца, што некалькі чалавек было затрымана.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Падымаць пенсійны ўзрост», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка не лічыць праблемай, што многія пенсіянеры працягваюць працаваць. «Нельга выпіхваць пенсіянераў на вуліцу, — падкрэсліў ён. — Нельга крыўдзіць старых, і мы іх выганяць з работы не будзем — не такія вялікія ў іх пенсіі. А вопыт у іх велізарны, і вельмі многія яшчэ могуць эфектыўна працаваць».

Думаю, пакуль у нас такой вострай праблемы няма. Ёсць пэўныя прафесіі і пасады, дзе, можа, пенсіянеры затрымаліся. Але, калі кіраўнік трымае, значыць, яны штосьці могуць», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Моладзі б хацелася мець на тэлебачанні «свой» канал. Аляксандр Лукашэнка не супраць, аднак для гэтага пакуль яўна недастаткова моладзевых праграм. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што да пытання стварэння асобнага моладзевага канала ў краіне падыходзілі ўжо неаднойчы. «Ведаю, што вы крытыкуеце «Знамя юности», ведаю, што вы крытыкуеце каналы за тое, што там мала моладзевых праграм. А ніхто не закрывае магчымасці ствараць на тэлебачанні моладзевыя праграмы», — сказаў Прэзідэнт.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, спачатку неабходна стварыць такую колькасць праграм, цікавых моладзі, каб у далейшым іх можна было трансліраваць на асобным канале. «Давайце пачнём з малога — з моладзевых праграм. Дзе яны? Тыя, якія глядзелі б людзі. Калі ты прыбег дадому, адразу кнопку націскаеш, шукаеш канал, каб паглядзець моладзевую перадачу. Няма такога», — адзначыў ён.

«Стварыце спачатку праграмы, а потым размова пойдзе пра канал, — сказаў Прэзідэнт. — Тут усё залежыць ад вас, не ад мяне».

Сяргей ПРОТАС.

«Шэрыф» атакаваў, дамінаваў, але выйграць не здолеў

Барысаўскі клуб БАТЭ атрымаў чарговую перамогу ў групавым раўндзе Лігі Еўропы і працягвае ўзначальваць турнірную табліцу.

Увечары 21 кастрычніка каманду Віктара Ганчарэнкі праэкзаменаваў малдаўскі «Шэрыф», каманда, якая, дарэчы, у папярэднім туры адолела кіеўскае «Дынама» (2:0). З таго тура ў групе Е ўсё канчаткова заблыталася — хто фаварыт, хто аўтсайдар? І як цяпер ставіцца да «Шэрыфа»? На каманду з Тыраспаля, сталіцы непрызнанай Прыднястроўскай рэспублікі, Віктар Ганчарэнка настройваў падапечных і балельшчыкаў больш чым сур'ёзна: «Нашымі ключавымі, а значыць галоўнымі, стануць два спараныя паядынкі з «Шэрыфам», — незадоўга да матча казаў Віктар Ганчарэнка. — Ні пра якую недаацэнку суперніка размовы ісці не можа».

На поле тыраспальскага стадыёна, адзінага, дарэчы, у Малдове прыдатнага для міжнародных матчаў такога ўзроўню, выйшаў склад, які перамог два тыдні таму галандскі АЗ. Склад суперніка — пашырана інтэрнацыянальны: па два прадстаўнікі Буркіна-Фасо і Сербіі, грузін, балгарын, басніец, сенегалец, расіянін і латыш.

Беларусы не дазволілі ўпэўніцца, што аднесліся да суперніка сур'ёзна: ужо на чацвёртай хвіліне каля нашых варот узнік досыць непрыемны момант. Д'еду меў выдатную магчымасць вызначыцца — праўда, ударыў вышэй варот. Якая ў барысаўчан абарона, убачылі і гледачы, і супернік. Праўда, праз чатыры хвіліны абаронца Сяргей Сасноўскі хоць ускосна, але рэабілітаваў гэтую лінію. Пасля падачы вуглавога Рэнанам Брэсанам ён быў першым, хто дацягнуўся да мяча і перапраўіў яго ў вароты — 1:0.

З гэтага часу ініцыятыва канчаткова перайшла да гаспадароў.

Але футбалісты малдаўскага клуба даказалі, што дрэнная рэалізацыя — бяда не толькі беларускага футбола. Момантаў у падапечных Андрэя Сасніцкага хапала — асабліва ў канцоўцы матча, калі ўся каманда арганізавала атаку на вароты БАТЭ. Мяч трапляў у штангі і перакладзіны і, дарэчы, двойчы пабываў-такі ў варотах Сяргея Верамко, але ні разу так і не быў залічаным. Спачатку Юрэвіч зацягнуў з розыгрышам штрафнога, і нецярплівы Д'еду мяч адабраў і накіраваў у контратаку Баліму, але рэферы прызначыў перабіць штрафны. Праз шэсць хвілін ва ўзяцці варот партугальскі суддзя разгледзеў напад на варатара. Праўда, за гульню рукой паўабаронцу тыраспальцаў арбітр не пакараў... Барысаўчане дацярпелі і ў канцоўцы адбіліся.

— Галоўную задачу мы вырашылі — дадому вяртаемся з перамогай, — так падсумаваў вынікі матчу Віктар Ганчарэнка. — Вынікам вельмі задаволеныя. Мы атрымалі перамогу ў складанай і напружанай барацьбе. Забіўшы хуткі гол, мы прымусілі «Шэрыф» ісці наперад вялікімі сіламі. Але нам самім не хапала хуткага пераходу з абароны ў атаку. Перад матчам у адказ трэба падумаць, як выправіць недахопы ў абароне. І наладзіць хуткі пераход з абароны ў атаку.

А вось галкіпер малдаван Уладзіслаў Стаянаў лічыць, што перамогу павінна была святкаваць яго каманда:

— Мы гулялі лепш за БАТЭ, стваралі добрыя моманты. Іншая справа, што не здолелі іх рэалізаваць, самі ўпусцілі свой шанц. Безумоўна, вельмі расчараваныя ад паражэння. Нам трэба вучыцца забіваць, — наракаў на сваю каманду Стаянаў.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПЕРАД ВІЗІТАМ ЯНУКОВІЧА СПРАЦАВАЛІ ТРЫ БОМБЫ

Ва ўкраінскім Кіраваградзе перад прыездам кіраўніка дзяржавы Віктара Януковіча адбыліся адразу тры выбухі.

У ноч на пятніцу зламыснікі атакавалі міліцыю, пракуратуру і будынак абласнога суда. Злачынцы заклалі ў гэтых аб'ектах выбуховыя прылады, зробленыя з выкарыстаннем снарадаў Другой сусветнай вайны. У выніку выбухаў ахвяр і сур'ёзных разбурэнняў няма.

САМАЯ СУЧАСНАЯ ПАДЛОДКА ВЯЛІКАБРЫТАНІІ СЕЛА НА МЕЛЬ

Атамная падводная лодка «Аст'ют» ВМС Вялікабрытаніі села на мель у раёне заходняга ўзбярэжжа Шатландыі.

У міністэрстве абароны Вялікабрытаніі факт інцыдэнту пацвердзілі, падкрэсліўшы, што ядзернай небяспекі ён не ўяўляе. Пацярпелых сярод экіпажа атамахода няма, а сама лодка застаецца герметычнай. Падлодка «Аст'ют» з'яўляецца найноўшай сярод іншых АПЛ брытанскіх ВМС. Водазмяшчэнне гэтай лодкі — 7800 тон, даўжыня — 97 метраў, экіпаж складае каля 100 чалавек.

ЗША СТРАЦІЛІ КОД АД «ЯДЗЕРНАГА ЧАМАДАНЧЫКА»

Пад сур'ёзны ўдар паставіў ЗША Біл Клінтан. На працягу некалькіх месяцаў ядзерная бяспека краіны была пад пагрозай. Як стала вядома, у 2000 годзе супрацоўнікі Белага дома страцілі коды ад ядзернага чамаданчыка.

Так сцвярджаецца ў кнізе «Без збянтэжанасці», якую напісаў генерал Х'ю Шэлтан. Ён у свой час займаў самую высокую пасаду ў ваеннай іерархіі Злучаных Штатаў — узначальваў Аб'яднаны камітэт начальнікаў штабоў. Сакрэтныя коды правяраюць і мяняюць кожныя чатыры месяцы. Калі прыйшоў час мяняць коды, прэзідэнцкі памочнік прызнаўся, што іх у яго няма вось ужо некалькі месяцаў. Што да самога Біла Клінтана, дык генерал упэўнены, што ў прэзідэнта кодаў не было, і кіраўнік дзяржавы паняцця не меў пра тое, што яго саветнік згубіў каштоўныя звесткі.

БЮСТГАЛЬТАР ЗА 2 МІЛЬЁНЫ

Бразільская мадэль Адрыяна Ліма прадставіла ў нью-ёркскім буціку Victoria's Secret бюстгальтар коштам 2 млн долараў, інкруставаны дыяментамі, сапфірамі і іншымі каштоўнымі камянямі агульнай вагой у 142 караты. Супербюстгальтар быў выстаўлены ў Нью-Ёрку за некалькі дзён да правядзення моднага паказу.

ДЗВЕ ТОНЫ МЯСА БЕЗ ДАКУМЕНТАЎ

На аўтадарозе мяжа Расійскай Федэрацыі — Верхнядзвінск супрацоўнікі ДАІ ля вёскі Кастрова вечарам затрымалі «Мерседэс-Бэнц», на якім, як высветлілася, перавозілі мяса. 43-гадовы жыхар Браслава, які кіраваў аўто, вёз дзве тоны мяса на суму больш за 14,4 мільёна рублёў. Адпаведныя суправаджальныя дакументы на груз, якія маглі б пацвердзіць якасць мяса, адсутнічалі. Складзены адміністрацыйны пратакол.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НАРКОТЫК НЕ ВЕДАЕ МЕЖАЎ?

Пры збыце буйной партыі марыхуаны супрацоўнікамі ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС Гомельскага аблвыканкама сумесна з вайскоўцамі Гомельскай памежнай групы затрыманы 19-гадовы жыхар Гомеля.

Як высветлілася ў ходзе далейшых мерапрыемстваў, саўдзельнікам злачыннага промыслу быў 25-гадовы непрацуючы грамадзянін Украіны, які і займаўся пастаўкамі ў абласны цэнтр буйных партый марыхуаны. Па месцы яго знаходжання канфіскавана больш за 1,7 кг зелля. Усяго за 9 месяцаў на тэрыторыі вобласці выяўлена амаль 500 злачынстваў, звязаных з незаконным абарачэннем наркотыкаў. Канфіскавана 37 кг наркатычных сродкаў і амаль 7 кг псіхатропных рэчываў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

КІНУЎ ПАЛЬЧАТКУ

Ды не адну, а 3800 пар у незачыненым памяшканні ў двары сваякоў кіраўнік прыватнай гомельскай фірмы, якая займаецца вытворчасцю пальчатак.

Невядомы злодзей скарыстаўся выпадкам і выкраў маёмасць прадпрымальніка.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Абзац

Споўнілася 140 гадоў з дня нараджэння вядомага рускага пісьменніка, ганаровага акадэміка Пецярбургскай акадэміі навук, лаўрэата Нобелеўскай прэміі па літаратуры Івана Буніна.

Брастаўчанін 1979 г.н. і яго 5-месячны сын загінулі ў ДТЗ ва Украіне. Трагедыя адбылася 21 кастрычніка ў Кіраваградскай вобласці. Грамадзянін Беларусі на аўтамабілі «Фальксваген-Пасат» не вытрымаў бяспечнай дыстанцыі і сутыкнуўся з грузавіком MAN, што ішоў насустрач. Іншамарка вылецела на сустрэчную і перавярнулася, а пасля гэтага яе літаральна змялі тры грузавыя фуры. У выніку 31-гадовы ўраджэнец Брэсцкай вобласці і 48-гадовая бабуля яго дзіцяці (па лініі жонкі) загінулі на месцы, грудное дзіця памерла ў бальніцы. У той жа час жонка кіроўцы атрымала толькі драпіны: яе выкінула з машыны на ўзбочыну.

У Столінскім раёне п'яны кіроўца аўтамабіля збіў п'янага веласіпедыста, які атрымаў цяжкія траўмы. Аварыя адбылася на скрыжаванні вуліц у вёсцы Хорск. Кіроўца машыны «Опель-Мантэрэй» 45-гадовы жыхар вёскі Туры пры выездзе на галоўную дарогу ўчыніў наезд на 25-гадовага аднавяскоўца, які ехаў на веласіпедзе. Малады чалавек з адкрытай чэрапна-мазгавой траўмай і пераломамі касцей чэрапа змешчаны ў рэанімацыйнае аддзяленне бальніцы. Кіроўца аўтамабіля затрыманы.

У Пінску на прыпынку грамадскага транспарту загаръёўся рэйсавы аўтобус. Пра пажар у аўтобусе выратавальнікам паведаміў яго кіроўца. Да месца здарэння былі накіраваныя дзве аўтацыстэрны і аўтамабіль хуткага рэагавання. Кіроўца і ўсе шэсць пасажыраў аўтобуса пакінулі яго да прыбыцця ратавальнікаў. Пажар быў ліквідаваны за чатыры хвіліны. Агнём знішчаны салон аўтобуса і пашкоджаны маторны адсек. Як мяркуецца, прычына пажару — кароткае замыканне электраправодкі.

Адзін чалавек загінуў і тры атрымалі траўмы 21 кастрычніка ў выніку ДТЗ у Мінскім раёне. Аварыя адбылася непадалёк ад пасёлка Гатава. 23-гадовы кіроўца «Таёты Ярыс», у якога не было права кіравання аўтатранспартам, выехаў на сустрэчную паласу, дзе ўрэзаўся ў аўтапоезд «Рэно» з украінскімі нумарамі. У выніку кіроўца легкавой аўтамашыны загінуў, а трое пасажыраў 22—23 гадоў, якія ехалі з ім, атрымалі траўмы і змешчаныя ў бальніцу.

20 кастрычніка ў Лельчыцкім раёне Гомельскай вобласці, у непасрэднай блізкасці ад беларуска-ўкраінскай мяжы, гомельскія памежнікі затрымалі 31 грамадзяніна Украіны. Сярод парушальнікаў — сямёра дзяцей. Як мяркуецца, украінцы планавалі збіраць журавіны. Праз некалькі гадзін пасля затрымання парушальнікі мяжы былі перададзеныя ўкраінскім памежнікам.

Поўны абзац

У Кітаі знойдзены сабака, які ходзіць толькі на дзвюх нагах. Мініяцюрны пінчар Лу Лу адрозніваецца ад усіх іншых сабак тым, што амаль з самага нараджэння ходзіць на задніх лапах. Яго ўладальнік Чжоу Гуаншан і сам не ведае, чаму жывёлка выбрала такі незвычайны спосаб перасоўвання. Пінчар завяваў прыхільнасць мясцовых жыхароў у правінцыі Хэнань тым, што яго можна часта ўбачыць на прагулцы ў вертыкальным становішчы, ды яшчэ з сумачкай ці цацкай у «руках».

У легальных прастытутак Іспаніі з'явілася ўніформа. Знешне яна вельмі нагадвае вопратку камунальных службаў. Насіць яркa-жоўтыя камізэлькі «жрыц кахання» абавязалі паліцэйскія. Штраф за з'яўленне на працоўным месцы без камізэлькі — 40 еўра. Вартавыя парадку гавораць, што гэтага патрабуе закон бяспекі дарожнага руху. Усе, хто працуе паблізу трасы ў цёмны час сутак, павінны насіць спецадзенне са святлоадбівальнымі элементамі. Між тым самі «працаўніцы» нічога не маюць супраць — новая яркая ўніформа толькі прыцягвае ўвагу кліентаў.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

З ЧАРГІ. У ЧАРГУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэта дазваляе сем'ям з недастатковымі фінансавымі магчымасцямі вырашаць (не адкладваючы на працяглы тэрмін) пытанні паляпшэння сваіх жыллёвых умоў без пераносу чаргі на атрыманне дзяржаўнай падтрымкі.

Згодна з падпунктам 31.7 Палажэння аб парадку ўліку грамадзян з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, выдзяленне жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565) зняцце з уліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў у названым выпадку ажыццяўляецца пасля дзяржаўнай рэгістрацыі права ўласнасці на жыллёвае памяшканне.

Разам з тым, пунктам 3.11 Палажэння прадугледжана, што пры зняцці грамадзян з уліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў на падставе падпункта 31.7 гэтага Палажэння грамадзяне, калі яны маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, маюць права ў вызначаным парадку быць прынятымі на ўлік з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў для ажыццяўлення будаўніцтва (набыцця) жылога памяшкання з даты падачы заявы аб прыняцці на такі ўлік і падачы адпаведных дакументаў.

Віктар САВІЦКІ.

І ПРАВАДНІКУ КАПУСТА ПАТРЭБНАЯ

У в. Батчэ (Кобрынскі раён) з двара пенсіянера невядомыя паспрабавалі ўкрасці 334 кг капусты. Аператыўнікі ўстанавілі, што капусты захацелі двое: 20-гадовы праваднік чыгункі з в. Літвіны і на год маладзейшы мясцовы жыхар. Заведзена крымінальная справа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА в г. Поставы Витебской обл.

Дата, время, место проведения аукциона	**в 10.00 23 ноября 2010 года в здании райисполкома Витебская обл., г. Поставы, пл. Ленина, 25, III этаж, каб. 58**
Адрес участка	г. Поставы, ул. 17 Сентября, 78А
Площадь, га	0.0065
Кадастровый номер	224050100002000349
Начальная цена предмета аукциона, рублей	413640
Срок аренды земельного участка	25 лет
Назначение	- для размещения торгового павильона модульного типа по оказанию услуг и реализации предметов ритуального назначения
Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона	- внесение победителем аукциона в местный бюджет платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере, заявленном на торгах; - возмещение расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельных участков, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельных участков; - государственная регистрация права на земельный участок в двухмесячный срок со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка; - получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; - занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации
Порядок осмотра на местности земельных участков, которые предполагается передать в аренду по результатам аукциона	В рабочие дни с 8.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе. Обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома: г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб.11
Перечень документов, которые необходимо представить участникам аукциона при подаче заявления	заверенную копию платежного поручения (квитанции) о внесении задатка; гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий пол

«ЗА ГЭТЫМ ЧАЛАВЕКАМ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Адзін, без Галіны, я дакладна не справіўся б!»

Учарашнія гараджане прызналіся, што ў горад іх сёння зусім не цягне. Больш за тое, не разумеюць вясковых людзей, якія праўдамі і няпраўдамі імкнуцца ў сталіцу.

— Многія едуць у Мінск зарабляць грошы, а палічылі б, колькі заробяць, а пасля страцяць на лячэнне шматлікіх захворванняў, — кажа гаспадар. — А якімі грашыма кампенсаваць страчаных дзяцей, якія, пакуль бацькі на заробках, невядома чым і дзе займаюцца?..

Галіна прызналася, што спачатку ёй, як жанчыне, спешчанай гарадскім камфортам, было нялёгка прызвычаіцца да вясковых умоў.

— І, зразумела, там усё на месцы: і бальніца, і школа, і крама..., — кажа спадар Крылоў, пазіраючы на жонку. — А тут у тайгу, у глухі куток закінулі — ні людзей, ні зносін.

— Дзіма, якая ж гэта глухмень? Паўгадзіны — і ты ў горадзе. Часам, каб дабрацца з аднаго канца Мінска ў другі, больш часу страціш.

— Гэта ж мае словы, — усміхаецца Дзмітрый.

— Вось бачыце, і вокам не паспела міргнуць, як муж мяне пераканаў *(смяюцца разам)*. Насамрэч мы жывём тут, на хутары, не горш, чым у горадзе. Тэлефоны зараз ва ўсіх мабільныя. Інтэрнэт у нас ёсць. Ды і Дзіма на ўсе рукі майстар. Ён без праблем і крэсла змайструе, і водаправод парамантуе... У яго нават мянушка з дзяцінства характэрная — Самаробкін.

— Прычым яна да мяне прылепала тройчы, — удакладняе фермер. — Першы раз у школе, другі у арміі, а пасля ў вучылішчы. У мяне з дзяцінства такое перакананне: калі нешта адзін чалавек зрабіў, то іншы — зможа разабрацца (на секунду задумваецца)... Але адзін, без Галіны, я дакладна не справіўся б!

Галіна цвёрда перакананая, што фермерскі бізнэс — сямейная справа. Але вось ці будуць дзеці займацца козамі, яшчэ пытанне... Старэйшая дачка зараз вучыцца ў Віцебску на псіхолага, сярэдняя атрымлівае эканамічную спецыяльнасць у Мінску, малодшая — яшчэ ў школе.

— Жывёл любяць усе як адна, — кажа галава сямейства. — Але звязваць сваё жыццё з сельскай гаспадаркай не хочуць.

— Дзіма, давай не будзем загадваць. Я ж сама ніколі і падумаць не магла, што буду разводзіць коз...

«Ад казлянят дзяцей за вушы не адцягнуць»

У гаспадарцы Крыловых працуе 10 наёмных работнікаў, большасць прыязджае з раённага цэнтра.

— Дзіма — прамы чалавек: сказаў — як адрэзаў, — адзначае Галіна. — Таму людзі (асабліва гэта характэрна для нас — ранімых жанчын) крыўдзяцца. Мне даводзіцца згладжваць усе канфлікты і непаразуменні. У гэтым, безумоўна, дапамагае педагагічны талент.

Галіну, паводле слоў мужа, з фермы не выцягнуць. Гатовая ўсё рабіць замест даярак.

— Я не аматар працы ад усходу і да заходу сонца. І жонку адвучваю. Стараемся пабудаваць бізнэс такім чынам, каб не загінацца на ім. Трэба ж і адпачыць, і дзецям увагу ўдзяліць.

— У малодшай жа зараз і музычная школа, і алімпіяда, і пераходны ўзрост, — падхоплівае думку мужа Галіна. — Хочацца і для свайго развіцця нешта зрабіць. Вось мне, прынамсі, нядрэнна было б падцягнуць сваю англійскую мову. На гэту думку падштурхнулі кантакты з амерыканскім валанцёрам. Ён, прафесар універсітэта, таксама разводзіць коз. А паколькі ў Беларусі, на жаль, няма ветурачоў, якія спецыялізаваліся б выключна на козах, то інфармацыя адносна лячэння, якой падзяліўся гэты фермер, была для нас надзвычай каштоўнай.

Самім Крыловым за мяжу атрымліваецца выбрацца не так часта, як хацелася б. Галіна з дзецьмі летась ездзіла на мора ў Румынію на два тыдні. Дзмітрый жа выбраўся адпачыць пад Адэсу першы раз за сем гадоў толькі сёлета.

— Разам мы пакуль не можам надоўга кудысьці паехаць, — кажа фермер. — Але гэта часова. У планах — падабраць такога адказнага чалавека, якому без ваганняў можна было б даверыць нашых казачак.

Сярод планаў на будучыню — і агратурызм.

— А чаму б і не? — задае пытанне Дзмітрый і тут жа на яго адказвае. — Месца добрае: возера за 100 метраў ад дома, лес, бабры плаціну будуюць непадалёку, цішыня. Зімой — лыжнікам раздолле. Увесну — аматарам салаўіных спеваў.

— А вы б бачылі, як радуюцца сустрэчы з нашымі дабрадушнымі гадаванцамі маленькія дзеці нашых сяброў, — дадае Галіна. — Іх ад казлянят за вушы не адцягнуць.

Прыехала машына па малако, і гаспадар на нейкі час пакінуў нас. Я ж не ўтрымалася і, карыстаючыся магчымасцю, запыталася ў Галіны пра сапраўднае жаночае шчасце.

— У мяне для гэтага ўсё ёсць, — не раздумваючы, адказала яна. — Любімы муж, добрыя, здаровыя дзеці. Што датычыцца Дзімы, за гэтым чалавекам я смела б паехала і ў Сібір, і на край свету хоць коз разводзіць, хоць паўлінаў. Бо ведаю, што за такім мужам я нідзе не прапала б.

Надзея ДРЫЛА. Фота аўтара.
Дзяржынскі раён.

ЧЫМ «УЗЯЦЬ» РАСІЮ? ЭЛІТНЫМ КАРПАМ...

Штодня па дарогах Беларусі курсіруюць каля 200 машын з надпісам «Жывая рыба Беларусі». Толькі ў Мінску рэалізацыяй жывой сажалкавай рыбы займаюцца каля 40 спецмашын. Ёсць сярод іх і машыны Любанскага рыбакамбіната з фірмовым знакам «Любанька» і слоганам «Рыбка, вырашчаная з любоўю».

Размешчаны ў пойме ракі Арэса рыбакамбінат «Любань» — адно з вядучых рыбаводчых прадпрыемстваў нашай краіны. Яго доля ў агульных аб'ёмах рэалізуемай насельніцтву сажалкавай рыбы — каля 10 працэнтаў. Зараз тут вядзецца масавы аблоў нагульных сажалак. І ўловам тут пакуль цалкам задаволеныя...

— Сёлетняе спякотнае лета асабліва паспрыяла вырошчванню таўсталобіка, — расказвае **дырэктар рыбакамбіната Дзмітрый ШЭЛЬ**. — Тэмпература вады прагравалася да 27-28 градусаў, а таўсталобік — рыба цеплалюбівая. Магчыма, для карпа было крыху горача, аднак за кошт выкарыстання кармоў лепшай якасці мы чакаем, што наш улоў будзе на 300—400 тон большы, чым летась...

Зараз у сажалках рыбакамбіната вырошчваюцца акрамя карпа і таўсталобіка шчупак, сом і белы амур. У планах значыцца і вырошчванне ліня, які ў той жа Еўропе карыстаецца высокім попытам. У Любані збіраюцца паставіць яго вырошчванне на тэхналагічную аснову.

— Тэхналогія вырошчвання рыбы ў нашай гаспадарцы мае шэраг пераваг, — расказвае Дзмітрый Шэль. — Так, падача вады ў сажалкі, дзе вырошчваецца рыба, ажыццяўляецца з Любанскага вадасховішча, размешчанага ў лясным масіве. Гэта забяспечвае дадатковую ачыстку вады. Акрамя таго, праточная сістэма падачы вады, у якой вырошчваецца карп, дазваляе выдаліць такі істотны недахоп, уласцівы рачной і азёрнай рыбе, як пах травы або ціны. Напэўна, многія адмаўляюцца ўключаць у свой рацыён мясцовую рыбу менавіта з гэтай прычыны...

Выгадаваць па-сапраўднаму добрую рыбу — задача не з лёгкіх. Той жа карп можа быць шэрым, а можа і залацістым — яго смакавыя ўласцівасці напрамую залежаць ад якасці корму. Там, дзе на стадыі дарошчвання выкарыстоўваецца цэльнае зерне, карп атрымліваецца і прыгожым, і смачным. Але не ўсе гаспадаркі ідуць на дадатковыя выдаткі. Не менш складана забяспечыць дастаўку прадукцыі на гандлёвыя прылаўкі так, каб у кожнага пакупніка на стале аказалася па-сапраўднаму свежая і смачная рыба.

На жаль, далёка не ўсе гандлёвыя аб'екты аснашчаныя сёння акварыумамі для жывой рыбы. Для таго, каб іх утрымліваць і абслугоўваць, патрабуецца спецыяльны работнік, а гэта ўсё дадатковыя выдаткі. Значна прасцей займацца рэалізацыяй марской замарожанай рыбы. А жывая рыба — гэта нязручны тавар...

— Шчыра кажучы, нашы пакупнікі ўпэўненыя, што рыба, якая рэалізуецца з аўтацыстэрнаў, больш «жывая» і свежая, чым рыба ў акварыумах, — смяецца Дзмітрый Шэль. — Я ведаю, што адзін з рыбгасаў прадае на сталічным Камароўскім рынку сваю рыбу з аўтацыстэрнаў і ў магазіне з акварыума. Дык праз магазін яны рэалізоўваюць толькі прыкладна 10 працэнтаў сваёй прадукцыі, хоць на вуліцы і пад дахам прадаецца адзін і той жа тавар.

«...нашы пакупнікі ўпэўненыя, што рыба, якая рэалізуецца з аўтацыстэрнаў, больш «жывая» і свежая, чым рыба ў акварыумах...»

Такія буйныя сталічныя гіпермаркеты, як «Карона» ці «Прастор», бяруць у нас па 200—300 кілаграмаў рыбы ў дзень, а праз звычайныя магазіны рэалізуецца за дзень усяго 15—20 кілаграмаў. Вось і даводзіцца нашым машынам праходзіць да тысячы кіламетраў штодня, каб даставіць рыбу на стол усім ахвотным. Між іншым, рыба займае ў аўтацыстэрнах толькі чацвёртую частку, а ўсё астатняе — вада. Гэта робіцца, каб захаваць таварны выгляд і карысныя ўласцівасці жывой рыбы па дарозе да пакупніка.

— На вырошчванне таварнага карпа ідзе 4 кілаграмы камбікорму, — тлумачыць **дырэктар Дэпартамента па меліярацыі і воднай гаспадарцы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Анатоль БУЛЫНЯ**. — Для прыгатавання добрага камбікорму патрабуюцца 85 (!) кампанентаў. Вытворчасць карпа была стратнай нават у савецкія часы, калі дзяржаўная датацыя даходзіла да 50 працэнтаў. Да 1990 года карп рэалізоўваўся насельніцтву па 1,1 рубля, а дадаткова з бюджэту рыбгасам даплачваліся 2,9 рубля за кожны кілаграм выгадаванай рыбы. Карп па сваёй біялогіі проста не можа акупляцца.

Выдаткі на дастаўку рыбы ў гандлёвыя кропкі і яе рэалізацыю складаюць у сярэднім 1792 рублі за кілаграм. У выніку рознічная цана кілаграма карпа з улікам хоць бы 10-працэнтнай рэнтабельнасці павінна складаць сёлета не менш як 8074 рублі. Але зараз карп не можа быць рэалізаваны па цане вышэй як 6 600 рублёў за кілаграм. У 2009 годзе рыбгасы рэалізоўвалі сажалкавую рыбу са стратамі для сабе. Вось чаму рыбаводчым гаспадаркам проста неабходная дзяржаўная падтрымка для частковай кампенсацыі выдаткаў па дастаўцы і рэалізацыі сажалкавай рыбы. На сённяшні дзень 83 працэнты ўсёй рыбы рэалізуюцца рыбгасамі самастойна з аўтацыстэрнаў.

Па словах Анатоля Булыні, максімальны аб'ём вытворчасці рыбы ў Беларусі быў дасягнуты ў 1988 годзе, калі вылавілі 20,6 тысячы тон рыбы: 18,4 тысячы тон былі вырашчаныя ў дзяржаўных рыбаводчых гаспадарках і 2,2 тысячы тон вылаўленыя з натуральных вадаёмаў. У перыяд з 1995 па 2005 год аб'ёмы ўлову рыбы рэзка ўпалі, і рыбаводчыя арганізацыі аказаліся на мяжы эканамічнага краху. Для аднаўлення рыбаводства па даручэнні кіраўніка дзяржавы была распрацаваная Рэспубліканская праграма развіцця рыбнай галіны на 2006—2010 гады. За пяць апошніх гадоў вытворчасць і рэалізацыя рыбы павялічылася ў 3,7 раза: з 4 тысяч тон у 2004 годзе да 14,8 тысячы ў 2009 годзе. А аб'ём спажывання прэснаводнай рыбы склаў летась 1,4 кілаграма на душу насельніцтва (у 2005 годзе было 0,6 кілаграма).

— У гэтым годзе мы больш увагі надавалі вырошчванню буйной рыбы, прычым у двухгадовым абароце, паколькі лішні год вырошчвання карпа цягне дадатковыя выдаткі, — расказаў Анатоль Булыня. — Той жа карп мы дзелім на пяць відаў (дробны, сярэдні, буйны, адборны) і ў гэтым годзе ўвялі яшчэ адзін — адборны элітны. Адборны карп — гэта карп з вагой кожнай рыбіны больш як 600 грамаў, а элітны — больш як кілаграм. Калі мы збіраемся экспартаваць сваю рыбу ў Расію, дзе канкурэнцыя надзвычай вострая, то нам там няма чаго рабіць без элітнага карпа. Хачу патлумачыць спажыўцам, што дробны і элітны карп адрозніваюцца не толькі сваім коштам: карп вагой 1 кілаграм прыкладна ўтрая больш карысны, чым карп вагой 300 грамаў — ва ўсялякім разе ў навуковай літаратуры прыводзяцца менавіта такія звесткі. Пажыўная каштоўнасць у буйнога карпа — зусім іншая. Харчавацца дробным карпам — гэта прыкладна тое ж, што рваць недаспелы яблык. Але вырошчваць карпа больш як 4 гады для таго, каб атрымаць яшчэ большыя экзэмпляры, нам нявыгадна, паколькі на чацвёртым годзе (а гэта ўжо прыкладна трохкілаграмовыя карпы) прыбаўленне ў вазе замаруджваецца. Пастаўленая задача давесці вырошчванне адборнага карпа да 10 тысяч тон, у тым ліку вагой больш за кілаграм — да 2,7 тысячы тон.

«Дробны і элітны карп адрозніваюцца не толькі сваім коштам. Пажыўная каштоўнасць у буйнога карпа — зусім іншая. Харчавацца дробным карпам — гэта прыкладна тое ж, што рваць недаспелы яблык...»

Рыбакамбінат «Любань», дарэчы, паставіў дзве пробныя партыі карпа ў Расію — па паўтоны кожная. Спадзяюцца, што бліжэй да Новага года ўдасца «зачапіцца» за расійскага пакупніка, бо **ў Беларусі попыт на жывую рыбу, на жаль, адстае ад прапановы**.

Для таго, каб максімальна скараціць тэхналагічныя страты на шляху рыбнай прадукцыі ад рыбгасаў да пакупніка, стаўка зараз робіцца на будаўніцтва невялікіх цэхаў па рыбаперапрацоўцы непасрэдна ў гаспадарках. На базе 5 арганізацый, у тым ліку і ў рыбакамбінаце «Любань», пабудаваныя цэхі па перапрацоўцы прэснаводнай рыбы агульнай магутнасцю 1670 тон у год. Асартымент уключае марожаную прадукцыю (філе і тушку карпа і таўсталобіка), наборы для юшкі, прадукцыю халоднага вэнджання (карп, таўсталобік, асетр, фарэль), прадукцыю вялення (карп, карась, лешч, плотка) і г.д. Зразумела, што філе карпа, з якім хатняй гаспадыні не трэба доўга корпацца, каштуе даражэй за жывую рыбу, аднак для многіх з нас час літаральна на вагу золата. Зараз у стадыі будаўніцтва знаходзяцца яшчэ 5 цэхаў, у якіх плануецца асвоіць выпуск новых відаў прадукцыі — калбасна-фаршавых і кансервавых вырабаў з прэснаводнай рыбы.

У бліжэйшай будучыні канкурэнцыю карпу, які пакуль займае 83 працэнты ў агульных аб'ёмах прадукцыі рыбаводчых гаспадарак, павінны скласці такія каштоўныя віды рыбы, як асятровыя, сом і фарэль. Асноўная стаўка робіцца на вырошчванне еўрапейскага сома. Новымі для Беларусі відамі з'яўляюцца афрыканскі і канальны сом. Пры аптымальнай тэмпературы вады (26—30 градусаў) гэтая рыба прыбаўляе ў вазе 600—800 грамаў за год. Таму прынятае рашэнне вырошчваць яе ва ўстаноўках з замкнутай сістэмай водазабеспячэння. Першую ў краіне ўстаноўку па вырошчванні афрыканскага сома магутнасцю 20—30 тон плануецца ўвесці ў эксплуатацыю ў 2011 годзе ў рыбгасе «Волма».

Нарошчванне аб'ёмаў вытворчасці таварнай фарэлі ў 2011—2015 гадах плануецца за кошт будаўніцтва 11 спецыялізаваных фарэлевых гаспадарак басейнавага тыпу сумарнай магутнасцю 1,5 тысячы тон у год. Дарэчы, засваенне вытворчасці фарэлі ўжо распачалося на базе рыбагадавальніка «Багушэўскі». Анатоль Булыня ўпэўнены, што па меры развіцця фарэлегадоўлі будзе зніжацца і рознічная цана на гэтую каштоўную рыбу. Як сведчыць практычны досвед суседніх краін, гэтая рыба — вельмі прыбытковая: напрыклад, у Расіі рэнтабельнасць вытворчасці фарэлі дасягае 100 працэнтаў. За два гады можна вырасціць рыбу вагой 2,7 кілаграма, прычым атрымаць і мяса, і ікру адначасова. Цікава, што маленькая Фінляндыя вырошчвае да 12 тысяч тон фарэлі, Польшча — каля 20 тысяч. Не адмаўляецца ад штучнага развядзення рыбы і марская Нарвегія, якая вырошчвае 460 (!) тысяч тон фарэлі.

Не менш перспектыўным кірункам развіцця рыбнай гаспадаркі дырэктар дэпартамента лічыць асетрагадоўлю ў замкнутых установах. Гадаваць асятра ў натуральных прыродных умовах вельмі складана з-за нашых халодных зім. А ў штучных замкнёных установах адбываецца штучная ачыстка вады і кругавая яе цыркуляцыя, падтрымліваецца аптымальны тэмпературны рэжым. Першы пілотны праект па развядзенні асятровых у замкнёных установах і вытворчасці ікры (па ізраільскай тэхналогіі) плануецца рэалізаваць у рыбгасе «Палессе» ў Пінскім раёне. Тут будзе вырошчвацца да 200 тысяч тон рыбы ў год. У перспектыве такія вытворчасці стануць развівацца і ў іншых раёнах.

Увогуле, згодна з Дзяржаўнай праграмай развіцця рыбнай галіны на 2011—2015 гады, прадугледжана павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці каштоўных відаў рыб (асятровых, ласасёвых і сомавых) са 100 тон да 2,5 тысячы тон. Аб'ёмы вытворчасці таварнай рыбы павінны ўзрасці да 22,7 тысячы тон, а аб'ёмы перапрацоўкі прэснаводнай рыбы — да 4 тысяч тон у год.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Любанскі раён.

Пра тое, чаму трэба есці рыбу, як яе правільна гатаваць і якой рыбнай прадукцыі аддаць перавагу (марской ці рачной), — чытайце ў наступных нумарах «Звязды».

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Даведка «Звязды»:

У 2010 годзе ў Беларусі плануецца атрымаць 17,7 тысячы тон рыбы.

Прамысловы ўлоў з натуральных вадаёмаў складае штогод каля 900 тон рыбы.

Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, рыбаловамі-аматарамі вылоўліваецца штогод 8 тысяч тон рыбы.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

ТВОРЫ КОНКУРСУ СКЛАДАННЯ

С. Абраменка

Белыя: Kph5, Cd8, Cf1, Ke2, Kg4, пп. a2, c5, d3, h4 (9).
Чорныя: Kpf3, Kb1, пп. a3, f4 (4).
Мат за 4 хады.

С. Абраменка (г. Волжскі, Расія)
Белыя: Kpa1, Фf2, Лe5 (3).



Чорныя: Kph4, Лg3, пп. b6, b7, c6, c7, f3, g4, h5 (9).
Мат за 5 хадоў.
Чакаем вашых адказаў.

ПРАВЕРЦЕ СВАЁ РАШЭННІ

Змяшчаем адказы на задачы, апублікаваныя 1, 6 і 13 кастрычніка г.г.

А. Рушлевіч. 1. Kd4! 2. d6+, 1... Лe2+ 2. K:e2+, 1... Лb3+ 2. K:b3+, 1... Лf3+ 2. K:f3+, 1... Лc2 2. K:c2+.

У. Сычоў. 1. C:c5? Ca3! 2. C:a3 c5! 1. Cd4+? 1. Л:c5? 1. Лg4? Л:f2 2. d4+ cd 3. cdx, 1... Cf4 2. C:c5 і 3. Cd6x, 1... Kf4 2. Л:g5x, але 1... Ca3! 1. b6! 2. b7 і 3. b8Фх, 1... b2 2. C:c5! C:c4 3. Cd6x, 1... Kf4 2. Cd4+ cd 3. cdx, 1... g4 2. Л:c5+ Kpf4 3. Лf5x.

В. Разінкін. 1. Фh8? 2. Ф:h4, 1... Лe4 2. Ф:h4, 1... Л:f4 2. Л:d6, 1... Ce7 2. Ф:e5, але 1... h3!

1. Фa4! 2. Фa5+, 1... Лf3 2. Ф:c4, 1... c3 2. Ф:b3, 1... Cc7 2. Ф:c4.

Я. Арлоў. 1. Лe4 Kpd2 2. Ce3+ Kpd1, (1... Kpc3 2. Лb8 Лf1+ 3. Kpg3 Лg1+ 4. Kph4) 3. Cb6 Kpd2 4. Ca5+ Kpd1 5. b4 Kpd2 6. b5+ Kpd1 7. Лb4 Kpd2 8. Лb3+ Kpd1 9. Cd8 Kpd2 10. Cg5+ Kpd1 11. Cf6+ Kpd2 12. Cc3+ Kpd1 13. Cg7 Kpd2 14. Ch6+ Kpd1 15. Лg5 Kpd2 16. Лf5+ Kpd1 17. Лf4 Kpd2 18. Лc4+ Kpd1 19. Cg7 Kpd2 20. Cc3+ Kpd1 21. Cf6 Kpd2 22. Cg5+ Kpd1 23. Cd8 Kpd2 24. Ca5+ Kpd1 25. Лbc3 Kpd2 26. Л:c2 Kpd1 27. Лd2x.

В. Дуброўскі. 1. Фa3! 2. Kc3+, 1... C:b2 2. Cc3! C:a3 3. K:a3x.

У. Сычоў. 1. Фe5! 2. Ф:c5. 1... Л:d6 2. Kb8+ Kp:a5 3. Ф:c5+ Kpa4 4. Фb5+ Kpa3 5. Фb3x (пагроза)

1... c:d6 2. Kb8+ Kpa5 3. Фa1+ Kpb4 4. Kc6+! (Ka6?) Kp:c4 5. Фa2+ Kpb5 6. Фb3+ Kp:c6 7. Фb7x, 1... K:d6 2. Kb8+ Kp:a6 3. Фa1+ Kpb4 4. Ka6+! (Kc6?) Kp:c4 5. Фa4+ Kpd5 6. K:c7+ Kpe5 7. f4x.

ТВОРЧЫ КОНКУРС

Часопіс «Уральскі праблеміст» аб'яўляе творчы конкурс на тэмы шахматнай кампазіцыі: 1) конкурс красвордаў, 2) конкурс малюнкаў і шаржаў, 3) конкурс вершаў і эпіграм. Тры пераможцы ў кожнай намінацыі атрымаюць прызы. Тэрмін да 1.11.2010 г. на адрас: 125414, Масква, а/я 16, Расія, А. Селіванаву.

Дзікае «паляванне» Андрэя Булдакова

альбо Рэха ліхіх 90-х

Падрабязнасці

Уступіў у сілу прыгавор Гродзенскага абласнога суда ў дачыненні 36-гадовага Андрэя Булдакова, жыхара г. Ёшкар-Ала Расійскай Федэрацыі, які ў жніўні—снежні 1995 года «паляваў» у Беларусі на... уладальнікаў легкавых аўтамабіляў з мэтай завалодання транспартнымі сродкамі.

Былы спартсмен Булдакоў з развалам Саюза, як і многія іншыя моцныя хлопцы, кінуўся ў «бізнэс», а дакладней, стаў займацца незарэгістраванай прадпрымальніцкай дзейнасцю па дастаўцы былых ва ўжыванні аўтамабіляў з Заходняй Еўропы ў Расію. Аднак у канцы лета 95-га справы ў яго не заладзіліся, крэдыторы сталі ўсё часцей нагадваць пра даўгі. І тады расіянін, някепска падрыхтаваны фізічна, маючы разрад па ўсходніх адзінаборствах, захацеў вырашыць свае фінансавыя праблемы... на тэрыторыі Беларусі, «папаляваўшы» на тутэйшых аўтарынках, дзе ў той час ішоў жвавы гандаль папулярнымі іншамаркамі. Саўдзельнікаў не браў, паколькі рана ці позна кампаньён можа падвесці альбо здаць, ды і дзяліць здабычу на дваіх не хацелася. У поспеху Булдакоў, ведаючы не па чутках пра даверлівасць мясцовага насельніцтва, не сумняваўся. А ажыццяўленне сваіх планаў вырашыў распачаць з Гродна — памежнага горада на шляху ў Заходнюю Еўропу.

Маючы пры сабе самаробную агнястрэльную зброю для стральбы шарыкамі дыяметрам 7,1 мм, Булдакоў раніцай 6 жніўня з'явіўся на Гродзенскім аўтарынку, дзе сустрэўся з мясцовым «аўтагоншчыкам», жыхаром г. Скідаля Аляксандрам Е., які прыгнаў туды «прыцаніць» аўтамабіль свайго знаёмага «БМВ-318». Булдакоў прадставіўся багатым пакупніком з усходу, які не збіраецца таргавацца, а хоча толькі пракаціцца па навакольных дарогах, каб азнаёміцца з хадавымі якасцямі машыны. Нічога не падазраючы, прадавец згадзіўся... У выніку абгарэлы труп Аляксандра з прастрэленай галавой быў знойдзены праз пяць дзён у раёне вёскі Галавачы Гродзенскага раёна. А «БМВ» так і не знайшлі, бо ў той час ён быў ужо па-за зонай дасягальнасці мясцовых праваахоўнікаў. Злачынства тады засталося нераскрытым.

Акрылены поспехам, у пачатку снежня таго ж года Булдакоў з самаробным пісталетам вярнуўся ў Беларусь і на гэты раз выбраў аўтарынак у Мінску. Прыгледзеўшы «свежую» «Аўдзі-80» з транзітнымі нумарамі, падышоў да гаспадара і прапанаваў той жа варыянт: прадаць, але спачатку праверыць «колы» на трасе. Праўда, на гэты раз Булдакоў недаацаніў фізічныя «кандыцыі» прадаўца. Алег некалі служыў у дэсантных войсках і таксама быў, як кажуць, не з баязлівага дзясятка. У чым і пераканаўся «пакупнік». Праехаўшы каля дваццаці кіламетраў у бок Брэста, ён папрасіўся за руль, а калі Алег сеў на пасажырскае месца, то дастаў пісталет і запатрабаваў ключы і дакументы. Прадавец спачатку зрабіў выгляд, што моцна служаўся, але затым шпурнуў ключы ў траву і ўступіў у барацьбу, спрабуючы выхапіць пісталет. Аднак Булдакову ўдалося накіраваць ствол у грудзі чарговай ахвяры і націснуць курок. На шчасце мінчаніна, адбылася асечка, што і выратавала яго жыццё. А паядынак працягваўся. Аўтамабілі, якія праязджалі міма, спыняліся і вадзіцелі заклікалі хлопцаў спыніць бойку. У нейкі момант Алег вырашыў паклікаць іх на дапамогу, але Булдакоў націснуў на курок і стрэліў у паветра, прыгразіўшы перастраляць усіх, хто паспрабуе ўмяшацца. Зрэшты, гэта быў апошні патрон — больш страляць не было чым.

Усвядоміўшы, што на гэты раз авалодаць машынай не зможа, Булдакоў прапанаваў Алегу маўчаць пра напад, бо калі справа дойдзе да міліцыі, то ён будзе ўсё адмаўляць. Сцвярджаючы, што гэта гаспадар машыны першым на яго напаў, каб забраць грошы. І пісталет, маўляў, Алегу належыць, а Булдакоў толькі абараняўся. Гэтыя аргументы Алега пераканалі, і ён згадзіўся «разысціся з мірам». Нават сродак учынення нападу падзялілі: Булдакоў забраў пісталет, Алег — абойму.

Заява пра той паядынак у міліцыю сапраўды не паступіла. І гэта неўзабаве каштавала жыцця жыхару Магілёўскай вобласці Віктару Л., які сустрэўся на аўтарынку з «пакупніком» Булдаковым. Той пасля бойкі з мінчанінам Алегам ужо паспеў адпачыць у гасцініцы, дзе зарэгістраваўся па чужым пашпарце. А сустрэча з Віктарам скончылася тым, што праз некалькі дзён аўтамашына «Аўдзі-200» з беларускімі нумарамі з'явілася ў Ёшкар-Але, дзе была аддадзена Булдаковым за даўгі Вадзіму С. А ўладальнік іншамаркі застаўся ляжаць з прастрэленай галавой у прыдарожным лесе на маршруце Касцюковічы — Магілёў...

...Калі ў лютым 1996 года Вадзім паспрабаваў зарэгістраваць «Аўдзі-200» у мясцовай Дзяржаўтаінспекцыі, яму аб'явілі, што машына знаходзіцца ў вышуку. А Булдакоў на пытанне «як гэта разумець?», спакойна адказаў, што, мабыць, на рынку ў Маскве, дзе ён купляў машыну, нешта пераблыталі. І папрасіў даць яму гэты аўтамабіль, каб паехаць і ўсё ўладзіць. Вадзім пагадзіўся, перадаў ключы і... больш сваю «Аўдзі» не бачыў.

На след «паляўнічага» з Ёшкар-Алы праваахоўныя органы Беларусі выйшлі ў красавіку 1996 года. Адзін са сведкаў, які ў той дзень быў у Магілёве на аўтарынку разам з уладальнікам «Аўдзі-200» Віктарам Л., апазнаў Булдакова па фатаграфіі. Абедзве справы пра забойствы ў Магілёве і Гродне былі аб'яднаныя ў адну і накіраваныя ў Маскву, аднак там вырашылі, што доказаў дачынення Булдакова да гэтых злачынстваў недастаткова і вярнулі справу назад. Карпатлівая праца па расследаванні забойстваў працягвалася і ў Гродне, і ў Магілёве, адпрацоўваліся розныя версіі, але ўсё зноў сыходзілася на Булдакове. Калегі ж з Расіі па-ранейшаму сталі на сваім: дастатковых доказаў для арышту іх суайчынніка і прад'яўлення яму абвінавачвання ва ўчыненні двух наўмысных забойстваў з прымяненнем зброі няма. І яшчэ двойчы справа вярталася ў Генеральную пракуратуру Беларусі.

Тым часам Булдакоў вырашыў не спакушаць лёс і выехаць на пастаяннае месца жыхарства за мяжу. Ведаў, пэўна, што рана ці позна яго дачыненне да разбойных нападаў і забойстваў будзе даказана. Ды і не было сакрэтам тое, што праваахоўнымі органамі Беларусі ён аб'яўлены ў міжнародны вышук па лініі Інтэрпола.

Пошукі асабліва небяспечнага злачынцы зацягнуліся, і толькі праз 13 гадоў Булдакоў быў затрыманы паліцыяй Германіі ў адным з гарадоў на поўдні гэтай краіны. 21 красавіка мінулага года яго выдалі беларускаму боку.

Нямала давялося папрацаваць старшаму следчаму па найважнейшых справах Генеральнай пракуратуры Беларусі Пятру Радзько, каб прадаставіць суду доказы асабліва цяжкіх злачынстваў трынаццацігадовай даўнасці. Дапаматлі і сродкі масавай інфармацыі — менавіта з іх дапамогай удалося адшукаць Алега, які ў снежні 1995-га пасля паядынку з Булдаковым не паведаміў праваахоўнікам пра гэты разбойны напад. Удалося «разгаварыць» і сведкаў з ліку крэдытораў Булдакова, якім ён сёе-тое паведаміў пра свае прыгоды ў Беларусі.

На судзе Булдакоў усё адмаўляў, спасылаючыся на тое, што прайшло шмат часу і ён нічога не памятае, а аўтамашыны забітых людзей, маўляў, набываў на рынку ў незнаёмцаў. На тым жа будавалі абарону абвінавачванага і адвакаты. Аднак на падставе бясспрэчных і працэсуальна правільна сабраных падчас папярэдняга следства доказах старшаму пракурору аддзела пракуратуры вобласці Віталю Рабаву ўдалося пераканаць суд у віноўнасці Булдакова. 15 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці — такі судовы вердыкт у дачыненні «паляўнічага» з Ёшкар-Алы.

Адной «белай плямай» у гісторыі ліхіх 90-х стала менш.

Вячаслаў ІГНАЦІК,
старшы памочнік пракурора Гродзенскай вобласці.

(Імёны некаторых сведак і пацярпелых зменены).

У ДЗЯЎЧЫНЫ СКРАЛІ АЎТАМАБІЛЬ

У Глыбоцкі раённы аддзел унутраных спраў 29-гадовая жыхарка паведаміла пра тое, што ноччу са двара дома нехта паехаў на яе аўтамабілі «Опель», які яшчэ не паспелі зарэгістраваць у ДАІ. Міліцыянеры ўстанавілі, што на чужой машыне пакатаўся 26-гадовы раней судзімы беспрацоўны мясцовы жыхар. У замку запальвання машыны былі ключы, таму не было ніякіх праблем з'ехаць на чужых колах. Машыну вярнулі даме, а ў дачыненні да яе крыўдзіцеля, якога затрымалі, завялі крымінальную справу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Трастбанк

ЗАО «Трастбанк»
г. Минск, ул. Игнатенко, 11
www.trustbank.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2010 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2010 год	2009 год
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	13 482,4	6 911,4
3	Средства в Национальном банке	1102	23 299,3	102 192,8
4	Ценные бумаги:	1103	–	–
	для торговли	11031	–	–
	удерживаемые до погашения	11032	–	–
	в наличии для продажи	11033	–	–
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	60 660,6	80 817,7
6	Кредиты клиентам	1106	234 155,9	155 423,2
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	2 204,7	98,0
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	38 057,7	33 447,7
9	Прочие активы	1109	8 419,1	5 792,4
10	ИТОГО активы	110	380 279,7	384 683,2
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
12	Средства Национального банка	1202	–	–
13	Кредиты и другие средства банков	1205	32 443,0	9 544,8
14	Средства клиентов	1206	247 091,4	256 809,6
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208	12 099,4	47 219,7
16	Прочие обязательства	1209	5 192,3	16 825,0
17	ВСЕГО обязательства	120	296 826,1	330 399,1
18	**КАПИТАЛ**			
19	Уставный фонд	1211	48 785,7	22 944,7
20	Эмиссионный доход	1212	–	–
21	Резервный фонд	1213	4 880,1	4 405,1
22	Накопленная прибыль	1214	3 433,4	1 828,6
23	Фонд переоценки статей баланса

У БЯЛЫНІЧАХ АСВЯЦІЛІ АЎТОБУСЫ І ГРУЗАВІКІ

У Бялыніцкім філіяле аўтапарку № 7 ААТ «Магілёўаблаўтатранс» запрасілі да сябе настаяцеля храма Бялыніцкай Божай Маці протаіерэя Сергія, які асвяціў усе аўтамабілі.

— Гэта была сумесная ідэя з царквой, — патлумачыў **дырэктар філіяла Сяргей ГАПЕЕЎ**. — Асвяцілі 13 аўтобусаў і 20 грузавых аўтамабіляў. Мне здаецца, што нешта ў гэтым ёсць. У нас і раней аўтамабілі не траплялі ў аварыі, але мы вельмі хочам, каб і надалей не было ніякіх надзвычайных здарэнняў. Так што асвячэнне не будзе лішнім.

Айцец Сергій прачытаў малітву аб дапамозе вадзіцелям у іх нялёгкай працы. Кожны з супрацоўнікаў, які прыйшоў на ўрачыстае мерапрыемства ў выхадны дзень, атрымаў ад святара абярэг: абраз святога Мікалая Цудатворцы з малітвай аб ахове ў дарозе.

Ілона ІВАНОВА.

РАСКЛАД ДАПОЎНІЦЦА ШЭРАГАМ ДАДАТКОВЫХ ЦЯГНІКОЎ

Як паведамілі ў Мінскім аддзяленні Беларускай чыгункі, у бліжэйшы час у раскладзе руху з'явіцца шэраг дадатковых цягнікоў.

Так, прызначаюцца цягнікі: №547 Санкт-Пецярбург — Мінск, які будзе адпраўляцца з «паўночнай сталіцы» Расіі ў 21.20 29 кастрычніка і 3 лістапада, а прыбываць у Мінск у 10.15 адпаведна 30 кастрычніка і 4 лістапада; №548 Мінск — Санкт-Пецярбург, які будзе выходзіць з нашай сталіцы ў 12.02 30 кастрычніка і 7 лістапада, прыбываць у горад на Няве — у 5.18 31 кастрычніка і 8 лістапада; №512 Брэст — Масква, што адправіцца ў дарогу з горада над Бугам у 19.32 29 кастрычніка, будзе ў Мінску ў 23.42, зноў выправіцца адтуль у 0.11 і прыбудзе ў расійскую сталіцу ў 10.33 30 кастрычніка. З'явіцца ў раскладзе і дадатковыя цягнікі: №636 Брэст — Мінск, які выправіцца з Брэста ў 9.58 31 кастрычніка і 1 лістапада, а будзе ў Мінску ў 14.16 у гэтыя ж дні; №552 Мінск — Масква, чыё адпраўленне з беларускай сталіцы — у 0.19, прыбыццё ў «белакаменную» ў 12.20 — усё 30 кастрычніка; №512 Мінск — Масква, што выедзе з Мінска ў 0.11 31 кастрычніка і будзе ў Маскве раніцай у 10.33. Змогуць скарыстацца пасажыры і наступнымі цягнікамі: №621 Гомель — Мінск, які будзе выходзіць з Гомеля ў 20.35 24 і 31 кастрычніка, 7 і 14 лістапада, а прыбываць у сталіцу краіны ў 6.38 адпаведна 25 кастрычніка, 1, 8 і 15 лістапада; №211 Масква — Мінск, што выправіцца з «белакаменнай» у 21.09 22, 29 кастрычніка, 19 і 26 лістапада, а будзе ў беларускай сталіцы ў 5.49 23, 30 кастрычніка, 20 і 27 лістапада; №212 Мінск — Масква (адпраўленне ў 0.11 25 кастрычніка, 15, 22 і 29 лістапада, прыбыццё ў Маскву ў 10.33 у названыя дні). Да паслуг пасажыраў будуць і цягнікі: №557 Масква — Мінск, што выправіцца з Масквы ў 20.11 3 лістапада, а будзе ў нашай сталіцы ў 7.36 наступнай раніцай; №538 Масква — Мінск, які пойдзе ў дарогу з Масквы ў 9.32 4 лістапада, а ў расійскую сталіцу прыбудзе ўвечары ў 21.17; №515 Масква — Мінск (адпраўленне з «белакаменнай» у 0.07 4 лістапада, прыбыццё ў Мінск раніцай у 9.50); №510 Мінск — Масква (адпраўленне з Мінска ў 12.02 4 лістапада і прыбыццё ў расійскую сталіцу 5 лістапада ў 0.17). З'явіцца ў раскладзе і дадатковыя цягнікі: №551 Масква — Брэст, які будзе выпраўляцца з Масквы ў 0.49 4, 8 і 10 лістапада, прыбываць у Мінск у 10.24, зноў выпраўляцца ў 10.38, прыбываць у Брэст у 15.33 4, 8 і 10 лістапада; №552 Брэст — Масква (адпраўленне з Брэста ў 19.57 4 лістапада, прыбыццё ў Мінск у 23.59, адпраўленне ў 0.19, прыбыццё ў Маскву ў 12.38 5 лістапада); №437 Мінск — Брэст (адпраўленне з Мінска ў 0.45 8 лістапада, прыбыццё ў горад над Бугам у 4.44); №551 Масква —Мінск, які выправіцца з расійскай сталіцы ў 0.49 9 лістапада і будзе ў Мінску ў 10.24.

ЭЛЕКТРЫЧКІ БУДУЦЬ АДПРАЎЛЯЦЦА Ў ІНШЫ ЧАС

Па 17 лістапада зменены расклад руху некалькіх электрацягнікоў.

Паводле інфармацыі Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі, да азначанай даты электрычка Талька — Мінск, што раней адпраўлялася ў 19.54, зараз будзе выпраўляцца ў дарогу ў 20.10, а прыбываць на станцыю Мінск-Пасажырскі ў 21.49. Таксама зменіцца расклад руху наступных электрацягнікоў: Асіповічы — Мінск замест 5.19 будзе адпраўляцца ў 5.14, прыбываць на станцыю Мінск-Пасажырскі ў 7.24; Пухавічы — Мінск, які адпраўляецца ў 7.17, цяпер будзе прыбываць на станцыю Мінск-Пасажырскі ў 8.35 (дагэтуль было — 8.47).

Варта нагадаць таксама, што з 15 кастрычніка па пятніцах прызначаны электрацягнік Мінск — Брэст, які адпраўляецца са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 17.37, а прыбывае на станцыю Брэст у 21.56.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Ну і ну!

СЫН СКРАЎ У БАЦЬКІ

У міліцыю ў Гарадку звярнуўся па дапамогу 56-гадовы мужчына, які паведаміў, што сярод белага дня нехта скраў з ягонага дома пральную машыну. Злодзей разбіў аконную шыбу і трапіў унутр дома. Нехта скраў і газонакасілку, якая знаходзілася ў гаражы ў дварэ дома. Невядомы трапіў у гараж таксама праз аконны праём. Міліцыянеры ўстанавілі, што дабро вынес сын пацярпелага, 27-гадовы раней судзімы беспрацоўны. Пральную машыну канфіскавалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗАСТАЛІСЯ АД ЦЯЛЯТАК РОЖКІ ДЫ НОЖКІ

З малочнатаварнай фермы ў вёсцы Юдзічы Рагачоўскага раёна, якая належыць эксперыментальнай базе «Доўск», ноччу зніклі тры цяляці агульнай вагой 1500 кг. Вартасць прапажы — больш за 7 мільёнаў рублёў. Праз пяць дзён на мясцовай звалцы смецця былі знойдзеныя косткі дзвюх жывёлін, а ў дварэ мясцовага жыхара — астанкі яшчэ адной.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

БРАКАНЬЕРЫ ЦІ КАНТРАБАНДЫСТЫ?

Пінскія супрацоўнікі прыродаахоўнай міжрайінспекцыі сумесна з памежнікамі на возеры Белае (Драгічынскі раён) затрымалі 5 грамадзян Украіны, якія на маторных лодках парушылі мяжу Беларусі. Лодкі ў парушальнікаў забралі і склалі пратаколы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЗАВОХКАЕШ, ПАКУЛЬ ПАДНІМЕШ

У вёсцы Охава Пінскага раёна аператыўнікі знайшлі схованку, дзе ў дзевяці вялізных скрутках ляжалі жаночыя курткі імпартнай вытворчасці на суму амаль 19 млн рублёў. Што тут скажаш? Украіна блізка, лясных сцяжынак многа...

Яна СВЕТАВА.

ПРАЦОЎНАЙ ПЕНСІІ БЕЗ ПРАЦЫ НЕ БЫВАЕ

Прамая лінія

Тэма чарговай «прамой лініі» нашай газеты з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны — пенсіі, дапамогі і сацыяльныя паслугі. Такім чынам, на пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць намеснік міністра Валянціна Вікенцьеўна КАРАЛЁВА, начальнік аддзела арганізацыі пенсійнага забеспячэння Ніна Міхайлаўна ЛУЗІНА і начальнік упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Іван Пятровіч НАГІБІН.

(Працяг. Пачатак у нумары за 22 красавіка.)

☎— Майму бацьку, інваліду I групы, хутка споўніцца 80 гадоў. Ці атрымае ён у сувязі з гэтым надбаўку на догляд?

Раіса Мікалаеўна,
Дубровенскі раён

— Надбаўку на догляд ваш тата ўжо атрымлівае — як інвалід I групы. Памер такой надбаўкі ў яго адпавядае мінімальнай пенсіі па ўзросце, ці на сёння — 68.628 рублям. Прычым надбаўка на догляд была прызначана з дня вызначэння інваліднасці I групы.

☎— У 2005 годзе выйшла на датэрміновую пенсію паводле 20 артыкула Закона «Аб пенсійным забеспячэнні» (як маці, якая выхоўвала дзіця-інваліда) і працягвала працаваць. Цяпер мне споўнілася 55. Ці можна ў сувязі з гэтым перайсці на пенсію па ўзросце? І ці будзе выгадным такі пераход?

Галіна Міхайлаўна Штыкава,
г. Мінск

— Паводле 20 артыкула Закона «Аб пенсійным забеспячэнні», маці, якія выхоўвалі дзіця-інваліда не менш за 8 гадоў да яго паўналецця, маюць права на пенсію па ўзросце па дасягненні 50 гадоў. Такім чынам, вам ужо прызначаная пенсія па ўзросце. І ў выпадку, калі вы працягвалі працаваць пасля яе прызначэння, стаж можа быць павялічаны толькі за кошт перыяду працы да 1 жніўня 2006 года. Бо з 1 жніўня 2006 года праца пасля прызначэння датэрміновай пенсіі па ўзросце залічваецца ў стаж для перапраслеку пенсіі толькі пры ўмове яе неатрымання ў гэты перыяд.

☎— Чаму ў стаж дзяржслужбы не ўвайшла праца з 3 лістапада 1980 па 3 лістапада 1982 года вызваленым старшынёй прафкама калгаса? У 2007 годзе выйшла на пенсію з пасады старшыні сельсавета — на той момант стаж дзяржслужбы аказаўся 19 гадоў і 1 месяц, таму пенсію дзяржслужачага я не атрымліваю.

І яшчэ пытанне. Я атрымліваю працоўную пенсію, маю індывідуальны каэфіцыент 1,48 і працягваю працаваць. Колькі пенсіі я ў сувязі з гэтым губляю?

Ларыса Мікалаеўна Лушчык,
Баранавіцкі раён

— На першае пытанне можна адказаць толькі адно: залік работы вызваленага старшыні прафкама ў стаж дзяржслужбы сёння заканадаўствам не прадугледжваецца.

Што ж да пытання другога, то варта заўважыць: працуючым пенсіянерам (апроч пенсіянераў, занятых непасрэдна вытворчасцю сельгаспрадукцыі) выплачваецца пенсія з улікам каэфіцыента не больш чым 1,3. Каэфіцыент 1,48 «запрацуе» тады, калі вы ўжо не будзеце працаваць. Зрэшты, цяпер вы губляеце няшмат — недзе 12-15 тысяч рублёў у месяц.

☎— Завуць мяне Марыя Іосіфаўна. Мой муж загінуў на вытворчасці, на дзяцей прызначаная пенсія па страце карміцеля і выплаты ад «Белдзяржстраха». Аднак калі страхавыя выплаты індэксуюцца, то пенсія — застаецца працяглы час «замарожанай». Ці варта чакаць тут якіх-небудзь змяненняў?

— Не, Марыя Іосіфаўна, ніякіх змяненняў тут не будзе.

☎— Адпрацавала 35 гадоў, але атрымліваю вельмі малую пенсію — усяго 313 тысяч рублёў. Крыўдна, бо нават цяжка купіць тыя ж дровы. Напэўна, больш атрымліваюць нават тыя, хто ўвогуле ніколі не працаваў...

Надзея Віктараўна Будзько,
Слуцкі раён

— Прычына вашай нізкай пенсіі толькі адна: невысокія заробкі ў мінулым і, адпаведна, невысокі індывідуальны каэфіцыент. Аднак з улікам вашай па-сапраўднаму невысокай пенсіі вы можаце звярнуцца ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне — там разгледзяць пытанне пра магчымасць аказання аднаразовай дапамогі, у прыватнасці, на набыццё дроў.

Разам з тым дазвольце ўсё ж не пагадзіцца: пенсіі ў тых, хто не працаваў, не большыя — такія асобы атрымліваюць недзе каля 140 тысяч рублёў.

☎— Мяне завуць Ніна Уладзіміраўна. Маё дзіця стала інвалідам у 12-гадовым узросце. Ці магу я, як маці, якая выхоўвала дзіця-інваліда, выйсці на пенсію ў 50 гадоў?

— Не, Ніна Уладзіміраўна, пайсці на пенсію ў 50 гадоў вы не зможаце: для гэтага неабходна, каб вы выхоўвалі дзіця-інваліда не менш за 8 гадоў у перыяд да яго паўналецця.

☎— Маю адначасова права на пенсію як інвалід III групы ў сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС і на пенсію па ўзросце. Аддаў перавагу чарнобыльскай пенсіі, але ў сувязі з гэтым пазбавіўся права на льготы па падатках на нерухомасць і на зямлю. Чаму нельга выдаць пасведчанне, дзе быў бы пазначаны «двайны статус» — мяркую, тады б аніякіх пытанняў з падаткамі не ўзнікала б?

Уладзімір Іванавіч Кошчанка,
г. Рэчыца

— Паводле Закона «Аб пенсійным забеспячэнні» асобам, якія маюць права на некалькі відаў дзяржаўных пенсій адначасова, прызначаецца толькі адна з іх — па выбары. А пенсіянеру выдаецца пасведчанне вызначанай формы, у якім і ўказваецца від пенсіі, які ён атрымлівае. Такім чынам, калі вы атрымліваеце пенсію па інваліднасці, то падстаў для выдачы пасведчання пенсіянера па ўзросце (нават калі вы дасягнулі пенсійнага ўзросту) няма.

☎— Як будзе налічвацца пенсія былым воінам-афганцам, якія пасля вяртання з вайны не працуюць і не маюць інваліднасці?

Марыя, *Нясвіжскі раён*

— Калі няма групы інваліднасці, то, зразумела, гаворкі пра пенсію па інваліднасці быць не можа. Пасля ж дасягнення пенсійнага ўзросту ўсё будзе вырашаць наяўнасць стажу. Калі стаж з выплатай узносаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання складзе больш за пяць гадоў, то прызначаць працоўную пры нявопыўным стажы, а калі менш за пяць гадоў — то сацыяльную пенсію.

☎— За які час сёлета вылічваецца індывідуальны каэфіцыент? І што будзе ў выпадку, калі за патрэбны перыяд захаваліся не ўсе звесткі пра заробкі?

Аляксандр, *г. Мінск*

— Сёлета індывідуальны каэфіцыент разлічваецца за 16 гадоў запар з 26 апошніх гадоў працы. Калі ж за пэўны час у патрэбным перыядзе не захаваліся звесткі пра зарплату, то варыянт адзін — паспрабаваць аднавіць гэтыя звесткі праз суд.

☎— У 1980-90 гадах дачка разам з мужам-вайскоўцам жыла ў Германіі, прычым 4 гады працавала там настаўніцай, а 3 гады — сувязістам. Чаму гэтыя гады не ўвайшлі ў стаж?

Антаніна Вікенцьеўна,
Свіслацкі раён

— Калі ёсць адпаведны запіс у працоўнай кніжцы, то час працы ў Германіі ў стаж павінен увайсці. І, дарэчы, у выпадку праблем з запісам у працоўнай кніжцы, у пацвярджанне стажу могуць прымацца даведкі, якія выдаюцца вайсковай часткай або архівам Міністэрства абароны.

Што ж да заробку, то канвертацыі валюты ў нас не робіцца, адпаведна, зарплата падчас працы ў Германіі ў разлік не бярэцца — інакш кажучы, пры разліку індывідуальнага каэфіцыента гэтыя перыяды проста не ўлічваюцца.

☎— Якая павінна быць даплата да пенсіі ліквідатару аварыі на Чарнобыльскай АЭС па 19-м артыкуле? У раёне мне налічылі 50 працэнтаў базавай велічыні — 17,5 тысячы рублёў. Ці правільна гэта?

Валерый Мікалаевіч,
г. Паставы

— Паводле артыкула 23 Закона «Аб пенсійным забеспячэнні», мінімальны памер пенсіі па ўзросце адпавядае 25 працэнтам найбольшай велічыні бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва за два апошнія кварталы. У кастрычніку мінімальны памер пенсіі па ўзросце складае 68.628 рублёў. А павышэнне да пенсіі грамадзянам, якія прымалі ўдзел у работах па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у зоне эвакуацыі (адчужэння) вызначаны ў 50 працэнтаў гэтай сумы — такое павышэнне складае 34314 рублёў.

Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтаваў Сяргей ГРЫБ.
(Працяг будзе.)

Фота Анатоля КЛЕЦКУЛА.

Выбары-2010 Электаральны аналіз

«ТАКОГА ЯШЧЭ НІКОЛІ НЕ БЫЛО!»

Сацыёлаг Ігар КАТЛЯРОЎ уражаны актыўнасцю сёлетняй выбарчай кампаніі

Электаральная кампанія кіпіць ва ўсю. Патэнцыйныя кандыдаты вылучаюцца і здымаюцца, назіральнікі ўсё больш актывізуюцца, арганізатары выбараў тым часам памаленьку рыхтуюць ратнае поле. Створаныя ўжо ўчасткі для галасавання. А як на ўсім гэтым адчуваюць сябе звычайныя людзі? У кожнага паасобку не спытаеш... Расцей пайсці да сацыёлага. Змадэляваць карціну ўяўленняў беларусаў дапаможа дырэктар Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, доктар сацыялагічных навук, прафесар Ігар КАТЛЯРОЎ.

— Як настрой у беларусаў на парозе галоўнай палітычнай падзеі?

— Паводле сацыялагічных даследаванняў, якія мы пастаянна праводзім, у краіне дастаткова стабільная сітуацыя — і сацыяльная, і палітычная, і эканамічная. Крызіс амаль не паўплываў на грамадскую думку. Самае складанае становішча ў краіне было ў пачатку незалежнасці. А вось апошнія гады мы стабільна і ўпэўнена развіваемся. Калі казаць пра стаўленне насельніцтва да розных галін улады, то ўжо на працягу 10 — 12 гадоў інстытут прэзідэнцтва нязменна займае першае месца. Прычым значна апярэджвае астатнія ўладныя структуры, уключаючы Урад, парламент, мясцовыя органы кіравання і самакіравання.

— З якой доляй верагоднасці сацыёлагі могуць рабіць прагнозы ў дачыненні электаральных пераваг насельніцтва?

— Спецыяльна да выбараў мы не праводзілі сацыялагічныя даследаванні, але калі працягнуць у будучыню звесткі нашых рэгулярных маніторынгаў, то можна рабіць высновы. Скажам, калі б выбары адбыліся заўтра, то дзейны кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка перамог бы ў першым туры, набраўшы прыкладна 75—80 адсоткаў галасоў. Грамадская думка дастаткова стабільная, таму сцвярджаць такую лічбу можна досыць упэўнена.

— Яшчэ свежыя ў памяці нядаўнія рознагалоссі з расійскім бокам. Як, на ваш погляд, яны могуць паўплываць на выбары — на стаўленне насельніцтва, прызнанне назіральнай місіяй СНД?..

— Думаю, выбары ў любым выпадку будуць місіяй СНД прызнаныя. Аднак вось гэты абмен «неласкавасцямі» з боку ўладных структур, вядома ж, стварае пэўную напружанасць, нервовасць у грамадстве. І, натуральна, перад выбарамі не хацелася б, каб гэта адбывалася. На жаль, у Расіі ды і ў некаторых іншых краінах ёсць палітыкі, якім яўна не падабаецца незалежная палітыка Рэспублікі Беларусь, якія хацелі б, каб яна скакала пад чужую дудку. І таму некаторыя палітыкі абралі такі не зусім удалы, а можа, на іх думку, і самы ўдалы момант, — перадвыбарную кампанію. Аднак беларусы ўсё цудоўна разумеюць, яны здольныя зрабіць правільны выбар. І ў прынцыпе нават такі мэтанакіраваны ціск на наш электарат безумоўна не зможа зрушыць яго ці істотна паўплываць на яго меркаванне.

— Якія ў вас уражанні ад збору подпісаў? Сваім ужо кагосьці падтрымалі? Некаторыя кандыдаты робяць сапраўднае шоу!..

— Сапраўды! З задавальненнем прайшоўся па пікетах: як сацыёлагу мне было цікава. І ведаеце, я быў уражаны. Такога яшчэ ніколі не было! Калі побач стаяць пікеты 5—7 патэнцыйных кандыдатаў у прэзідэнты, і людзі аддаюць свае подпісы практычна ўсім. І я падпісаўся ўжо ў падтрымку аднаго кандыдата. Тое, што пікеты ператвараюцца ў шоу — гэта нармальная з'ява. Цяпер ідзе даволі напружаная і мэтанакіраваная дзейнасць. Аднак хацелася б звярнуць увагу: перш за ўсё ў Мінску. Паводле нашых звестак, у глыбінцы ініцыятыўнымі групамі, апроч групы дзейнага Прэзідэнта, практычна ніякай работы не вядзецца. Таму многія жыхары краіны наогул нічога не ведаюць пра гэтых патэнцыйных кандыдатаў у прэзідэнты. Другі негатыўны момант: *члены ініцыятыўнай групы ў большасці сваёй амаль нічога не ведаюць пра таго, за каго збіраюць подпісы*. Улётка, размешчаная на стэндзе, практычна не дае новай цікавай інфармацыі. А калі людзі пачынаюць цікавіцца канкрэтыкай, поглядам магчымага прэзідэнта на тую ці іншую праблему, на жаль, зборшчыкі подпісаў нічога не могуць сказаць. Гэта праблема. Выснова, якая напрошваецца сама сабой: *многія патэнцыйныя кандыдаты ў прэзідэнты выпучыліся па абсалютна незразумелых прычынах і зусім не рыхтаваліся да выбарчай кампаніі*.

— Можа, тут сыграла ролю адносна нечаканасць яе старту, ды і некалькі рэальна даць падрабязныя інструкцыі тысячам чалавек?

— А што змянілася б, калі б выбары правядзіліся двума месяцамі пазней?! Першапрычына ў іншым. Ёсць істотная праблема, пра якую мы пастаянна гаворым. Галоўны палітычны інстытут, які займаецца рэкруцінгам кадраў, іх падборам і расстаноўкай — партыі — на выбарах зноў, на жаль, спрацаваў недастатковым чынам. Калі б нашы палітычныя партыі вялі актыўную работу, выконвалі сваё прызначэнне, была б зусім іншая справа. А пакуль самі яны маламагутныя, лідары нецікавыя. Яны не валодаюць неабходнымі прафесійнымі якасцямі, харызмай, і таму ім цяжка канкурыраваць на электаральным рынку. Пра гэта сведчыць хоць бы той факт, што за выключэннем кіраўніка Ліберальна-дэмакратычнай партыі Сяргея Гайдукевіча, які ўжо зняў сваю кандыдатуру, *ні адзін партыйны лідар не стаў нават прэтэндэнтам на прэзідэнцкі пост*. Як вынік, сярод кандыдатаў мноства людзей абсалютна выпадковых, якія відавочна не набяруць 100 тыс. подпісаў выбаршчыкаў, бо гэта вельмі складаная работа. Да яе трэба рыхтавацца. Гэта робіцца не ў апошні дзень, а пастаянна. Калі я быў кандыдатам у дэпутаты парламента, у мяне была група каля 100 чалавек, і я з імі працаваў пастаянна — расказваў, паказваў, усюды вадзіў за сабой. Я балатаваўся тройчы, і кожны раз праводзіў такую падрыхтоўку. А проста сабраць людзей, раздаць ім пасведчанні з падпіснымі лістамі і папрасіць іх агітаваць за цябе — гэтага вельмі мала. Гайдукевічу, скажам, было б прасцей — ён дастаткова вядомы палітык. А ёсць жа сярод прэтэндэнтаў такія, якіх ніхто ніколі не чуў і не бачыў. Ці можа набрасць 100 тыс. подпісаў беспрацоўны, які да таго ж не мае аніякага досведу палітычнай дзейнасці?..

— Ну, гэта мы пабачым 29 кастрычніка, калі назбіраныя «вензелі» трэба будзе здаць. А пакуль, як вы думаеце, з адыходам Сяргея Гайдукевіча кампанія істотна страціла? Як вы ў цэлым ацэньваеце яе ход?

— Ды не, выбарчая кампанія ад гэтага асабліва нічога не страціла. Акрамя таго, што Гайдукевіч быў рэальным кандыдатам на праход у наступны тур — гэта дакладна. І свае 3—5 адсоткаў як кандыдат у прэзідэнты ён, вядома ж, набраў бы. Але не больш. Калі гаварыць у цэлым пра выбарчую кампанію, то яна праходзіць на дастаткова высокім узроўні. І нашы даследаванні па іншых тэмах сведчаць пра тое, што паступова расце і грамадзянская культура, і палітычная самасвядомасць людзей, іх палітычная актыўнасць. Пра гэта гаворыць і вялікая колькасць кандыдатаў у кандыдаты.

— Яны, дарэчы, пакрысе знаёмяць выбаршчыкаў са сваімі праграмамі. Вы як сацыёлаг возьмецеся ацаніць, ці ёсць там тое, чаго чакае народ?

— Тыя праграмы, якія з'яўляюцца ў інтэрнэце — гэта проста накіды. І рабіць па іх нейкія высновы пакуль проста немагчыма. Той жа Юрый Глушакоў з беларускай партыі «Зялёных». Так, ён прапанаваў сваю праграму, аднак яна не можа быць перадвыбарчай, таму што цэлага шэрагу праблем, на мой погляд, там няма. Я хацеў бы асаблівую ўвагу звярнуць на тое, што ў беларускай палітыцы ўвогуле самы слабы аспект — гэта якраз аналітыка. Многія апазіцыйныя аналітычныя службы ў прынцыпе не ведаюць меркаванне людзей, не могуць прапанаваць канкрэтнае рашэнне той ці іншай праблемы. Ці не з-за гэтага нашы палітычныя партыі маюць рэйтынг ад 0,3 да 2 адсоткаў? А сёння аналітыка становіцца адным з найважнейшых аспектаў палітычнай дзейнасці. І вось гэтая адсутнасць цікавых аналітычных матэрыялаў, канкрэтнай піяр-кампаніі, знаходак у перадвыбарчай барацьбе кажа пра тое, што многія з тых палітыкаў, якія прэтэндуюць на пасаду прэзідэнта, зразумела, не набяруць шмат галасоў. Яны не здзіўляюць нічым новым і арыгінальным. Гэта звычайная палітычная прапаганда, прычым не ў самых лепшых традыцыях. Яна фактычна не дае ніякіх вынікаў. Спадзяюся, што сапраўдная перадвыбарчая барацьба пачнецца пасля таго, як зарэгіструюць кандыдатаў.

— Тэле- і радыёдэбаты ў гэтай барацьбе стануць вырашальнай зброяй?

— У прынцыпе, да такой формы выбарчага спаборніцтва я стаўлюся станоўча. Толькі практычна ўсім прэтэндэнтам, акрамя дзейнага кіраўніка дзяржавы, не будзе чаго сказаць. Людзі, калі стануць выбіраць сваё будучае жыццё на наступныя пяць гадоў, будуць глядзець на тое, што зроблена, і ці здольныя гэтыя кандыдаты нешта прапанаваць і нешта зрабіць. Ну а дэбаты пакажуць глупства кожнага, хто яго мае.

— А якія якасці найбольш цэняцца беларускім электаратам? Які ён, партрэт ідэальнага кандыдата, згодна з сацыялагічнымі даследаваннямі?

— Сярод тых якасцяў, якія хацелі б бачыць жыхары нашай краіны ў прэзідэнта, варта назваць высокі прафесіяналізм, здольнасць браць на сябе адказнасць у складаныя палітычныя моманты, шукаць выйсце ў найскладанейшай сітуацыі, уменне прымяняць інавацыйныя падыходы да вырашэння праблем, якія ўзнікаюць, улічваць думку простага чалавека. Усё гэта ўласціва дзейнаму кіраўніку дзяржавы. Яго, дарэчы, сёння падтрымлівае пераважная большасць жыхароў краіны — у адпаведнасці з нашымі даследаваннямі. Таму што ён паказаў, што ён і добры гаспадарнік, і добры палітык, чалавек, які здольны вырашаць праблемы ў няпросты час. Пра гэта гаворыць стан беларускай эканомікі, нашага грамадства ў крызіснай сітуацыі. Мы ў апошнюю чаргу адчулі тыя праблемы, якія ўжо працяглы час былі вельмі адчувальнымі нават у нашых суседзяў у Расіі. Нават тое, што Прэзідэнт пастаянна знаёміцца з нашымі сацыялагічнымі даследаваннямі, часта спасылаецца на іх у сваіх выступленнях і прымае па іх рашэнні, сведчыць пра тое, што меркаванне жыхароў Беларусі для яго вельмі важнае. І людзі гэта цудоўна бачаць.

— Але ж ёсць, натуральна, і пратэстны электарат...

— Так, безумоўна. На ім і будуць іграць асобныя кандыдаты падчас дэбатаў. Аднак пратэстнага электарату працэнтаў 12—15. Не больш. Гэта людзі, якіх можна пры дапамозе нейкіх пратэстных заяў схіліць на свой бок. Аднак іх, па-першае, няшмат. А па-другое, яны, як правіла, не ходзяць на выбары. Калі меркаваць па выніках мінулых парламенцкіх выбараў, яны відавочна праігнаравалі электаральную падзею.

Нам застаецца толькі з цікавасцю сачыць за тым, як будуць змагацца за галасы кожнага з нас. Бо барацьба за подпісы неўзабаве наблізіцца да фіналу. У канцы месяца даведаемся, хто атрымаў кандыдацкі «максімум», а хто не здолеў сабраць і мінімальных 100 тысяч подпісаў у сваю падтрымку. Спіс канкрэтных кандыдатаў акрэсліцца не пазней за 23 лістапада. Тады, відаць, і пачнецца самае цікавае. Мы ў прадчуванні!

Зоя ВАРАНЦОВА.

У выбарчай кампаніі тым часам усё ідзе сваім парадкам. Ужо вызначаныя месцы для галасавання: 6346 участкаў у Беларусі і 44 — за яе межамі (у пасольствах і консульствах нашай краіны). Так што, нашы суграмадзяне змогуць зрабіць свой выбар нават з Венесуэлы, Кітая, ПАР і іншых далёкіх краін.

Распачынаецца вылучэнне прадстаўнікоў у склад участковых камісій, дзе павінна працаваць ад 5 да 19 чалавек (за выключэннем замежных участкаў, дзе, натуральна, можна абысціся і меншай колькасцю). На месцы ў «святой святых» выбараў — там, дзе падлічваюць галасы — маюць права прэтэндаваць прадстаўнікі палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў. Вылучацца могуць і грамадзяне шляхам падачы заяў. Зрабіць гэта не позна да 31 кастрычніка ўключна. А да 3 лістапада стане ўжо вядома, хто ж патрапіў у склад камісій.

Расце інтарэс да нагляду за выбарамі. Выбаркамы ўжо акрэдытавалі больш за 270 нацыянальных назіральнікаў. 24 з іх прадстаўляюць партыі (КПБ, АГП, партыю «Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада», Рэспубліканскую партыю, а таксама Рэспубліканскую партыю працы і справядлівасці), 152 — ад грамадскіх аб'яднанняў (больш за ўсё скіравалі Белая Русь, ФПБ, Беларускі саюз жанчын, БРСМ і Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў).

Доўгатэрміновае назіранне днямі распачала місія СНД. АБСЕ, як чакаецца, прыступіць да маніторынгу прэзідэнцкіх выбараў у сярэдзіне лістапада.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ, НАХОДЯЩИХСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ, И НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ ОБСЛУЖИВАНИЯ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Аукцион состоится **25 ноября 2010 г. в 11.40** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел. 8(0222)229022, 311185, 223375.

Продавцы имущества: по лоту № 1 – Министерство промышленности Республики Беларусь, тел. 8 (0225) 434020; по лоту № 2 – концерн «Белнефтехим», тел. 8 (0222) 22 21 98, 39 18 26; по лотам №№ 3–5 – ГУ «Бобруйское эксплуатационное управление Вооруженных Сил», тел. 8 (0225) 481011; по лотам № 6 и № 7 – РУП «Белпочта», тел. 8 (017) 2260173, 2261170.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **23 ноября 2010 г. с 8.00 до 15.00.** Заключительная регистрация участников аукциона **25 ноября 2010 г. с 10.00 до 10.50.**

№ лота	Сведения о предметах аукциона							Сумма задатка, тыс. руб.
	Информация о недвижимом имуществе			Информация о земельных участках			Начальная цена предмета аукциона, тыс. руб.	
	Наименование и краткая характеристика	Место нахождения	Начальная цена недвижимого имущества, тыс. руб.	Площадь, га	Срок аренды, лет	Начальная цена права заключения договора аренды земельных участков, тыс. руб.		
1	Незавершенное законсервированное капитальное строение, одноэтажное, стены панельные, кирпичные, площадью 7 355,5 кв.м	г. Могилев, Славгородское шоссе	1 827 405,224	2,4896	50	360 187,587	2 187 592,811	100 000,0
2	Здания и сооружения базы отдыха «Надежда», находящиеся по договору безвозмездного пользования у ОАО «Могилевский «ЗИВ»	Могилевская обл., Могилевский р-н, район дер. Межисетки	794 113,628	5,2617 и 0,3600	50	1 167,600	795 281,228	50 000,0
3	Капитальные строения: здание 1/39 поликлиника одноэтажное кирпичное площадью 652 кв.м с асфальтовым мощением площадью 42 кв.м; сети водопровода ВК-6/КЖ39 протяженностью 73,6 м, сети канализации КЖ-ККЗ1 и КЖ-ККЗ протяженностью 153,85 м, кабельные линии КЯ16-КЯ-14 и КЖ-КЯ13 протяженностью 143,9 м	Могилевская область, г. Бобруйск, военный городок № 1 «Крепость»	810 717,859	0,2368	30	125 562,076	936 279,935	90 000,0
4	Капитальное строение (гараж неотапливаемый) одноэтажное площадью 1196 кв.м с мощением асфальтовым площадью 1 189 кв.м	Могилевская обл., г. Бобруйск, военный городок № 5 «Авиагородок»	88 610,588	0,2692	50	157 498,422	246 109,010	24 000,0
5

Краіна здароўя

Выпуск № 56 (225)

АМЕРЫКАНСКІЯ ВУЧОНЫЯ ВЫЯВІЛІ АНТЫАЛКАГОЛЬНЫ ГЕН

Амерыканскія вучоныя з Універсітэта штата Паўночная Караліна выявілі ў чалавека ген, здольны папярэджваць алкагалізм, паведамляюць інфармагенцтвы.

Падчас даследаванняў спецыялісты высветлілі, што да 20 % сучаснага насельніцтва планеты маюць ген CYP2E1, які не толькі засцерагае арганізм ад алкаголю, але і прыводзіць да поўнай адмовы чалавека ад ужывання спіртных напояў.

«Ген выклікае фізічную агіду да алкаголю», — заявіў кіраўнік даследаванняў прафесар Кірк Вілхелмсен. Паводле яго слоў, атрыманыя вынікі адкрываюць шлях да стварэння найноўшых лекаў для лячэння алкагольнай залежнасці, заснаваны на генетыцы.

ПАДУШКА ПАД ВУШКА

Ключы да здароўя

СПАЧАТКУ невялікі тэст на сумяшчальнасць. Уладкоўваючыся спаць, ці кладзяце вы пад галаву далонь? Ці часта прачынаецеся? Ці зацякаюць да раніцы шыя і плечы? Калі на ўсе гэтыя пытанні вы адказалі сцвярджальна, значыць, падушку пара мяняць.

Ад становішча галавы падчас сну залежаць і многія іншыя рэчы. Храп, начныя кашмары і нават дачасныя маршчыны на шыі могуць азначаць, што вы спіце ў няёмкай позе і не можаце як след расслабіцца. Якой жа павінна быць правільная падушка?

СКАЖЫ МНЕ, ЯК ТЫ СПІШ

У залежнасці ад формы падушкі дзеляцца на класічныя і артапедычныя.

Класіка — гэта тое, да чаго мы прывыклі з дзяцінства: прамавугольнікі або квадраты. Артапедычныя падушкі на выгляд дзіўныя — нібы збіраешся спаць на запчасткі ад якой-небудзь іанічнай капітэлі. Затое ўсе гэтыя валікі і выемкі цудоўна падтрымліваюць галаву падчас сну і зніжаюць нагрузку на шыю. Таму асабліва рэкамендуюцца тым, у каго ёсць праблемы з пазваночнікам, асабліва яго шыйным аддзелам. Безумоўна, нават самая наварочаная падушка не заменіць візіт да доктара, але спаць на ёй будзе больш камфортна.

Выбар вышыні і жорсткасці падушкі залежыць ад вашых звычак.

● **Часцей за ўсё спіце на баку?** Тады выбірайце дастатковa цвёрдую класічную або артапедычную мадэль, прычым чым шырэйшыя плечы, тым павінна быць вышэйшай (максімум — 17 см).

● **Калі звычайна вы спіце на спіне**, падыдзе падушка сярэдняй жорсткасці каля 10—12 см у вышыню.

● **Лічыце за лепшае глядзець сны, лежачы на жываце?** Выбірайце мяккія варыянты (таўшчынёй ад 6 см) — інакш будзе стамляцца шыя.

● **Усю ноч круціцеся, як вуж на патэльні**, — бярыце класічны варыянт сярэдняй жорсткасці і вышыні. І не забудзьцеся ўлічыць параметры матраца — чым мякчэйшы ён, тым вышэйшай павінна быць падушка.

АВЕЧКІ, ШАРЫКІ І ЛАТЭКС

Пацікаўцеся падчас пакупкі, чым напоўненая мадэль, упадабаная вамі. Натуральныя пух і пяро сёння модна лаяць: за вязкасць, гіграскапічнасць, алергеннасць і спецыфічны пах. Папулярнасцю ж карыстаецца **штучны лебядзіны пух** — такі ж мяккі, як натуральны, але пры гэтым гіпаалергенны і без паху. Або **камфарэль — невялікія шарыкі, скручаныя з сіліканізаванага валакна** з антыбактэрыяльнай апрацоўкай. Падушкі, напоўненыя імі, можна сціраць; яны хутка сохнуць, не страчваючы формы; у іх не заводзяцца пылавыя кляшчы.

Прыхільнікам эка-стылю падыдуць **воўна і шалупіна ад грэчкі**. Першая быццам бы валодае асаблівай гаючай сілай, таму што шарсцінкі, якія трушчацца адна аб адну, выпрацоўваюць электрастатычнае напружанне (трэба заўважыць, што звычайна ад яго якраз імкнуцца пазбавіцца). Воўна за кошт «звілістасці» пругкая і добра праводзіць цяпло. Спаць на ёй зручна і прыемна, аднак вельмі хутка шэрсць збіваецца, і разблытаць гэтыя каўтуны немагчыма — прасцей купіць новую падушку.

Грэцкая ж луска па начах шамаціць. Безумоўна, яна вельмі экалагічная, сон на такой падушцы чымсьці нагадвае сеанс мяккага масажу шыі і патыліцы (некаторыя фанаты здаровага сну наогул спяць на падушках, напоўненых грэцкімі крупамі). Але калі ў вас тонкая душэўная арганізацыя, і вы прачынаецеся ад любога шоргату, лепш выбраць «маўклівы» матэрыял.

Напрыклад, **натуральны шоўк**. Коканы тутавага шаўкапрада акуратна разразаюць і расцягваюць — атрымліваецца бязважкае, як павуцінне, палатно. Яго згортваюць некалькі разоў і зверху надзяваюць баваўняны чахол. На такіх падушках надзіва салодка спіцца — нездарма ва ўсе часы яны былі абавязковай часткай пасагу кітайскіх дзяўчат з багатых сем'яў. Натуральны шоўк гіпаалергенны, не збіваецца і не пахне — хіба што слабы водар выдзяляюць высушаныя пялёсткі хрызантэм, якімі часам пракладваюць шаўковыя слаі.

Для тых, каму шаўковыя падушкі падаюцца занадта мяккімі, выпускаюць варыянты больш жорсткія, дадаючы да шоўку сіліконавыя валокны.

Адзін з самых прагрэсіўных напаўняльнікаў — **натуральны латэкс з успененага каўчуку**. Ён мяккі, пругкі, лёгка падладжваецца пад вас і далікатна падтрымлівае падчас сну. Асабліва рэкамендуецца дзецям.

Матэрыялы могуць камбінавацца — дапусцім, у артапедычнай падушцы аснова можа быць з камфарэлі, а валік — з латэксу. У некаторых мадэлях унутры ёсць спружыны, як у матрацах.

ЦІ ПАМЯТАЕШ ТЫ?..

Але самыя спецыфічныя падушкі — «з эфектам памяці». Гэта цалкам фантастычныя аб'екты з напаўняльнікам, які рэагуе на вагу і цяпло. Кладзеш галаву на такую падушку — а яна з затрымкай у некалькі секунд раптам мякка правальваецца, прымаючы форму тваёй галавы і нібы абвалакае яе. Памяняеш позу — яна, зноў жа з невялікай затрымкай, у адным месцы правальваецца, у іншым — выпростваецца. Карацей, жыве ў вас пад вухам нейкім сваім тайным жыццём. Адных такія футурыстычныя прымочкі прыводзяць у дзіцячае захапленне, у іншых «пластылінавасць» выклікае агіду. Дарэчы, сціраць такія падушкі катэгарычна забараняецца.

ПАХКАЯ СЯБРОЎКА

А ці спрабавалі вы спаць на падушцы з траў? З даўніх часоў высушаныя расліны выкарыстоўваліся для вырабу невялікіх гаючых падушак. Іх прыемны водар не толькі ратуе ад бяссонніцы, але і наогул аказвае дабратворны ўплыў на здароўе. Пакладзіце такую падушачку ў спальні, і яна навее вам спакойныя сны. Галоўнае, каб у падушачку не трапілі травы, пахі якіх вас раздражняюць.

Такім чынам, набіваем падушкі:

● базілік, валяр'ян, лаванда, меліса, мята, рамонак, кветкі хмелю супакояць нервовую сістэму і дапамогуць пры бяссонніцы, пры скачках артэрыяльнага ціску;

● ліпа, бяроза, верас — карысныя пры захворваннях лёгкіх;

● елка, сасна, таполя — пры парушэннях артэрыяльнага ціску;

● канюшына лугавая, васілёк, бэз — пры бяссонніцы, галаўным болі;

● размарын, каляндра, базілік — пры захворваннях верхніх дыхальных шляхоў;

● размарын, яловыя галінкі, высушаная цэдра лімона, пялёсткі ружы, мята — дапамогуць прачнуцца, нададуць бадзёрасці.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Доктар адкажа

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

На будучым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

25 кастрычніка — намеснік дырэктара РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Людміла Антонаўна ПАШКЕВІЧ.

26 кастрычніка — намеснік дырэктара НДІ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Аляксандр Сяргеевіч ПЯТКЕВІЧ.

27 кастрычніка — дырэктар РНПЦ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі Васіль Уладзіміравіч СМЫЧАК.

28 кастрычніка — намеснік дырэктара РНПЦ траўмалогіі і артапедыі Андрэй Уладзіміравіч БАРЫСАЎ.

29 кастрычніка — дырэктар РНПЦ гігіены Валерый Пятровіч ФІЛОНАЎ.

«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25

25 кастрычніка — загадчык лячэбна-дыягнастычнага аддзялення Мінскага абласнога псіханеўралагічнага дыспансэра Алена Андрэеўна ЦЭБРА.

26 кастрычніка — загадчык гастраэнтэралагічнага аддзялення Мінскай абласной клінічнай бальніцы Аляксандр Гаўрылавіч САСНОЎСКІ.

27 кастрычніка — загадчык філіяла № 1 Мінскай ЦРБ «Атолінская бальніца» Мікалай Георгіевіч ГРЫШУК.

28 кастрычніка — старшыня спецыялізаванай фтызіяпульманалагічнай МРЭК Ларыса Мікалаеўна ЦІТОВА.

29 кастрычніка — загадчык аддзялення функцыянальнай дыягностыкі Мінскай абласной клінічнай бальніцы Марына Міхайлаўна ЛЯШКОВІЧ.

У графіку магчымыя змены.

Дапамажы сабе сам

5 спосабаў палепшыць абмен рэчываў

Вядома, што для паспяховага зніжэння вагі і захавання стройнасці неабходна, каб абмен рэчываў у арганізме быў у норме. Як паскорыць метабалізм?

1. Ешце больш гародніны, якая ўтрымлівае малую колькасць пратэінаў (шпінат, капуста, брокалі). Аднак у такі рацыён неабходна ўключыць у невялікіх колькасцях і больш сытную ежу (яйкі, рыбу, мяса курыцы, індычку).

2. Падтрымлівайце ўзровень цукру ў крыві ў норме. Вельмі цяжка пахудзець, калі ўзровень цукру ўвесь час павышаны.

3. Штодня ешце тэрмагенныя прадукты — чырвоны струковы перац, імбір, кмен, карыцу, цытрусавыя (асабліва лімон).

4. Паляпшайце страваванне — старанна перажоўвайце ежу і не ешце ў спешцы.

5. Піце зялёны чай — у ім утрымліваецца вялікая колькасць антыаксідантаў і іншых карысных рэчываў, якія паскараюць метабалізм.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

на право заключения договоров аренды земельных участков на территории Барановичского района Брестской области

Сведения о предмете аукциона на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства Лот №, кадастровый номер, адрес земельного участка, размер, срок аренды и его назначение	Условия развития инфраструктуры застраиваемой территории, характеристика расположенных на земельном участке инженерных сооружений	Условия предоставления земельного участка	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.) в % от начальной цены продажи
ЛОТ № 1 120483502601000489 Леснянский сельсовет, д. Лесная, ул. 17 Сентября/ площадь 0,1996 га/ срок аренды 99 лет/ для строительства магазина товаров повседневного спроса	участок сформирован на луговых естественных землях, свободен от строений и сооружений; проезд к земельному участку предусмотрен по существующей уличной сети с асфальтированным покрытием. На земельном участке имеются ограничения в охранной зоне газопровода высокого давления на площади 0,0175 га	внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка, возмещение победителем аукциона: расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; возмещение потерь сельскохозяйственного производства (452 100 бел. руб.); заключение победителем аукциона с Барановичским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения о предоставлении ему земельного участка государственную регистрацию права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок не превышающий двух лет, и осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией	994595	99460 (10 %)
ЛОТ № 2 120400000001000566 22 км (лево) автомобильной дороги Р-99 Барановичи – Пограничный – Гродно/ площадь 0,2478 га/ срок аренды 99 лет/ под строительство объекта придорожного сервиса (пункт питания)	участок свободен от строений и сооружений; в состав земельного участка входят земли под дорогами и покрытые лесом на площади 0,04 га; проезд к земельному участку предусмотрен по существующей дорожной сети с асфальтированным покрытием; на земельном участке имеются ограничения в водоохранной зоне р. Лохозва на площади 0,2478 га	обеспечение максимальной сохранности деревьев и ухода за ними; внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка, возмещение победителем аукциона: расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; заключение победителем аукциона с Барановичским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения о предоставлении ему земельного участка государственную регистрацию права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет, и осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией	583710	58371 (10 %)
ЛОТ № 3 120400000001000614 0.1 км северо-восточнее производственной базы УП ЧПТ «Альфа» М.Сапега/ площадь 0,7001 га/ срок аренды 99 лет/ для строительства производственного объекта	участок сформирован на неиспользуемых землях, свободен от строений и сооружений, проезд к земельному участку предусмотрен по существующей дорожной сети с асфальтированным покрытием	внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка, возмещение победителем аукциона: расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; заключение победителем аукциона с Барановичским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения о предоставлении ему земельного участка государственную регистрацию права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет, и осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией	16133328	1613333 (10 %)
ЛОТ № 4 120400000001000613 0.2 км северо-восточнее производственной базы УП ЧПТ «Альфа» М.Сапега/ площадь 0,1500 га/ срок аренды 99 лет/ для строительства административно-складского здания	участок сформирован на неиспользуемых землях свободен от строений и сооружений, проезд к земельному участку предусмотрен по существующей дорожной сети с асфальтированным покрытием	внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка, возмещение победителем аукциона: расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; заключение победителем аукциона с Барановичским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения о предоставлении ему земельного участка государственную регистрацию права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок не превышающий двух лет, и осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией	3424633	342463 (10 %)
ЛОТ № 5 120482600001000076 Колпеницкий сельсовет южнее д. Антоново/ площадь 4,8585 га/ срок аренды 99 лет/ для строительства гипермаркета по продаже стройматериалов	участок сформирован на луговых улучшенных землях, свободен от строений и сооружений; проезд к земельному участку предусмотрен по существующей дорожной сети с асфальтированным покрытием. На земельном участке имеются ограничения в охранной зоне магистрального газопровода на площади 3,8535 га	внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка, возмещение победителем аукциона: расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; возмещение убытков причиняемых изъятием земельного участка СПК «Бересни» (12877489 бел. руб.); возмещение потерь сельскохозяйственного производства (209797269 бел. руб); осуществить вынос газопровода за пределы сформированного земельного участка за счет собственных средств с соблюдением расстояния охранной зоны газопровода высокого давления 1 категории, которая составляет 10 м, в каждую сторону от оси газопровода и вынос газораспределительных сетей Барановичского межрайгаза, подключенных к данному газопроводу, а также других требований технических нормативных актов, действующих в Республике Беларусь; заключение победителем аукциона с Барановичским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения о предоставлении ему земельного участка государственную регистрацию права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; снять на земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно строительному проекту; осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией	377241908	18862095 (5 %)
ЛОТ № 6 120481503601000338 Жемчужненский сельсовет, пос. Жемчужный/ площадь 0,0022 га/ срок аренды 10 лет/ для установки торгового павильона мелкорозничной торговли	участок сформирован на неиспользуемых землях, свободен от строений и сооружений, проезд к земельному участку предусмотрен по существующей уличной сети с асфальтированным покрытием	внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка, возмещение победителем аукциона: расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; заключение победителем аукциона с Барановичским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственную регистрацию права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет, и осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; выполнить благоустройство согласно архитектурному проекту	5 160	516 (10 %)

Условия подключения объектов строительства на земельных участках к сетям электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения будут оговариваться в каждом конкретном случае организациями, обслуживающими сети.

Примечание: 1. Аукцион состоится 30 ноября 2010 года в 14.30 по адресу: г. Барановичи, ул. Советская, 79, здание Дома Советов, малый зал, 3-й этаж.

2. Для участия в аукционе необходимо подать:

а) заявление об участии в аукционе;

б) заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение на расчетный счет РАЙФО 3602211000017 в филиале 802 АСБ «Беларусбанк», код банка 245, УНН 200046874, назначение платежа 04002 суммы задатка за объект;

в) гражданину – копию документа, содержащего его идентификационные сведения (паспорт) без нотариального засвидетельствования;

индивидуальными предпринимателями – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

3. Аукцион проводится при наличии двух и более участников.

4. Цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона от 5 до 15 %.

5. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

6. В течение 10 рабочих дней после проведения аукциона облисполком (райисполком) принимает решение о предоставлении победителю аукциона земельного участка.

7. **Победитель аукциона обязан**:

- подписать протокол о результатах аукционных торгов;

- произвести окончательную оплату за право заключения договора аренды земельного участка по результатам аукциона; возместить затраты на организациею и проведение аукциона, расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, а также другие расходы, связанные с проведением аукциона и выполнить условия, предусмотренные решением об изъятии земельного участка для проведения аукциона в белорусских рублях в течение 10 рабочих дней после принятия решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка. Сумма задатка засчитывается при оплате стоимости предмета аукциона;

- в течение 2-х рабочих дней после внесения платы за предмет аукциона, возмещение расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения, выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка, заключить с Барановичским райисполкомом договор аренды земельного участка;

- осуществить государственную регистрацию права на земельный участок не позже, чем в двухмесячный срок после принятия решения о предоставлении ему земельного участка;

- получить в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет, и осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

- выполнить благоустройство согласно архитектурному проекту;

- по истечении срока аренды земельного участка совместно с райисполкомом в установленном порядке решить вопрос о дальнейшем его использовании.

8. Задаток возвращается участникам аукциона, не выигравшим торги, по их письменному заявлению.

9. Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договора аренды земельных участков», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков».

Ознакомиться с планами земельных участков и подать заявки на участие в аукционе можно по адресу: г. Барановичи, ул. Советская, 79, каб. 624 с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Начало приема заявлений об участии в аукционе – **29 октября 2010 г. с 8.00,** окончание – **24 ноября 2010 г. в 17.00.** Контактные телефоны: **42 33 12, 42 33 98.**

МІКРАХВАЛЕВАЯ ПЕЧ: ШТО Ў ЁЙ ШКОДНАГА?

На чутках і кампетэнтна

ТОЙ, хто добра ведае фізіку, не хвалюецца адносна бяспекі мікрахвалевых печаў. У іншых жа перыядычна ўзнікаюць пытанні: наколькі бяспечнае гэтае выпраменьванне, як часта трэба мяняць самі печы і г.д.? Тым больш, што інтэрнэт пастаянна шукае нагоду для нараджэння нездаровых чутак.

Паводле слоў **вядучага інжынера лабараторыі фізічных фактараў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Мікалая БАБЕЛЯ**, для таго, каб мікрахвалевыя печы адпавядалі патрабаванням біялагічнай бяспекі, у акрэдытаваных лабараторыях праводзіцца адпаведная экспертыза. У першую чаргу ацэньваецца шчыльнасць энергетычнай плыні, створанай генератарам мікрахвалевай печы. Дапушчальны ўзровень не павінен перавышаць 10 мкВт/см2. Гэтыя звесткі размяшчаюцца ў пасведчанні аб санітарна-гігіенічнай рэгістрацыі або пасведчанні аб дзяржаўнай санітарна-гігіенічнай экспертызе — дакументах, якія акцэнтуюць увагу на тым, ці адпавядае печка ўстаноўленым у рэспубліцы гігіенічным нарматывам.

— Мабільны тэлефон мы сапраўды вымушаны трымаць непасрэдна ля галавы, — кажа Мікалай Бабель. — Для мікрахвалевых жа печаў норма разлічваецца з адлегласці 0,5 м. Гэта значыць, у разлік бярэцца тое, што ў момант работы нашай тэхнікі мы знаходзімся не бліжэй як на паўметра ад яе. Зразумела, што чым большая адлегласць, тым больш бяспечным для чалавека будзе ўзровень выпраменьвання. Існуе яшчэ абарона часам: чым менш вы знаходзіцеся ля печы, тым лепш. Той, хто надта асцерагаецца за сваё здароўе, можа проста пакінуць пакой на той час, пакуль печ працуе.

Калі тэрмін эксплуатацыі заканчваецца, гэта не значыць, што выпраменьванне абавязкова будзе павялічвацца і трэба тэрмінова набываць новую тэхніку. Па-першае, з-за таго, што рэсурс генератара выпрацаваўся, можа назірацца адваротная сітуацыя: зніжэнне ўзроўню выпраменьвання. Па-другое, адзінае, за чым можна сачыць, — каб дзверцы «не разношваліся» і заўсёды шчыльна зачыняліся.

Што да бяспекі прадуктаў харчавання, прыгатаваных ці падагрэтых у печы, то з пункту гледжання ўсё той жа фізікі ніякай небяспекі яны ўяўляць не павінны. Пры абпраменьванні награванне адбываецца дзякуючы наяўнасці ў прадуктах вадкасці, а дакладней, інтэнсіўнаму руху малекул вады. Іншая справа, якім посудам мы карыстаемся. Адназначна не рэкамендуюцца пластык ці метал. Першы можа «падзяліцца» з прадуктам пэўнымі шкоднымі рэчывамі, а другі — вывесці печ са строю.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Інфарм-укол

ВІРУСЫ НЕ ПРОЙДУЦЬ!

Самае частае захворванне ў дзяцей — вострае рэспіраторнае. Многія бацькі думаюць, што іх дзіця часта хварэе таму, што ў яго ёсць імунадэфіцытны стан. Аднак насамрэч для частых інфекцый у дзяцей ёсць шэраг іншых прычын.

Грудное дзіця хутка страчвае атрыманыя ад маці антыцелы, застаецца безабаронным супраць сотняў узбуджальнікаў рэспіраторных інфекцый. Адзіная магчымая абарона ад іх — набыццё спецыфічнага імунітэту да кожнага віруса або бактэрыі. Пакуль у дзіцяці няма імунітэту да рэспіраторных інфекцый, ён пры кантакце з вірусамі звычайна хварэе. Набыць жа гэты імунітэт можна толькі з дапамогай вакцынацыі або ў выніку хваробы.

— Да цяперашняга часу няма вакцын да вірусаў-узбуджальнікаў ВРВІ, — кажа **загадчык педыятрычнага аддзялення 23-й дзіцячай гарадской паліклінікі г. Мінска Таццяна КАЗАК**. — Адзінае выключэнне — вакцына супраць грыпу. Акрамя таго, імунітэт да рэспіраторных інфекцый з'яўляецца кароткачасовым, непрацяглым, у адрозненне ад пажыццёвага імунітэту да адру ці краснухі. Пры паўторным кантакце з адным і тым жа вірусам — вірусам грыпу, адэнавірусам ці іншым — праз некалькі гадоў дзіця можа зноў захварэць.

Да паступлення ў школу колькасць перанесеных вострых рэспіраторных захворванняў у дзіцяці блізкае да пяцідзесяці, і ў асноўным гэта — няцяжкія інфекцыі. Дзеці, якія наведваюць дзіцячыя садкі, першыя год-два хварэюць асабліва часта, што цалкам зразумела, — там у іх шмат кантактаў з крыніцамі інфекцыі. «Хатнія» дзеці за першыя 7 гадоў жыцця хварэюць радзей, але затое ў першых класах школы яны хварэюць часцей. Вышэй захваральнасць на ВРЗ у гарадах, ніжэй — у сельскай мясцовасці, дзе менш кантактаў з інфекцыйнымі хворымі.

Для прафілактыкі рэспіраторных захворванняў у дзяцей выкарыстоўваюць бактэрыяльныя вакцыны — прэпараты, прыгатаваныя з нежыццяздольных мікробаў. У Беларусі і за мяжой добра вядомы прэпарат рыбамуніл. Ён спалучае ў сабе вартасці вакцыны супраць найбольш распаўсюджаных інфекцый дыхальных шляхоў і мяккага імунамадулятару, пры гэтым не мае ўзроставых абмежаванняў. Асноўнымі паказаннямі да прызначэння рыбамунілу з'яўляюцца хранічныя і рэцыдывуючыя захворванні вуха — атыты, горла — фарынгіты, ларынгіты, носа — рыніты, сінусіты, дыхальных шляхоў — трахеіты, бранхіты. Рыбамуніл не проціпаказаны дзецям, якія пакутуюць ад алергічных захворванняў (бранхіяльнай астмы, атапічнага дэрматыту, алергічнага рыніту). Пачынаць выкарыстоўваць прэпарат можна як у стадыі заціхання рэспіраторнага захворвання, так і ў яго вострай стадыі, у тым ліку з антыбіётыкамі, калі яны патрэбныя.

Для прафілактыкі і лячэння інфекцый дыхальных шляхоў распрацаваны прэпарат IPC 19, які складаецца з фрагментаў нежыццяздольных бактэрый, што выклікаюць хваробы органаў дыхання. Перад прымяненнем IPC 19 не патрабуецца дадатковых даследаванняў, а сам прэпарат вылучаецца высокай бяспекай. Важна, што IPC 19 дзейнічае на ўзроўні ўваходных варот інфекцыі. Проціпаказанні да ўжывання гэтага прэпарата практычна адсутнічаюць. Да яго асаблівасцяў адносіцца магчымасць выкарыстання ў дзяцей груднога ўзросту — з 3 месяцаў, а таксама адсутнасць выражаных пабочных эфектаў. IPC 19 можа прымяняцца з прафілактычнай і лячэбнай мэтамі і ў дзяцей, і ў дарослых. З прафілактычнай мэтай IPC 19 звычайна прымяняюць на працягу двух тыдняў, пасля папярэдняй кансультацыі педыятра.

Вітаміны таксама з'яўляюцца памочнікамі ва ўмацаванні абарончых сіл арганізма, дапамагаюць процістаяць інфекцыям. Да ліку добрых вітамінных комплексаў можна аднесці «Мульці-табс», «Джунглі», «Пікавіт», «Кіндар біявіталь гель» (гэты прэпарат педыятры зараз часцей рэкамендуюць малым; дазіроўка для дашкольнікаў — па 0,5 ч.л. 2 разы ў дзень, для школьнікаў — па 1 ч.л. 2 разы ў дзень). Адначасова з вітамінамі можна прымаць прэпараты для павышэння неспецыфічнай супраціўляльнасці арганізма на аснове эхінацыі. Самы вядомы з іх імунал.

Важна аздаравіць паветранае асяроддзе ў доме — часта праветрываць пакоі, спаць з адчыненым акном. Сярод агульнаўмацавальных мер найбольш эфектыўна загартоўванне, якое дазваляе, калі не поўнасцю пазбегнуць прастуд, то знізіць верагоднасць захворвання. Добра загартоўвае хахалоджванне падэшваў ног, скуры шыі, паясніцы.

Каб не захварэць падчас эпідэміі вірусных захворванняў, акрамя вітамінаў і адаптагенаў, добра прымаць гамеапатычныя лекавыя сродкі грыпхель, антыгрыпін, інфлюцыд. Вакцынацыю супраць грыпознай вакцынай трэба рабіць да пачатку эпідэміі грыпу. У разгар эпідэміі або ў момант захворвання ўжо не мае сэнсу.

Святлана БАРЫСЕНКА.

МОЦНЫ СТРЭС — МОЦНЫЯ ЛЮДЗІ

Карысна ведаць

Амерыканскія спецыялісты прывялі навуковыя доказы праўдзівасці афарызма: «Што нас не забівае, тое робіць нас мацнейшымі».

Шматгадовае маштабнае даследаванне наступстваў неспрыяльных падзей для псіхічнага здароўя жыхароў ЗША паказала, што непрыемнасці садзейнічаюць наступнай адаптацыі і ўстойлівасці псіхікі, паведамляе «Компьюлента».

Вучоныя апыталі больш за 2 тысячы чалавек. Напрыканцы даследавання высветлілася, што людзі, якія перажылі буйныя непрыемнасці, валодаюць лепшым псіхічным здароўем у параўнанні з тымі, у каго нягод было мала або не было зусім. З аднаго боку, у выніку бедаў у рэспандэнтаў рэгістраваліся функцыянальныя парушэнні, сімптомы посттраўматычнага стрэсу і зніжэнне задаволенасці жыццём. Але ў далейшым, калі тых жа людзей закраналі праблемы меншага маштабу, яны рэагавалі на іх больш спакойна ў параўнанні з тымі, хто «жыцця не нюхаў».

Аўтары даследавання мяркуюць, што ва ўмераных дозах непрыемнасці могуць садзейнічаць фарміраванню нейкіх ахоўных механізмаў.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

РАДАР

ВЫПУСК № 10 (14)

Спецпраект газеты «Звязда» і Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі МУС Рэспублікі Беларусь

„У ПАРАЎНАННІ З МІНУЛЫМ ГОДАМ КОЛЬКАСЦЬ ДТЗ З УДЗЕЛАМ ПЕШАХОДАЎ, ДЗЕ ЗАГІНУЛІ І ПАЦЯРПЕЛІ ЛЮДЗІ, ПАМЕНШЫЛАСЯ. АЛЕ ГЭТА НЕ НАГОДА ДЛЯ ТАГО, КАБ СЯДЗЕЦЬ СКЛАЎШЫ РУКІ, БО ЛЮДЗІ ЎСЁ РОЎНА ПРАЦЯГВАЮЦЬ ТРАПЛЯЦЬ ПАД КОЛЫ ТРАНСПАРТНЫХ СРОДКАЎ"

„НЕКАТОРЫЯ ЖАНЧЫНЫ, ЯКІЯ НЕ АДЗІН ГОД ЗА РУЛЁМ, ЗГАДЗІЦЕСЯ, ЛЮБОМУ МУЖЧЫНУ ФОРУ ДАДУЦЬ. ГЭТЫ ПАДЗЕЛ ПРЫДУМАЛІ МУЖЧЫНЫ, КАБ ЯШЧЭ РАЗ ПАДКРЭСЛІЦЬ СВАЮ ПЕРАВАГУ НАД ЖАНЧЫНАМІ."

Восень — традыцыйна «гарачая» пара для супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі. Дні становяцца карацейшымі, цёмны час сутак значна павялічваецца. А з улікам туманаў і дажджоў умовы нават для вопытных і паслухмяных вадзіцеляў становяцца цяжкімі. У гэты час асабліва ўважлівымі на дарозе павінны быць пешаходы. У абавязковым парадку, для сваёй бяспекі, яны павінны абазначаць сябе флікерамі...

Прама паедзеш — да дому даедзеш

Фота Аўгена ПРАСЕЦКАГА.

Бясспрэчна, што ў супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі, якія нясуць службу на пэўным аб'екце, заўсёды хапае работы. Кантроль хуткаснага рэжыму сярод удзельнікаў дарожнага руху, спыненне няспраўнага транспарту, прафілактычныя гутаркі з вадзіцелямі, якія ўпершыню зрабілі незначнае парушэнне ПДР і прымяненне штрафных санкцый да заўзятых парушальнікаў, для якіх праезд на чырвонае святло, перасячэнне скразной разметкі ці язда без вадзіцельскага пасведчання — абыдзенная справа.

Праўда, здараюцца выпадкі, калі міліцыянеры ДПС выступаюць у ролі інспектараў і дарадцаў адначасова. Пацвярджэнне таму — фотаздымак, зроблены на Гродзеншыне, на Лідскім участку дарогі М-6, дзе надвячоркам на скрыжаванні дарог неслі службу старшы лейтэнант Юрый Даўляшэвіч (на фота справа) і яго калега старшы лейтэнант Валерый Гучык. Да афіцэраў з просьбай удакладніць свой маршрут да Мінска звярнуўся вадзіцель, які ехаў з глыбінкі. Выконваючы свой прафесійны і грамадзянскі абавязак, вартавыя дарог праверылі наяўнасць неабходных дакументаў і паказалі напрамак, пажадаўшы вадзіцелю шчаслівай дарогі.

Як адзначылі супрацоўнікі аддзела ДАІ Лідскага РАУС, якія маюць багаты вопыт работы ў справе навучання і падтрымкі парадку на дарогах, штодня ім даводзіцца мець справу з самымі рознымі сітуацыямі. Іх задача — зрабіць так, каб кожны ўдзельнік дарожнага руху адчуваў сябе на дарозе камфортна, без перашкод і прыгод, жывым-здаровым мог дабрацца да канечнага пункта свайго маршрута.

А ў нас...

У Магілёве на Дзень маці прайшоў конкурс «Аб правілах дарожнага руху са смакам». Як расказала інспектар па агітацыі і прапагандзе УДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Вольга Вяршубская, конкурс прайшоў сумесна з дзіцячым садком № 13.

Дзеткі разам з бацькамі спаборнічалі ў ...кулінарнай выпечцы. Кулінарныя работы былі прысвечаныя дарожна-транспартнай тэматыцы і мелі выгляд святлафора і дарожных знакаў. Дадаткова, каб абараніць сваю работу, трэба было прыдумаць вершаваны твор на дарожную тэматыку.

23 кастрычніка ў Магілёўскім гарадскім Доме культуры пройдзе акцыя «ПДР — закон для ўсіх». А 25 кастрычніка сумесна з ГА БРСМ у Магілёве пройдзе акцыя па правілах бяспекі, прысвечаная Дню аўтамабіліста

Алег КОСАЎ, намеснік начальніка УДАІ Віцебскага аблвыканкама:

«Бяспека на нашых дарогах — пытанне найважнейшае»

Пытанні аварыйнасці на дарогах самага паўночнага рэгіёна Беларусі, праблемы аўтамабільных затораў у абласным цэнтры, якіх яшчэ пару гадоў таму не было, метады ўкаранення сучасных тэхналогій для навядзення парадку на дарогах... Пра гэта і не толькі наша размова з намеснікам начальніка ўпраўлення ДАІ Віцебскага аблвыканкама Алегам КОСАВЫМ.

Дарэчы, Віцебск, як высветлілася, у параўнанні з іншымі абласнымі цэнтрамі — самы бяспечны горад: на дарогах горада гіне менш людзей, чым у іншых беларускіх «мегаполісах».

Фота Сяргея САВЕЛЬЕВА.

— У цэлым па вобласці адносна сітуацыі на дарогах вынікі станоўчыя літаральна па ўсіх паказчыках, — гаворыць Алег Юр'евіч. — Ідзе паніжэнне па колькасці ДТЗ, колькасці загінулых, раненых, аварый, учыненых у нецвярозым стане. Калі канкрэтна прааналізаваць колькасць дарожна-транспартных здарэнняў, напрыклад, за 9 месяцаў гэтага года, і параўнаць статыстыку з аналагічным перыядам мінулага года, можна адзначыць — што колькасць загінулых паменшылася на 39 чалавек: ахвярамі ДТЗ сталі 95 грамадзян (мінус 29 працэнтаў). Раненні атрымалі больш за 540 чалавек, што таксама менш.

На жаль, пяцёра дзяцей загінулі. А сярод іх — не толькі пешаходы, — не без суму зазначае афіцэр міліцыі. — Дзяржаўтаінспекцыя праводзіць актыўную прафілактычную работу з дзецьмі. Але ж падчас не ўсё ад іх залежыць: гінуць дзеці ў салонах аўто, калі едуць з бацькамі, сваякамі, якія чамусьці не клапоцяцца пра тое, што трэба, каб рэмень бяспекі быў на дзіцяці, спецыяльнае крэсла ў аўтамашыне.

Безумоўна, смерць кожнага чалавека — трагедыя. Але ж аптымізм выклікае тое, што колькасць дарожна-транспартных здарэнняў са смяротным зыходам змяншаецца, — гаворыць намеснік начальніка УДАІ Віцебскага аблвыканкама Алег Косаў. — Па-ранейшаму застаецца актуальнай праблема, калі вадзіцелі скрываюцца з месца здарэння. На сёння зафіксавана больш за 50 такіх выпадкаў. Па віне такіх вадзіцеляў 16 чалавек загінулі, 42 былі траўмаваныя.

— Алег Юр'евіч, пытанне банальнае... Хто часцей вінаваты ў ДТЗ: пешаходы ці кіроўцы?

— Як ні сумна, але тыя, хто не знаходзіцца за рулём. Гэта калі лічыць аварыі з удзелам пешаходаў. З агульнай колькасці ДТЗ з удзелам пешаходаў — 55 працэнтаў па іх віне. Праўда, ад агульнай колькасці здарэнняў, якія адбываюцца на нашых дарогах, вадзіцелі больш учыняюць парушэнняў. Якой бы статыстыка ні была, Дзяржаўтаінспекцыя актыўна працуе па папярэджанні наездаў на пешаходаў.

— На жаль, нормай стала, калі пешахода на «зебры» вадзіцелі не прапускаюць.

— Чым ставіць пад сумненне не толькі сваю прафесійную прыгоднасць, але і жыцці людзей, што не знаходзяцца за баранкай машыны. Для прадухілення такіх выпадкаў і прыцягнення да адказнасці вадзіцеляў-парушальнікаў мы стваралі рэйдавыя групы. Як на грамадзянскіх аўто, так і з выкарыстаннем відэафіксацыі. Апошнія матэрыялы сведчаць: у сярэднім кожныя 10 хвілін той ці іншы вадзіцель не лічыць сваім прамым абавязкам спыніцца перад «зебрай», каб прапусціць пешахода. Зразумела, што ўсе парушальнікі прыцягнутыя да адказнасці.

Як ні сумна канстатаваць, але хапае правапарушэнняў і з боку пешаходаў. Таму сярод іх таксама праводзіцца вялікая прафілактычная работа. Супрацоўнікі ДАІ пільна адсочваюць сітуацыю на дарогах, каб не дапусціць бяды.

— Віцебшчына стала авангардная у сэнсе прафілактыкі аварыйнасці з удзелам гужавога транспарту.

— Гужавы транспарт — гэта таксама рэаліі нашага жыцця. Таму для таго, каб паўнацэнна кантраляваць сітуацыю сярод кіроўцаў конных павозак, рэгулярна праводзіцца тэхнічны агляд гужавога транспарту. Надаецца шмат увагі адпаведнасці яго спецыяльным патрабаванням. Павозкі абавязкова павінны быць аснашчаныя святлоадбівальнымі элементамі.

— Відавочна, што праблемным пытаннем для ДАІ з'яўляюцца вадзіцелі, якія выязджаюць у дарогу «пад градусам»...

— На жаль, гэта так. Але ж інспектары ДПС, кіраўніцтва Дзяржаўтаінспекцыі накіроўваюць усе сілы, каб зменшыць ці звесці да мінімуму колькасць такіх гора-вадзіцеляў. Вялікую падтрымку ў выяўленні такіх нядобрасумленных кіроўцаў аказвае нам насельніцтва. Калі людзі бачаць, што вадзіцель у нецвярозым стане збіраецца сесці за руль ці ўжо кіруе машынай, адразу тэлефануюць у ДАІ. І мы вельмі хутка рэагуем. Пры гэтым стараемся заахвочваць памочнікаў ДАІ з народа. За кожным нецвярозым кіроўцам можа стаяць жыццё чалавека... Невядома, што можа адбыцца, калі нецвярозы за рулём. Сёлета супрацоўнікі ДАІ затрымалі больш за 4, 5 тысячы нецвярозых кіроўцаў.

— «Маршруткі» — вельмі папулярныя, але паралельна яны — небяспечны від транспарту?

— Зараз парушэнняў у вадзіцеляў «маршрутак» менш, чым раней. Апошні выпадак — вадзіцель кіраваў машынай з пратэрмінаваным пасведчаннем кіроўцы. Ён быў прыцягнуты да адказнасці. Застаецца адкрытым пытанне: ці не хвалявала прадпрымальніка, на якога працаваў гэты вадзіцель, ці ўсё было ў парадку з дакументамі ў яго падначаленага? Абавязак адказных асобаў, якія займаюцца арганізацыяй перавозак пасажыраў — кантраляваць пытанне: хто і як возіць на маршруце пасажыраў?

— Бадай, у кожным дварыВіцебска ў жыхароў дамоў узнікаюць канфлікты з-за няправільнай паркоўкі аўтамабіляў. Прайсці міма па тратуары часта немагчыма, з-за чаго прыходзіцца выходзіць на дарогу.

— Так, падчас прыёму грамадзян, правядзення «прамых ліній» з насельніцтвам, людзі часта скардзяцца па гэтай праблеме. Са свайго боку мы ўзмоцнена працуем ва ўказаным накірунку. Зараз пры кожнай адміністрацыі раёнаў вобласці ёсць эвакуатары — у Віцебску іх ажно чатыры. Але яны пакуль што не ў поўнай меры дазваляюць стабілізаваць абстаноўку. Таму хочацца звярнуцца да ўладальнікаў аўто: трэба задумацца ці правільна вы прыпаркавалі машыну?

Асабіста ўпэўніваўся ў тым, што можна было прыпаркаваць на месцы два аўтамабілі, а стаіць адзін з-за нядбалага вадзіцеля.

— Заторы ў правінцыйным горадзе, няхай і ў абласным цэнтры — параўнальна новая з'ява, з якой трэба змагацца. Якім чынам сітуацыя выпраўляецца?

— Па рэгістрацыі транспарту па вобласці прырост аўто склаў 11 тысяч за першае паўгоддзе. У Віцебску колькасць машын павялічылася на 4,8 тысячы адзінак. Але ж, каб не згушчаць фарбаў, зазначу, што сітуацыя на дарогах Віцебшчыны пад кантролем. На скрыжаваннях дарог аптымальна рэгулююцца рэжымы работы святлафораў. Інспектары ў гадзіны «пік» удзельнічаюць у рэгуляванні руху. Камеры назірання ў перспектыве дазволяць у ручным рэжыме змагацца з заторамі — мяняць рэжымы работы святлафораў і гэтак далей.

Пытальнік

У ЯКОЙ АЎТАШКОЛЕ ВУЧЫЦЦА?

Курсанты дзевятнаццаці дзяржаўных і камерцыйных арганізацый здаюць у Гродне ў Дзяржаўтаінспекцыі тэарэтычныя і практычныя іспыты. Якія ж вынікі былі паказаныя сёлета ў першым паўгоддзі? І дзе, зыходзячы з гэтага рэйтынгу, лепш вучаць азам вадзіцельскага майстэрства?

***І. ФЁДАРАЎ**, г. Гродна*

Больш за ўсё будучых вадзіцеляў катэгорыі В за гэты перыяд навучалася ў Гродзенскім аўтавучэбным камбінаце. З прадстаўленых для здачы экзаменаў 646 курсантаў з першай спробы іспыты па правілах дарожнага ў ДАІ не здалі 104, а па ваджэнні — 226, увогуле 51,1 працэнта. Падобныя працэнтныя суадносіны ў аўташколах «Мавіп-Аўта», «Аўталюкс», «Мартонс», трохі вышэйшая лічба няўдачнікаў — у Гродзенскай аўташколе ДТСААФ, аўташколе «Люкс»... А сумнае лідарства па нездавальняючай здачы экзаменаў з першага разу належыць Скідальскаму СПТВ — 199, Гродзенскаму каледжу імя І. Шчаснага і МВВК-2 Каст-рычніцкага раёна г. Гродна — адпаведна 79,6, 88,7 і 91,7 працэнта. У той час як у абласной школе Беларускага таварыства аўтамотааматараў, дзе прадставілі да здачы экзаменаў 245 кандыдатаў у вадзіцелі, гэты паказчык складае 36,3 працэнта — лепшы вынік сярод усіх.

Дарэчы, на сайце Гродзенскай Дзяржаўтаінспекцыі (www.gaigrodno.by) можна выказаць свае думкі, падзяліцца ўражаннямі пра аўташколы. Калі гэтыя водгукі сапраўды шчырыя і да іх не маюць дачыненне людзі, якія працуюць у гэтых структурах, дык толькі радавацца трэба: на 6 крытычных ажно 36 станоўчых адзнак! Хаця, мяркуючы па вышэйзгаданых лічбах здачы экзаменаў, якасць падрыхтоўкі вадзіцеляў жадае значна лепшага.

А ў нас...

На вуліцах Гомеля з'явілася новая рэклама на тралейбусе, якая заклікае выконваць правілы дарожнага руху. Гэта мульцыяшныя персанажы, выкарыстаныя ў аздабленні папулярнага транспартнага сродку.

— Сацыяльная рэклама з'явілася не проста так, — гаворыць інспектар ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама Вольга Развязкова. — Наезды на пешаходаў у Гомелі застаюцца самымі распаўсюджанымі відамі ДТЗ. Толькі за 9 месяцаў гэтага года ў горадзе адбылося 150 здарэнняў, з якіх 82 ДТЗ — гэта наезды на пешаходаў.

❑

З 20 па 30 кастрычніка па ўсёй краіне праходзіць акцыя «Вучэбны аўтамабіль». Паводле слоў начальніка аддзела агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама Алесі Сяргейчык, акцыя праводзіцца сумесна з «Белтэхаглядам».

— За мінулы год у Беларусі было падрыхтавана больш за 170 тысяч кіроўцаў, пры гэтым для іх навучання выкарыстоўвалася 4,5 тысячы аўтамабіляў. Вельмі важна сачыць за тым, як праходзіць навучанне кіраванню аўтамабілем, бо не сакрэт што ДТЗ з маладымі вадзіцелямі — гэта 5 працэнтаў ДТЗ ад агульнай колькасці здарэнняў. Таму ў вызначаны перыяд мы праводзім рэйды, каб прасачыць, наколькі добра падрыхтаваныя інструктары і як выконваюцца патрабаванні па навучанні вадзіцеляў.

❑

У брэсцкай СШ № 14 днямі прайшла маштабная акцыя «На дарозе дзеці, усе за іх у адказе». Мэта акцыі — прафілактыка дарожна-транспартнага траўматызму.

— У межах акцыі адбыліся конкурс дзіцячага малюнка і тэатральныя пастаноўкі на дарожную тэматыку, — расказаў «Звяздзе» старшы інспектар аддзялення агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Брэсцкага аблвыканкама Сяргей Юрашэвіч. — Таксама перад дзецьмі выступілі інспектары, якія расказалі аб прычынах ДТЗ на дарогах, правялі лікбез па веданні сігналаў рэгуліроўшчыка.

❑

У Ленінскім раёне горада Мінска прайшоў рэйд у межах акцыі «Маршрутка». Пра гэта «Звяздзе» паведаміла старшы інспектар агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Ленінскага раёна сталіцы Таццяна Красій. Інспектары дарожнага руху ў грамадзянскім адзенні садзіліся ў маршрутныя таксі і праязджалі пад выглядам звычайных пасажыраў увесь маршрут. На канечным прыпынку маршрутнае таксі чакаў інспектар ДАІ ў форме, які фіксаваў усе парушэнні, заўважаныя пераапранутымі інспектарамі. Гора-кіроўцы прыцягваліся да адказнасці.

Вольга СУВОРАВА, старшы інспектар па адміністрацыйнай практыцы ДАІ Савецкага РУУС г. Мінска:

Жаночы погляд

«СТАРАЮСЯ ВУЧЫЦЦА НА ЧУЖЫХ ПАМЫЛКАХ!»

Гераіня сённяшняга выпуску ў міліцыі працуе ўжо шэсць гадоў. За гэты час паспела і пастаяць на дарозе з жазлом, і правесці не адзін дзясятак прафілактычных мерапрыемстваў для маленькіх і дарослых удзельнікаў дарожнага руху, і нават на працягу трох гадоў высвятляла матывы злачынстваў у аддзеле дазнання Савецкага РУУС г. Мінска.

Фота Надзеі ДРЫЛЫ.

— Я лічу, што ў кожнай міліцэйскай структуры павінны працаваць у тым ліку і жанчыны. Калі працавала ў дазнанні, то пераканалася, што вывесці на шчырую размову жанчыну, якая здзейсніла злачынства, іншай жанчыне значна прасцей. У ДАІ таксама без нас нікуды. У прыватнасці, папяровая праца, якой тут дастаткова шмат, у жанчыны, не сакрэт, атрымліваецца больш акуратна, больш скрупулёзна.

— А як парушальнікі рэагуюць на інспектара на абцасах? Пэўна ж спрабавалі камплімент ами растапіць халоднае сэрца, каб пазбегнуць адказнасці?

— Вопыт працы на дарозе ў мяне не вялікі, але ўсё ж такі ёсць. Даводзілася падчас акцыі «Пешаход» спыняць парушальнікаў — як пешаходаў, так і кіроўцаў — на нерэгулюемым пешаходным пераходзе. Усе рэагавалі па-рознаму. Адны плакаліся, што больш так не будуць; іншыя, у асноўным мужчыны, усміхаліся і спрабавалі «падкупіць» камплімент амі. Я ж старалася строга, але ветліва даць зразумець, што я на дарозе ў першую чаргу не жанчына, а супрацоўнік ДАІ. І вымушаная дзейнічаць у адпаведнасці са службовымі абавязкамі. Тлумачыла, што на суму штрафу зусім не ўплывае, усмяхнешся ты інспектару-жанчыне ці не. Мы, жанчыны, і ў калектыве, які пераважна складаецца з мужчын, не чакаем паблажак. На роўных начуем у Новы год пад елкай, выязджаем на выклікі. Ведалі ж, куды ішлі.

— Вольга, я ведаю, вы ўжо не першы год кіруеце аўтамабілем. Можаце назваць сябе ўзорам для кіроўцаў?

— Тэорыі кіравання машынай нас вучылі яшчэ ў Акадэміі МУС. Але пасведчанне кіроўцы я атрымала толькі ў 2006 годзе, праз два гады пасля яе заканчэння. Спачатку было складана яшчэ і таму, што пачала кіраваць машынай зімой. А гэта і першы снег, і галалёдзіца. Безумоўна, ездзіла, можна сказаць, як чарапаха. Неаднаразова спінай лавіла на сабе нецярплівыя погляды іншых кіроўцаў: маўляў, давай хутчэй. Зараз разумею, што ўсё прыходзіць з вопытам, апошні, у сваю чаргу — з гадамі. Больш таго, стараюся вучыцца на чужых памылках і іншым раю. Напрыклад, пасля таго, як стала сведкай сутыкнення аўтамабіляў на перакрыжаванні, ніколі, як бы ні спяшалася, не рызыкну крануцца з месца на міргаючае зялёнае святло. Бо не па чутках ведаю, што аварыі на перакрыжаванні, як правіла, маюць трагічныя наступствы. У той дзень машына, якая ехала перада мной, на маіх вачах перакулілася некалькі разоў. Дзякуй богу, ні малады чалавек, які быў за рулём, ні жанчына-кіроўца, якая справажала здарэнне, моцна не пацярпелі. Але, шчыра прызнацца, было такое адчуванне, быццам я сама трапіла ў гэтае ДТЗ. Ведаеце, праца ў аддзеле агітацыі і прапаганды найбольш моцна паўплывала на маё ўспрыняцце дарожнай абстаноўкі. І гэта зразумела, бо я ж не магу расказваць людзям адно, а выязджаючы на дарогу, супярэчыць сваім жа ўрокам.

— Вы хочаце сказаць, што, каб стаць узорным кіроўцам, трэба папрацаваць агітатарам?

— Работа ў ДАІ, безумоўна, абавязвае да больш правільных паводзінаў на дарозе. Але ў Беларусі і сярод людзей іншых прафесій дастаткова шмат культурных кіроўцаў. Чаго не магу сказаць, у прыватнасці, пра Егіпет ці Турцыю, дзе мне даводзілася адпачываць. У Хургадзе, напрыклад, некалькі святлафораў на ўвесь горад. А гаворкі пра тое, каб саступіць дарогу пешаходу, там нават няма. Усе на свой страх і рызыку перабягаюць дарогу. У іншым выпадку можна прастаяць паўдня — і ніхто табе не саступіць. Ведаеце, у такія моманты яшчэ больш люблю нашу краіну, з яе дагледжанымі і роўнымі дарогамі, беларускіх культурных кіроўцаў і пешаходаў, якіх, дзякуй богу, значна больш, чым парушальнікаў. Зразумела, ёсць сітуацыі, калі чалавеку жыццёва неабходна парушыць правіла дарожнага руху. Напрыклад, была такая сітуацыя, калі па дарозе ў радзільны дом у жанчыны пачаліся роды, і яе мужу нічога не заставалася, як перавысіць хуткасць. Мы стараемся ставіць сябе на месца іншых людзей, якія робяцца парушальнікамі ў сілу крайняй неабходнасці, ідзём ім насустрач. Але, што датычыцца хуткасці, то кожны кіроўца павінен памятаць прапісную ісціну: чым цішэй едзеш, тым далей будзеш. Бо менавіта з-за перавышэння хуткасці адбываецца больш за ўсё ДТЗ з цяжкімі наступствамі. Не дарэмна ж так часта праводзяцца спецаперацыі «Хуткасць», ды і камеры відэаназірання ўстанаўліваюць на дарогах рэспублікі.

— Вольга, а ці даводзілася выязджаць на трагічныя ДТЗ?

— На маіх вачах, дзякуй богу, людзі не паміралі. Максімум, што даводзілася бачыць, — крывавы асфальт ды памятыя машыны. Душа сціскалася, калі ўяўляла, якое гора ў такі момант перажываюць родныя і блізкія пацярпелых. Праўда, за час вучобы ў акадэміі ды працы ў дазнанні даводзілася рознае бачыць. Хочаш не хочаш, а навучышся абстрагавацца, адключаць эмоцыі. Размяжоўваць пачуцці і працу — гэта вялікае і важнае майстэрства, асабліва для супрацоўнікаў міліцыі.

— Што не падабаецца ў кіроўцах-мужчынах?

— Я не падзяляла б кіроўцаў на мужчын і жанчын. На мой погляд, класіфікацыю трэба праводзіць не па палавой прыналежнасці, а па стажы кіравання. Бо жанчыну, у якой 10 гадоў стажу, наўрад ці можна паставіць на адну прыступку з маладым чалавекам, які за рулём тры месяцы. Некаторыя спрактыкаваныя жанчыны, згадзіцеся, любому мужчыну фору дадуць. Гэты падзел прыдумалі мужчыны, каб яшчэ раз падкрэсліць сваю перавагу над жанчынамі. Ды і трэба ж пра нешта анекдоты травіць. У жанчыны, акрамя таго, інстынкт самазахавання развіты больш, чым у мужчыны. Асабліва асцярожна паводзяць на дарозе сябе тыя жанчыны, у якіх ёсць дзеці. Тым больш, калі апошнія знаходзяцца ў салоне аўтамабіля. Калі браць статыстыку, то вельмі мала ДТЗ, у якіх пацярпелі непаўналетнія пасажыры, здзейсненыя па віне жанчыны-кіроўцы. Чаго не скажаш пра татаў-кіроўцаў. Літаральна на мінулым тыдні па віне таты, які не размінуўся з велікагрузным транспартным сродкам, сур'ёзна пацярпеў 7-гадовы пасажыр. І што б вы думалі — у крыві бацькі, якога агледзелі пасля ДТЗ, было знойдзена ажно 3,6 праміле алкаголю. Я думаю, наўрад ці мама з 3,6 праміле адважылася б сесці за руль. Чым думаў тата ў гэтай сітуацыі, асабіста мне не зразумела...

З РАСІІ — З НОВЫМ ВОПЫТАМ І ПРЫЗАВЫМ МЕСЦАМ

Беларускія школьнікі вярнуліся нядаўна з Расійскай Федэрацыі з новымі ўражаннямі па тэме бяспекі дарожнага руху.

Адбылося гэта дзякуючы паездцы чацвёркі нясвіжскіх навучэнцаў СШ № 3 разам з выкладчыкам на 5-ы Міжнародны злёт атрадаў Юных інспектараў дарожнага руху, які праходзіў у горадзе Арле, куды «зляцеліся» прадстаўнікі з многіх рэгіёнаў СНД.

Як вядома, ЮІР-аўскі рух з'яўляецца самай актыўнай і дзейснай формай работы па прафілактыцы дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму і шырока распаўсюджаны на постсавецкай прасторы. Таму візіт дзяцей з Мінскай вобласці ў «эпіцэнтр» вывучэння і прымянення на практыцы Правілаў дарожнага руху меў заканамерны характар. Куратарам паездкі выступіў начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды аддзела інфармацыйна-аналітычнай работы ДАІ УУС Мінаблвыканкама Алег Цюрын.

Як адзначыў у размове з журналістам «Звязды» Алег Мікалаевіч, арганізатары злёту сумесна з газетай «Добрая дарога дзяцінства» правялі спаборніцтвы «Эрудыты бяспекі дарожнага руху». Дзеці ў гульнявой форме паказалі свае веды па гісторыі Дзяржаўтаінспекцыі, веданне Правілаў дарожнага руху, аказання даўрачэбнай дапамогі, гісторыі развіцця аўтамабіля і аўтамабільных дарог. Вынікам актыўнай работы беларускай дэлегацыі, падкрэсліў падпалкоўнік міліцыі Алег Цюрын, стала заваяванне 3-га месца сярод 19 каманд. Віншуем!!!

А самае галоўнае, заключыў начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды аддзела інфармацыйна-аналітычнай работы ДАІ УУС Мінаблвыканкама, што ў выніку мерапрыемстваў 5-га Міжнароднага злёту Юных інспектараў дарожнага руху атрыманы і вывучаны досвед суседніх краін у арганізацыі работы Дзяржаўтаінспекцыі і ўжо выпрацаваны шэраг навінак для прымянення ў прапагандысцкай дзейнасці і прафілактыцы дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму, якія ўжо сёння можна прымяняць на практыцы.

ІНСПЕКТАРЫ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ ВЫСТУПІЛІ ГОДНА

У Гродне прайшоў чарговы конкурс аўтамабілістаў. Кіроўцы спаборнічалі ва ўменні паркавацца рознымі спосабамі ў эстафетным рэжыме. У конкурсе прынялі ўдзел 13 камандаў (дзесяць у класе «Аматары» і тры ў класе «Прафесіяналы»). Годна выступілі інспектары ДПС ДАІ капітаны міліцыі Андрэй Дмухоўскі і Алег Кандратовіч. Па выніках трох заездаў сярод прафесіяналаў іх дуэт заняў першае месца. Сярод аматараў перамогла каманда Grodno Drive Club.

❑

У пачатку кастрычніка ў Гродне прайшоў традыцыйны конкурс матацыклістаў, арганізаваны ДАІ горада пры падтрымцы байк-клуба «Насарогі». Спаборніцтвы праходзілі ў некалькі тураў, адзін з якіх заключаўся ў тым, каб праехаць пэўную адлегласць на матацыкле як мага марудней. У выніку самым спрытным быў прызнаны матацыкліст Андрэй Адамовіч.

ДАІ горада Гродна сумесна з аўтааматарамі правялі конкурс па паркоўцы.

Наш культурны асяродак

Жыроандоля

Выпуск № 26 (112)

«У БЕЛАРУСІ ТРЫ СТАЛІЦЫ: МІНСК, БАБРУЙСК І ПЛЕШЧАНІ́ЦЫ!»

Менавіта гэтую вядомую прымаўку ўвасобілі ў стэле ў цэнтры Бабруйска

На скрыжаванні вуліц Пралетарскай і Пушкіна ўсталяваны ўказальнік адлегласцяў ад Бабруйска да самых буйных гарадоў свету. І невыпадкова, што сярод Масквы, Нью-Ёрка, Рыма і Берліна ёсць і Плешчаніцы.

Крылатая фраза пра тры сталіцы была вядома на ўсю Беларусь яшчэ да вайны. Мелася на ўвазе, што ў невялікім гарадскім пасёлку ў Лагойскім раёне была вялікая яўрэйская абшчына. У працэнтных суадносінах — не меней, чым у Бабруйску. Адсюль і намёк на прымаўку.

Стэла зроблена з чыгуна, яе вышыня — тры метры. Ідэя ўсталяваць указальнік належыць дырэктару гарадскога «Водаканала» Алегу Цітову. Канструкцыю сабралі на Бабруйскім машынабудаўнічым заводзе. Стваральнікі мяркуюць, што стэлу ацэняць гараджане і госці горада, а таксама тыя ўраджэнцы Бабруйска, якія раз'ехаліся па ўсім свеце, але часам вяртаюцца ў свой любімы родны горад.

Ілона ІВАНОВА.

ПРА МУЖЧЫН

Дзённік бландзінкі

Наколькі люблю мужчын, якія ўмеюць гатаваць ежу, настолькі ненавіджу мужчын, якія ходзяць па прадукты.

Таму што ў кожным мужыку ад нараджэння закладзены дух канкурэнцыі, а таму ў краме яны пачынаюць паводзіць сябе так, быццам бы яны на паляванні. Хто кідаецца першы да свежаадчыненай касы? Мужчыны! Хто вечна просіцца купіць што-небудзь без чаргі? Мужчыны! Хто выхоплівае ў цябе кавалак з-пад носу? Мужчыны!

Сёння была на рынку. Падыходжу да прылаўка, дзе пакупнік гадоў пяцідзесяці ўжо разлічыўся з гандляром і хавае грошы.

Пытаю:

— Колькі капуста?

Чую адказ і кажу: «Выдатна!»

І тут мужчына, які, заўважце, ужо разлічыўся і збіраўся сыходзіць, пытаецца:

— Гэта апошні вілок?

Прадавец:

— Не, у мяне яшчэ ў машыне ёсць, магу схадзіць...

Мужчына:

— Узважвайце! А вы, дзевушка, пачакайце, пакуль ён прынясе з машыны...

Самае смешнае, што рынак літаральна завалены капустай, і ўся ў адзін кошт! Маё «выдатна» зусім не азначала, што гэта нейкая эксклюзіўна-танная суперсмачная капуста. Але я прамаўчала. Няхай думае, што ён сапраўды ўпаляваў нешта гіганцкае, не меншае за маманта ці шаблязубага тыгра! Няхай адчуе сябе хоць на момант героем...

Але ж, халера, як я ненавіджу гэтых «здабытчыкаў»! Напэўна, каб у нашым горадзе былі прадуктовыя крамы «Толькі для жанчын», толькі б у іх і хадзіла.

Ганна КІСЛІЦЫНА.

НАРОД ВЫБІРАЕ НАРОДНАГА

На раённым радыё Мядзельскага раёна праходзіць цікавы конкурс — «Народны хіт-парад», па выніках якога слухачы выберуць «Народнага артыста Мядзельшчыны».

Удзельнікі музычнага праекта — энтузіясты без спецыяльнай музычнай адукацыі, рознаўзроставыя, вясёлыя і цікавыя — прапаноўваюць на суд слухачоў свае песні. Сярод канкурсантаў — як школьнікі, так і людзі сур'ёзных прафесій: міліцыянер, дырэктар, выратавальнік... Хіты ўдзельнікаў кожны панядзелак гучаць у эфіры раённага радыё. Затым — пачынаецца народнае галасаванне, па выніках якога тры артысты пераходзяць у наступны тур, а два — выбываюць. На іх месца прыходзяць новыя канкурсанты.

За ходам хіт-парада можна прасачыць па рэпартажах, якія вядуцца на старонках «раёнкі».

Па выніках апошняга тура вызначыцца пераможца праекта, які і стане «Народным артыстам Мядзельшчыны». Гала-канцэрт пройдзе ў гарадскім Доме культуры.

Аляксандр СЯНЮЦЬ.

МАЦІ — БЕЛАРУСЬ, А ПОЛАЦК — БАЦЬКА

Дзецям малодшага сярэдняга ўзросту патлумачаць, як гэта было

Тлумачаць Навум Гальпяровіч і Наталля Ваніна, аўтары кнігі «Полацк — бацька гарадоў беларускіх», якая была прадстаўлена ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі.

Са старажытных часоў Полацк быў месцам, дзе выспявала ідэя беларускай дзяржаўнасці. Гэта горад, па якім можна спасцігаць гісторыю краіны, дзе можна наталіць душу і цікава правесці час, схадзіўшы ў музеі, на канцэрты ці аглядаючы гістарычныя будынкі. Таму Полацк стаў першай «культурнай сталіцай» краіны. Але за адзін год пра ўсё даведацца немагчыма. Кніжка дапаможа. Бо яна не толькі пра гісторыю і славутасцяў, якія яе стваралі, яна распавядае пра вядомых людзей, якія адсюль паходзяць, якія цяпер жывуць і працуюць у Полацку.

Але палачане былымі не бываюць, дзе б яны ні жылі. У Мінску летась стварылася Полацкае зямляцтва, якое прасоўвае інтарэсы «культурнай сталіцы» ў сталіцы геаграфічнай. Яны з задавальненнем распавядаюць пра здабыткі землякоў, планы і новыя кнігі. І пра бацьку гарадоў беларускіх, і пра ўсю нашу маці-краіну, дзе шмат прыгожых гарадоў з багатай гісторыяй. Кожны з іх, магчыма, атрымае неўзабаве сваю кнігу.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Кінакрокі

«БЕЛАРУСЬФІЛЬМ» ПРАРВАЛА!..

Сучасны твар беларускага кіно вызначаюць ваўкі і мядзведзі

Сучаснае беларускае кіно сёння, бадай, адна з топавых тэм усіх айчынных дыскусій. Яно сапраўды ператварылася ў аб'ект нацыянальнага значэння: на «Беларусьфільм» дзяржава вылучае немалыя сродкі. Нядаўна ў Мінску адбыліся адразу дзве гучныя кінапрэм'еры вытворчасці Нацыянальнай кінастудыі: «Ваўкі» Аляксандра Колбышава і «Масакра» Андрэя Кудзіненкі. Даць адназначную ацэнку гэтым фільмам даволі складана. Мы прапануем сваю 5-бальную шкалу якасці розных складнікаў фільмаў.

«ВАЎКІ»

5 Рэжысёр Аляксандр Колбышаў даказаў, што можа і мае права здымаць кіно. Фільм «Ваўкі» — гэта дыхтоўна знятая драма. Яшчэ да выхаду фільма ўсе казалі пра тое, што гэтая стужка павінна даказаць: адраджэнне беларускага кіно не мара, а рэальнасць. Фільм быў прызнаны лепшым на фестывалі Нацыянальнага кіно ў Брэсце. Фільм «Ваўкі» можна аднесці да асабістай удачы аўтара, які хацеў здымаць менавіта гэты матэрыял, сам жа яго кінастудыі прапаноўваў, яшчэ на пачатку 2000-х гадоў. Але да такой тэмы трэба было «даспець» не толькі яму.

...Краіна, дзе шэрыя дамы, шэрае неба, людзі з шэрымі тварамі, дзе толькі чырвоныя сцягі і кроў. Пасляваенныя часы. Кірыл Палятаеў бяжыць з цягніка, які вязе ў лагеры былых вайскоўцаў, асуджаных адразу пасля вайны. Ён бяжыць, хоць, можа, і не думаў пра гэта свядома, у той час, калі з-за снегападу цягнік спыняецца ў яго родных мясцінах. У адной з хат ён знаходзіць прытулак: бабуля з унукам яго пазнаюць і хаваюць. У вёсцы перапалох, бо ўцекача шукаюць. Шурка адводзіць Кірыла ў адну з землянак у лесе, а сам выпраўляецца ў суседнюю вёску, дзе жывуць Палятаевы. Хлопчык выклікае падазрэнне. Іх з бабуляй імкнуцца «раскалоць». Але Шурка паспявае расказаць, дзе хавае Кірыла, старшыні калгаса. Той накіроўвае паляўнічага-НКУСаўца па фальшывым следзе, а сам ідзе ў лес і пераконвае ўцекача здацца, бо яго родным будзе толькі горш. Старшыня вяртаецца дадому, дзе яго ўжо чакаюць: калі Палятаеў не з'явіцца дома да паўдня, то нічога добрага не чакай. Кірыл ідзе дадому, але ў лесе трапляе на зграю ваўкоў.

Выдатныя вобразы, цудоўна сыграныя ролі, у якіх разам з расійскімі артыстамі, Дзмітрыем Ульянавым, які іграў галоўнага героя, добра папрацавалі беларускія акцёры, напрыклад, Тамара Міронава, Зінаіда Зубкова, Уладзімір Гасцюхін.

4 І можна было б сказаць: які выдатны фільм, калі б не адно маленькае «але»... Калі б пра тыя часы, пра рэпрэсіі мы ўжо не ведалі дагэтуль. Аляксандр Чакмянёў напісаў аўтабіяграфічную аповесць напрыканцы 60-х, зрабіў па ёй сцэнар, які доўга ляжаў. Гісторыя Кірыла Палятаева ў ім распавядаецца проста і пераканаўча. Аўтар сцэнара раскрывае драму, якую перажыў не адзін чалавек у тыя часы, якая стала драмай пакаленняў, моцна паўплываўшы на развіццё краіны.

Але кожная з ўзніклых пасля яе краін, якая хоча адасобіцца ад таталітарнага мінулага, імкнецца асэнсаваць гэтую тэму ў мастацтве, з якіх найбольш масавым з'яўляецца кіно. Тэма гэтая павінна прагучаць у грамадстве дзеля нейкай вышэйшай справядлівасці. І дзеля ўласна будучага развіцця, у якое ты ідзеш з вялікім і цяжкім багажом ці скінуўшы непатрэбныя рэчы. Няхай мы адсталі на нейкі час, але галоўнае — гэты крок зроблены.

3 Наколькі ён актуальны ў сучасным беларускім кантэксце? Неадназначнае пытанне. Здаецца, і падзеі адбываюцца не ў Беларусі. Але гэта як паглядзець: шмат якія беларускія сем'і пацярпелі ад рэпрэсій. І калі б «Ваўкі» знялі напачатку 90-х, то фільм адразу выбухнуў бы. Але калі такія фільмы пачалі з'яўляцца ў Расіі, у Беларусі наогул кіно здымалася мала. Цяпер, калі сталі здымаць, нашага чалавека такім сюжэтам ужо не здзівіш. Бо ад таго моманту, калі пачынаецца паляванне людзей на чалавека, ужо можна ўявіць, чым усё скончыцца. А прадказальнасць — не вельмі добрая рыса для мастацтва.

2 Таму што глядач заўсёды хоча здзіўляцца. Альбо перажываць за героя да слёз і глыбіні душы, калі гэта драма, ці атрымаць эстэтычнае задавальненне ад таго, як гэта зроблена, калі трапляецца больш падрыхтаваны глядач. Аляксандр Колбышаў хацеў задаволіць усіх: і эстэтаў, і масавага гледача, ствараючы прадукт на мяжы арт-хаўснага і мэйнстрымавага кірунку. З аднаго боку — павольная манера апавядання, дэталі і пейзажы, якія дапамагаюць стварыць настрой і выклікаць эмоцыі, а з другога — адчуваецца, што да гэтых эмоцый нас не падводзяць паступова, а імкнуцца іх выбіць штучнымі прыёмамі, напрыклад, пафасным музычным суправаджэннем. Імкненне балансаваць «паміж», магчыма, адыграла не лепшую ролю ў тым жа фестывальным лёсе фільма і надзеях на міжнародныя прызы.

1 Адзінае (ужо не ў плане адзнакі) радуе: гэта першы поўнаметражны фільм Аляксандра Колбышава на «Беларусьфільме», першы крок у новым кірунку. За першым, магчыма, будзе наступны, больш дасканалы і актуальны.

Ларыса ЦІМОШЫК.

«МАСАКРА»

5 «Бульба-хорар» — новы жанр, прыдуманы рэжысёрам Андрэем Кудзіненкам для свайго фільма «Масакра». «Масакра» — слова запазычанае і азначае масавае вынішчэнне, жорсткае забойства. Пагадзіцеся, добрая назва для фільма, закліканага адрадзіць традыцыі містычнай плыні беларускага кінематографа. Усё ў фільме на гэта працуе: пярэваратні, загадкавыя забойствы, страх, жарсць і нянавісць, тыпажныя да жудасці героі, гістарычны кантэкст. Падзеі, дарэчы, адбываюцца ў 60-я гг. XIX ст. пасля жорсткага задушэння паўстання Каліноўскага... У маёнтак графа Пазуркевіча прыязджае мастак-авантурыст з Пецярбурга. Граф тым часам рыхтуецца да вяселля... Бульба-хорар — гэта мікст містычнага трылера, жахаў, меладрамы і эротыкі. Гэта новы крок айчыннага кінематографа, які шануе свае добрыя традыцыі: тэмы, беларускую мову, камандную працу. «Мы імкнуліся стварыць нацыянальны хіт, — распавядае Андрэй Кудзіненка, — сучасны, актуальны, цікавы людзям любога ўзросту». Сапраўды, вельмі высакародная спроба.

4 Акцёрскі склад «Масакры» такі жа разнародны і эклектычны, як сам фільм. Ролі ўсіх галоўных герояў выконваюць маскоўскія акцёры: Зміцер Мілер (граф), Андрэй Назімаў (мастак-авантурыст), Марыя Курдзяневіч (Ганна). Ролі менш значныя, але не менш жвавыя, выконваюць беларускія славутасці: вось Аляксандр Колбышаў, якога называюць «тварам сучаснага беларускага кіно», у ролі святара, які падтрымлівае паўстанцаў; вось Паліна Сыркіна ў ролі імпэтнай кухаркі-каханкі; вось Святлана Зелянкоўская ў ролі эксцэнтрычнай маладой дамы, якая, здаецца, умее толькі смяяцца; вось Аляксандр Кашпераў, Іван Мацкевіч, Сяргей Журавель, Алег Гарбуз... Усе другасныя персанажы вельмі каларытныя, але няма нейкага адзінства дзеяння ў іх гульні. Нейкай гармоніі зладжанасці. Усе быццам знаходзяцца ў сваім звыклым акцёрскім амплуа і проста добра з ім спраўляюцца паасобку. Галоўныя героі наадварот — нібыта знаходзяцца ў нейкай «унутрыкадравай» злучнасці, але ў іх гульню верыцца слаба.

3 Магчыма, таму, што сюжэтныя лініі, сюжэтныя дачыненні паміж гэтымі персанажамі недастаткова добра прапісаныя. Ганна не можа выклікацца са сваімі пачуццямі, і з таго, што адбываецца на экране, не становіцца хоць бы прыблізна зразумела, чым падмацаваныя яе дзеянні: яна страшэнна какае графа, а потым просіць мастака-авантурыста ўратаваць яе ад будучага суджанага. Граф (які аказваецца мядзведзем-пярэваратнем) здзяйсняе шэраг крывавых забойстваў, якія выглядаюць «прыцягнутымі за вушы» для таго, каб апраўдаць жанр містычнага трылера, бульба-хорару. У гэтых забойствах не атрымліваецца ўгледзець ніякай больш глыбокай матывацыі, акрамя той, што граф проста пярэварацень, проста маньяк... Ён хоча быць як усе, забыцца на сваё мядзведжае мінулае і выракчыся свайго мядзведжага роду, але чаму быць мядзведзем дрэнна — незразумела таксама. Святар у царкве чытае малітву пра тое, што мядзведзі — гэта зло. Але з прагледжанага раней не зразумела, чаму ж мядзведзі такія дрэнныя, бо свае крывавыя забойствы граф-мядзведзь здзяйсняе акурат падчас малітвы, і людзі пра іх яшчэ не ведаюць... Зрэшты, можа, гэта такі мудрагелісты сімвалізм, і граф-пярэварацень проста бароніць свой дом ад нямецкіх і польскіх акупантаў. Усё-такі не трэба забывацца, які час апісваецца ў фільме...

2 Дарэчы, пра час. Насамрэч, вельмі складана дапяць, у якую гістарычную эпоху адбываюцца падзеі. Калі б не анатацыя ў флаеры, то варыянтаў магло б быць вельмі шмат... На развіццё падзей у межах галоўнай сюжэтнай лініі (граф — Ганна — мастак) час пасля задушэння паўстання Каліноўскага наогул не ўплывае. Час быццам існуе паралельна сюжэту, паралельна экраннаму жыццю герояў — так, для антуражу, для апраўдання «нацыянальнага прадукту». Пра яго здагадваешся па асобных дэталях: забарона стрэльбаў у тыя часы, шыбенікі на дарогах і фінальная сцэна, у якой святар далучаецца да паўстанцаў, якім заўжды спачуваў. Зрэшты, і яна выглядае надта ўжо штучна для таго, каб стаць адкрыццём альбо мараллю...

1 Адзінкі, відаць, ацэняць жанравыя моманты (дэталі і алюзіі), якія здымачная група стварала выключна для сінефілаў... Вось памерла апошняя жанчына з роду графа-пярэваратня, яна ляжыць у труне, а мая зрокавая памяць настойліва падказвае: «Вій». А вось сюррэалістычныя саламяныя скульптуры — мастацкі дэбют Артура Клінава ў кіно — выдатная магчымасць для беларускіх інтэлектуалаў знайсці ў гэтым дадатковую сімволіку. А вось сам рэжысёр каментуе фільм пасля паказу: «Мы хацелі зрабіць гэткі відовішчны і адначасова «разумны» жанравы фільм: просты для масавага гледача і насычаны рознымі «кіношнымі» дэталямі для кінаманаў». Зрэшты, напэўна, так яно і атрымалася... «Масакру» можна смела назваць другім беларускім постмадэрнісцкім фільмам. А Андрэя Кудзіненку павіншаваць з тым, што ён стваральнік яшчэ і першага.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

Муз-news

СПЯВАЧКА УЛАДА ПЕРАТВАРЫЛАСЯ Ў ХАРЛЕЙ



Натуральна, адбылося гэта ў пераносным сэнсе — проста на мінулым тыдні пяючая бландзінка пакінула шэрагі зайздросных нявестаў і перайшла ў лік шчаслівых жонак, узяўшы шлюб з вядомым мінскім байкерам Сяргеем Халеем.

Журналістам Улада расказала «па сакрэце», што пазнаёмілася са сваім абраннікам летась на адной са свецкіх вечарынак — той самай, дзе былі выстаўленыя на продаж фотапартрэты папулярных эстрадных бландзінак. За партрэт Улады адзін з гасцей выклаў рэкордную суму — 280 долараў. Засталося толькі дадаць, што гэтым госцем і быў Сяргей...

Адгуляўшы шыкоўнае вяселле, на якое прыбылі не толькі родныя і сябры, але таксама больш як 30 байкераў, цыгане, фокуснікі, танцоры і мноства зорак беларускай эстрады, новастворараная сям'я ўзяла паўзу для адпачынку. Але зусім невялікую — ужо 30 лістапада, паабяцала Улада, адбудзецца яе сольны канцэрт у Белдзяржфілармоніі. Дый ад «пасады» гаспадыні святочнага агенцтва спявачка таксама адмаўляцца не збіраецца і спадзяецца паспяхова спалучаць усе тры ролі.

«БЕЗ БІЛЕТА» ПУСЦІЛІ МУЗЫКУ ПА ВЕТРЫ

Калектыў рыхтуе новае відэа на песню «Па ветры». Невялічкую частку будучага відэа — трэйлер — гурт, заінтрыгаваўшы прыхільнікаў, ужо змясціў на сваім афіцыйным сайце www.bezbileta.net.

«Кліп на маю любімую песню зняты ў маім любімым жанры, калі цягам некалькіх хвілін на экране разгортваецца кінападобная гісторыя, — характарызуе відэа рэжысёр Таня Кушнер. — Сюжэт мае крыху містычны ўхіл, дый з намі самімі падчас здымак адбываліся дзіўныя рэчы: акцёры для эпізодаў з'яўляліся ў бязлюдных месцах ніадкуль, і нават сабака, якога мы шукалі для здымак, прыйшоў да нас сам».

Выкладзены трэйлер не толькі анансуе кліп, але адначасова з'яўляецца запрашэннем на Дзень Безбілетніка-2010. Сёлета сваё «афіцыйнае» свята гурт адзначыць 7 лістапада ў КЗ «Мінск». Дарэчы, напярэдадні гэтага выступлення калектыў абвясціў для прыхільнікаў творчы конкурс на лепшае фан-відэа. Яго пераможцу лідар гурта Віталь Артыст абяцае асабіста адвезці на канцэрт.

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Вяне рута

Бяседныя песні

Юнацкая акрыленасць, узмоцненая пачуццёвай апантанасцю, падаецца ў народнай песні «Вяне рута» разгорнута і па-жыццёваму глыбокаznачна. Трываласць стасункаў між людзьмі, асабліва між закаханымі, сцвярджаецца ў песні, грунтуецца на любові — той святланоснай духоўнасці, якая з цягам часу становіцца сапраўдным каханнем. Вочы, як люстэрка душы, перадаюць духоўнае багацце асобы. А гэта заўсёды кранае іншых і прыцягвае да сябе.

Пра станоўчы вынік юнацкіх заляканняў сведчыць згадванне руты — вельмі духмянай лекавай расліны, якая прыйшла да нас з Усходу. Паводле павер'я, яна валодае магічнай сілаю. Таму імкнуліся гэтую чароўную расліну ўплесці ў шлюбны вянок, дзе яе жоўтыя кветачкі зіхцелі сонечнымі промнікамі.

Песняй «Вяне рута» родзічы і таварышы віншуюць Івана Іванавіча Цыркуна, загадчыка кафедры педагогікі Белдзяржпедуніверсітэта імя Максіма Танка з юбілеем.

ВЯНЕ РУТА

Беларуская народная песня
Вяне рута ля прысадаў:
Чарнявая дзяўчыненька —*
Мне дасада!

І не піў бы, і не еў бы, —
Да чарнявае дзяўчыны
Паляцеў бы!

Паляцеў бы, ды не мушу:
Распаліла чарнявая
Сэрца, душу.

— Ці ты п'яны, ці змыліўся,
Што ў такую некрасівую
Улюбіўся?

— Я не п'яны. не змыліўся:
У дзявочы ясны вочы
Улюбіўся!

* Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.

Раман АРЛОЎ: «Ў НЕСКЛАДОВАЕ» БУДЗЕ РАЎНЯЦЦА НА «ПЕСНЯРОЎ»!

Папулярны музыка распавёў «Звяздзе», як беларускамоўнымі песнямі яны будуць заваёўваць Маскву

НАПЯРЭДАДНІ канцэрта, які пройдзе 28 кастрычніка, праект «Ў нескладовае» быў прадстаўлены мінскім журналістам. Да гэтага часу ў інтэрнэце ўжо з'явіліся 2 песні і першы кліп. Мэты праекта самыя амбіцыйныя — заваяваць маскоўскі музычны рынак беларускамоўнымі песнямі. Як і навошта — у гутарцы з Раманам АРЛОВЫМ (які вядомы нам як экс-гітарыст J:Морс і па-сумяшчальніцтве сын пісьменніка Уладзіміра Арлова).

— Рамане, я правільна разумею, што праект «Ў нескладовае» арыентаваны ў асноўным на Маскву і маскоўскую публіку?

— Гэта сапраўды так.

— А ў вас не пыталіся там, «што за назва такая прыкольная»?

— Вось менавіта яна, можа быць, і прыдуманая ў першую чаргу для Масквы маім сябрам і партнёрам Вадзімам Марголіным. Бо гэта тое, што сапраўды робіць нас адметнымі і ўнікальнымі. Калі мы ў Маскве здымалі кліп з Міколам Батвіннікам, абсалютна розныя людзі — узбекі, турысты, італьянцы, самі масквічы — падыходзілі да нас, актыўна цікавіліся, што гэта такое, што гэта за літара. І мы сапраўды адчувалі, што робім нешта важнае.

— Асноўная ідэя — каб гэта было на беларускай мове? Бо і раней жа некаторыя беларускія гурты і выканаўцы спрабавалі заваяваць Маскву, спяваючы пры гэтым па-руску...

— Так, беларуская мова — тут галоўнае, гэта безумоўна. Ёсць амбіцыйная мэта — зрабіць пры гэтым праект яшчэ і камерцыйна папулярным у Маскве. Мы лічым, што гэта абсалютна магчыма. І такія людзі, як Арцём Троіцкі (*славуты расійскі рок-журналіст і крытык* — **Г.Л.**) у сваіх інтэрв'ю кажуць таксама, што гэта магчыма. І цікавяцца, калі ж ужо нарэшце з'явяцца спробы. А пакуль што нам даводзяць скептычныя беларускія журналісты, што гэта — немагчыма. Але мы будзем усё ж спрабаваць. І ёсць вельмі добрыя арыенціры, такія як «Песняры», «Ляпис Трубецкой», які ў апошні час прасоўвае там беларускамоўны матэрыял дастаткова актыўна.

— Дык вось на каго вы раўняецеся!..

— Ну, гэта было б для нас вельмі прэстыжна — раўняцца на іх. Але маючы такіх высакакласных вакалістаў як Рудэнка (гурт «Далі») і Чалышаў (гурт «Харлі»), я думаю, ёсць шанц стварыць матэрыял, які будзе сапраўды ўспрымацца як нейкі сэнсавы працяг «Песняроў».

— Як вы лічыце, чаму нашым паўднёвым суседзям, украінцам, удалося лепш за нас прасунуць на расійскі рынак музыку на сваёй роднай мове?

— Я думаю, што гэта моўна-псіхалагічнае пытанне. Беларусы — вельмі таленавітыя людзі, вельмі таленавітыя майстры. Заўсёды ў Маскве яны ганіліся: і на тэлебачанні, і Каломенскае пабудавана беларускімі майстрамі, Сімяон Полацкі вучыў грамаце цара, цэлыя кварталы стварылі беларусы. Беларусы вельмі шмат зрабілі і ў шоу-бізнэсе. Сярога, «Краскі» — гэта вельмі паспяховыя праекты, якія зарабілі шмат грошай і аўтарытэт. Але беларус — ён у гэты момант проста займаўся музычным шоу-бізнэсам. А ўкраінец — ён чамусьці ставіў пытанне яшчэ і так: каб гэта было па-ўкраінску, каб папулярызавала ўкраінскую мову і культуру. Хоць і ўкраінцы не ўсе такія — бо і «ВіаГРА» ж адтуль... Але ў тым канвееры ёсць не толькі «Акіян Эльзы» і «Воплі Відаплясава». Ёсць «Друга ріка», якая рабіла дуэт з «Токио», дзе «Друга ріка» спявала па-ўкраінску, а «Токио» па-руску. Як гэта часта робіцца — англа-італьянская песня, альбо англа-французская. І гэта была істотная вельмі з'ява, я бачыў гэты кліп па розных тэлевізійных каналах у топах. І я ведаю, што Ала Барысаўна Пугачова на сваю апошнюю буйную імпрэзу знарок цягнула «Другу ріку» — на ўкраінскай мове, у Маскву. Чаму не?

Беларусы — вельмі таленавітыя людзі, вельмі таленавітыя майстры. Заўсёды ў Маскве яны ганіліся: і на тэлебачанні, і Каломенскае пабудавана беларускімі майстрамі, Сімяон Полацкі вучыў грамаце цара, цэлыя кварталы стварылі беларусы.

— Можа, гэта эпатаж, мода?

— А што перашкаджае зрабіць модным беларускі праект?

— Вам не замінае папулярны стэрэатып, што многія расіяне ўспрымаюць нас як дадатак да Расіі, «Северо-западный край»?

— Ведаеце, я заўважыў, што беларусы ў значна большай ступені самі вераць у тое, што вы кажаце. Гэта нашыя стэрэатыпы — нібыта ўсе яны пра нас так думаюць. Масква — гэта Вавілон. Там цікава тое, што можа быць цікавым. Трэба спрабаваць, гэты стэрэатып трэба ламаць. І менеджар, які працаваў з J:Морсам, у часы, калі я быў у гэтай камандзе, — Табрыз Шахідзі (дастаткова аўтарытэтны ў Маскве чалавек, мы даўно з ім знаёмыя), ён у сваіх інтэрв'ю заўсёды падкрэсліваў, што беларускамоўны матэрыял у J:Морса ён лічыць камерцыйна больш перспектыўным. Бо гэта адрозніваецца ад рускамоўных спеваў. А ён — музычны аўтарытэт, гэта не я вам зараз кажу.

— У вас у рэплізе заяўлена каля двух дзясяткаў удзельнікаў праекта. Ясна, што не ўсе яны будуць удзельнічаць адначасова. Хто зараз найбольш актыўны?

— З вакалістаў адназначна найбольш актыўна прымаюць удзел Віктар Рудэнка і Яўген Чалышаў. Цяпер вось запісалі адну песню з Аляксеем Хлястовым — думаю, гэтае супрацоўніцтва працягнецца.

— Рамане, вы збіраецеся рабіць беларускамоўны праект для Масквы, але ж не ўсе ўдзельнікі вашага праекта могуць два словы па-беларуску звязаць!..

— Могуць яны звязаць!.. Тут рэч у іншым, як кажа мой партнёр Вадзім Марголін. Для Беларусі максімальна клёва і шакаладна, калі гэтых прозвішчаў будзе 20, а можа і 25. Для Масквы сітуацыя мусіць уніфікавацца. Усё мусіць зводзіцца да бэнда з адным вакалістам, максімум двума. І час пакажа. Гэта селекцыя — хочаш не хочаш, яна адбудзецца, само жыццё яе правядзе. І, напэўна, усё звядзецца да такой формы. Бо як толькі мы тут — гэта «AllStars» і ўсё па-максімуму, а як там...

— ...проста беларуская каманда прыехала.

— Менавіта.

— І вы гатовы на сябе ўзяць ролю гэтага фронтмена?

— Ну, на канцэрце 28 кастрычніка ў Мінску я буду сам выконваць пару песень. Але ідэальны расклад для мяне — гэта 2-3 вакалісты. У нейкім сэнсе, як у «Песняроў». Гэта можа і амбіцыйна прагучыць, але я адчуваю, што гэта — правільны арыенцір.

— Чаму вырашылі заваёўваць Маскву, а не Варшаву ці Кіеў? Таму, што там больш грошай?

— Таму што Масква — гэта бліжэйшы Вавілон да нас. Кіеў — гэта ўсё-ткі не Вавілон. У Кіеве запланаваны сякія-такія рухі. Трэба аддаць належнае, спрацоўваюць старыя кантакты. Сяргей Васільевіч Кузін (*колішні генеральны прадзюсар мінскага «Альфа-Радыё», цяпер паспяхова працуе ў Кіеве* — **Г.Л.**) салідарызаваўся з намі, было вельмі прыемна. Ведаеце, такі скепсіс у Мінску!.. А Кіеў і Масква радуюцца!

— А скепсіс з чым звязаны?

— З тымі самымі стэрэатыпамі, пра якія вы казалі. Кшталту «Чаго вы паедзеце да гэтых маскалёў музыку па-беларуску спяваць, ды яшчэ вашую, нецікавую».

— Рамане, дык чым вы Маскву «браць» сабраліся? Гэта тут усе ўдзельнікі вашага праекта — зоркі. А там — «хто ўсе гэтыя людзі?»...

— Глеб, мы пачынаем там з нуля, праз нейкія кантакты... Раскручваем гэта як новы прадукт, адначасова даём магчымасць зацікаўленым людзям прасоўвацца таксама з намі...

— А якая асноўная канцэпцыя — чаму расійская публіка павінна слухаць песні па-беларуску?

— Апошні канцэрт, які быў на пачатку лета, паказаў, што яна слухае проста таму, што ўспрымае гэта як якасны матэрыял. А беларуская мова прыцягвае дадатковую ўвагу.

— Які план баявых дзеянняў па далейшым піяры праекта?

— Зараз мы знялі першы кліп на песню «Ў нескладовае» і будзем старацца зняць другі кліп — на песню «Не кожны». Таму што я лічу Саша Памідорава цікавым персанажам, і ягоны хіп-хоп у гэтай песні «на незнаёмай мове» — гэта ўжо цікавей, чым поп-рок на знаёмай мове. Паралельна хочам запісаць некалькі трэкаў на англійскай мове. Я адчуваю, што гэта можа быць запатрабавана. Але мы будзем выпускаць песню па-англійску, а потым адразу ж рабіць яе беларускамоўную версію, ужо з іншымі артыстамі. Будзем старацца эксперыментаваць.

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Апошні канцэрт, які быў на пачатку лета, паказаў, што расійская публіка слухае проста таму, што ўспрымае гэта як якасны матэрыял. А беларуская мова прыцягвае дадатковую ўвагу.

МАЙ НА ЎВАЗЕ

Паслухаць песні праекта «Ў нескладовае» і паглядзець першы кліп можна, задаўшы назву гурта ў любую пошукавую сістэму (напрыклад, www.google.by). Таксама гэта можна спампаваць на маім сайце www.labadzenka.by

Канцэрт «Ў нескладовага» адбудзецца 28 кастрычніка а 19.00 у мінскім клубе «Рэактар».

ХТО БЯРЭ ЎДЗЕЛ У ПРАЕКЦЕ

У рэплізе, які трапіў да журналістаў, заяўлена, што ў праекце «У нескладовае» бяруць удзел сапраўды вядомыя ў Беларусі музыкі:

- Раман Арлоў (экс-гітарыст J:Морс)
- Вадзім Марголін
- Алег Хаменка («Палац»)
- Віктар Рудэнка («Далі»)
- Ганна Хітрык («Дзецідзецей», «Сундук»)
- Яўген Чалышаў («Харлі»)
- Аляксандр Памідораў
- Аляксей Хлястоў
- Руся («Індзіга», Akana)
- Уладзімір Пугач (J:Морс)
- Зміцер Вайтэнка
- Барыс Штэрн
- Канстанцін Гарачы
- Андрэй Сапоненка
- Аляксей і Ціхан Золатавы
- Валеры Дасюкевіч
- Андрэй Краўчанка

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



5					1			6
9	2							
8	7		5			1		
			3		7	6		
	8			1			2	
					2	7		1
	3	8			4			7
	5	4						
		9	6			4		

СУДОКУ. У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клетак, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Скарпіёнам супрацьпаказана лунаць у аблоках, а Вадалеям давядзецца хутка рэагаваць на змяненне сітуацыі

ВАЕН. Варта задумацца аб паездзцы, якая, як прадказваюць зоркі, адбудзецца праз некалькі месяцаў. Калі зараз усё спланаваць, падарожжа будзе вельмі ўдалым. У панядзелак магчымыя канфлікты на працы, таму пастарайцеся менш кантактаваць з калегамі і не трапляцца начальству на вочы. Могуць ажыццяўляцца самыя патаемныя планы і задумы.

ЦЯЛЕЦ. Магчыма змяненне месца пражывання ці працы. Панядзелак — добры дзень для стасункаў, пачатку навучання. У аўторак будуць вітацца актыўнасць і ініцыятыва з вашага боку. Серада прыдатная для разбурэння старога і пачатку новага. У гэты дзень у вас будзе вялікая прастора для выбару. У пятніцу можа з'явіцца эмацыйная слабасць. Нядзелю лепш прысвяціць пасіўнаму адпачынку: у гэты дзень не варта прымаць сур'ёзных рашэнняў.

БЛІЗНЯТЫ. Змяненне планаў, пераменлівасць у справах — тыдзень праляціць, нібы ў калейдаскопе. Калі штосьці не будзе атрымлівацца — пастарайцеся не ісці на пралом, перачакайце некалькі дзён. Чым менш вы будзеце гаварыць пра свае намеры і планы, тым хутчэй яны ажыццявяцца. Не дазваляйце апатыі і ляноце падабрацца да вас вельмі блізка. Не пачынайце спрэчкі па дробязях са сваімі хатнімі — ні да чаго добрага гэта не прывядзе.

РАК. Тыдзень прымусіць дзейнічаць нават самых лянівых. Сітуацыя абяцае скласціся такім чынам, што ад сур'ёзных крокаў адмовіцца будзе ўжо немагчыма. У панядзелак ці аўторак у вас з'явіцца магчымасць закласці падмурак для буйных пазітыўных зменаў. У сярэдзіне тыдня верагодны працаёмкія мерапрыемствы, звязаныя з навядзеннем парадку ў справах. У пятніцу давядзецца сумяшчаць інтэнсіўную дзейнасць з не менш інтэнсіўнымі кантактамі.

ЛЕЎ. Можа адчувацца стомленасць. Адпачніце ў аўторак і сераду, а з чацвярга можа пачацца імклівы ўзлёт актыўнасці і прыліў жыццёвых сіл. Справы на рабоце могуць складвацца вельмі паспяхова, асабліва ў пытаннях кар'еры. Успомніце пра старых сяброў: аднаўленне стасункаў з імі можа аказацца вельмі карысным для вас. Не забудзьцеся запрасіць сяброў у госці. Найбольш спрыяльныя дні — аўторак і серада.

ДЗЕВА. Настае спрыяльны тыдзень, які дазволіць змяніць сваё стаўленне да жыцця і плануваць новыя справы. Могуць паступіць прапановы аб змене месца працы: перш чым іх прымаць і зрывацца з месца, добра ўсё прадумайце. Аптымістычнае ўспрыманне жыцця дазволіць лёгка справіцца з цяжкасцямі, якія ўзнікаюць. У чацвер вашы канструктыўныя прапановы спадабаюцца кіраўніцтву. У пятніцу адбудзецца падзея, якая дазволіць палепшыць адносіны з калегамі. Можаце разлічваць на дапамогу родных.

ШАЛІ. Не перагружайце сябе работай: вам неабходна адпачыць. Пастарайцеся кіраваць сваім эмацыйным станам, каб ён не стаў разбуральным для навакольных. Зараз час для падвядзення пэўных вынікаў і вырашэння старых праблем, а не для пачатку новых спраў. Родныя дапамогуць у найбольш складных праблемах.

СКАРПІЁН. Вам проста неабходна цвёрда стаяць на зямлі, не лунаць у аблоках і пазбягаць незразумелых сітуацый. Вы з лёгкасцю зможаце наладжваць кантакты, схіляць да сябе патрэбных і цікавых людзей. У сераду верагодна цікавая падзея, якая станоўча паўплывае на ваш далейшы лёс. У суботу сябры парадуюць своечасовай дапамогай. Не самы лепшы час для водных падарожжаў.

СТРАЛЕЦ. З'явіцца шанц аднавіць свае пазіцыі і плённа папрацаваць. У панядзелак яркі старт і імкненне да мэты дазволяць пераадолець многія перашкоды. Але не пераацаніце свае магчымасці, інакш на наступны дзень сіл не застанецца. У аўторак прычынай канфлікту з калегамі па працы могуць стаць вашы катэгарычныя выказванні. Давядзецца адказваць за свае памылкі самастойна, прычым па двайным тарыфе. Калі бачыце, што штосьці ідзе не так, пачынайце перароблівать тут жа. Серада спрыяльная для новых пачынанняў і вынясення на прадстаўленне начальству планаў і праектаў.

КАЗЯРОГ. Будзеце добра сябе адчуваць і дасягняце поспеху ва ўсіх пачынаннях. Могуць адбыцца важныя падзеі, якія зачэпяць інтарэсы сям'і і родных. На рабоце не расказвайце пра сябе шмат, даючы нагоду для плётак. У панядзелак пастарайцеся захоўваць аб'ектыўнасць. У пятніцу не пачынайце новых спраў, не завяршыўшы старыя.

ВАДАЛЕЙ. У справах прафесійных спатрэбіцца нечаканы падыход і хуткая рэакцыя на змяненне сітуацыі. Не варта разлічваць на імгненныя вынікі і вялікі прыбытак. Асабліва разлічваць на дапамогу навакольных не варта. У чацвер высокая верагоднасць заключэння выгадных дагавораў і проста завядзення карысных знаёмстваў. У пятніцу пастарайцеся пазбавіцца ад хламу, які назапасіўся дома.

РЫБЫ. Ваша схільнасць да пабудовы паветраных замкаў можа перавярнуцца ў кучу неадкладных і вельмі запушчаных спраў, якія будзеце вымушаны перароблівать на працягу ўсяго тыдня. Прычым спробы адмовіцца ад гэтага занятку ні да чаго добрага не прывядуць. Дзелавая паездка ў прыемнай кампаніі ў сераду можа апынуцца да таго ж на рэдкасць удалай. У вас з'явіцца магчымасць пераехаць у іншы горад і нават у іншую краіну — ці гатовы вы прыняць такое рашэнне? Прыслухайцеся да мудрых парадаў старэйшых родных і прымяніце іх на практыцы.

ЗНАК ДНЯ МЕРЦВЯКОЎ



У кастрычніку ў Мексіцы, калі канчаецца сельскагаспадарчы сезон, надыходзіць час пажынаць плён сваёй працы і славіць урадлівасць зямлі. У гэтую пару мексіканцы рыхтуюцца да Dia de Muerte — Дня мерцвякоў, найважнейшага і самага ўлюбёнага з мексіканскіх святаў. Спецыяльна да гэтага дня традыцыйна гатуецца адмысловы ласунак — цукровыя чэрапы.

Мексіканцы штогод гатуюць гэты ласунак да Дня мерцвякоў, які праходзіць 1 і 2 лістапада. У гэты дзень прынята прыходзіць на могілкі да сваіх родных, прыносячы з сабой тэкілу, любімую ежу нябожчыкаў і цукровыя чэрапы з іх імёнамі на лобе. Мексіканскі культ смерці — Santa Muerte — бярэ пачатак у культуры ацтэкаў. Свята праходзіць як збор сям'і і сяброў, каб памаліцца за памерлых і ўспомніць тых, хто загінуў. Імпрэза адбываецца 2 лістапада, практычна супадаючы з каталіцкімі святамі — Днём Усіх Святых (1 лістапада) і Днём памінання нябожчыкаў — Дзядамі (2 лістапада).

Да Дня мерцвякоў у мексіканскіх крамах і на кірмашах можна ўбачыць акуратныя піраміды з цукровых чэрапаў, выстаўленыя на прылаўках. Чэрапы часта выкарыстоўваюцца ў мексіканскай культуры і ў прастамоўі завуцца «Калавера». Яны з'яўляюцца падарункамі, якія могуць сімвалізаваць як жывых, так і мёртвых, іх прынята ярка дэкараваць. Падрыхтоўка чэрапаў пачынаецца з замесу цукровай масы. Масу забіваюць у адмысловыя формы, пасля чаго выкладваюць на дошку для прасушкі.

Zамор'е

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

У АЎСТРАЛІІ ВЫКРАЛІ МОСТ

У невялікім населеным пункце Белмонт у аўстралійскім штаце Новы Паўднёвы Уэльс выкралі шасціметровы драўляны мост.

Інцыдэнт адбыўся літаральна адразу пасля таго, як падрадчык скончыў працу над канструкцыяй. «Пэўна, у зладзеяў пайшло не менш за тры-чатыры гадзіны на тое, каб дэмантаваць мост. Ён жа не маленькі, яго нельга проста так узяць, пакласці ў машыну і павезці», — адзначыў прадстаўнік мясцовых уладаў Лоры Каленаў.

Ён паведаміў, што мост быў зроблены дыхтоўна — для зборкі канструкцыі была выкарыстаная добрая драўніна, надзейна змацаваная нітамі. Пра далейшы лёс выкрадзенага моста пакуль нічога не паведамляецца. Час ад часу масты становяцца аб'ектамі крадзяжоў у розных краінах свету. Часта зладзеі выбіраюць металічныя масты, якія можна разабраць на асобныя дэталі, а затым здаць іх на металалом. Акрамя мастоў, злачынцы таксама зважаюць і на фантаны. Напрыклад, нядаўна ў Аўстраліі выкралі двухсоткілаграмовы бронзавы фантан вышынёй крыху менш за два метры.

ДЗЕ ВЫ НАБЫЛІ ВАЛАСАТЫЯ КАЛГОТКІ?

Паважаная і вельмі самавітая амерыканская кампанія J.Crew аскандалілася. Калготкі, якія там выпусцілі, зблізу выглядаюць як быццам зусім прыстойна. А на некаторай адлегласці ствараюць выразнае ўражанне, што ў жанчыны, якая іх надзела, вельмі валасатыя ногі.

Гэты жах прадаваўся за 22 долары 50 цэнтаў, а рэкламныя аб'явы абвяшчалі, што калготкі — «неабходны элемент для стварэння таго спалучэння тканін, якое дыктуе мода ў гэтым сезоне». Але вытворцаў хутка паднялі на смех блогеры, якія пісалі, што дзяўчыне-мадэлі тэрмінова патрабуецца брытва. Кампанія J.Crew была створаная ў 1983 годзе. Адмысловую ўвагу да яе прыцягнула нядаўна Мішэль Абама, якая заявіла, што любіць гэтую марку і сваіх дочак адзявае толькі ў гэтую прадукцыю. Відаць, цяпер амерыканцы з асаблівай увагай будуць разглядаць ножкі сваёй першай лэдзі і «першых дачок».

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БЕЗ РЭЦЭПТА

Травы на мёдзе

Усе ведаюць, што мёд карысны для здароўя. Ён валодае многімі лекавымі ўласцівасцямі, у тым ліку імунабіялагічнай, супрацьмікробнай, супрацьзапаленчай. Мы і не задумваемся пра гэта, калі п'ём гарбату з духмяным падарункам ад пчол. Між тым, ёсць у мёдзе яшчэ адна асаблівасць: ён узмацняе дзеянне зёлак, якія мы выбіраем для лячэння. І калі правільна прыгатаваць лекавы напой з мёдам, можна хутчэй ачуняць і ўмацаваць свой арганізм.

ВАЖНАЕ ПРАВІЛА

Наступныя лекавыя травяныя напоі ўмацоўваюць, танізуюць, стымулююць работу ўсіх органаў і сістэм, не аказваюць адмоўнага пабочнага дзеяння на арганізм. Адхаркавальныя сродкі дапамагаюць хутчэй справіцца з любой прастудай, якая праходзіць без ускладненняў, а заспакаяльныя ў наш час часта неабходныя нават здаровым людзям. Ёсць напоі і для павышэння апетыту.

Толькі памятайце адно важнае правіла: *не дадавайце мёд у напоі, тэмпература якіх вышэй за 40°! Усе напоі з мёдам можна ўжываць толькі ў цёплым стане, тады мёд не толькі не згубіць свае каштоўныя якасці, але і значна ўзмоцніць дзеянне зёлак.*

УМАЦАВАЛЬНЫЯ

- Вазьміце корань дзівасілу — 1 ч. лыжку, корань цыкорыі і плады шыпшыны — па 2 ч. лыжкі. Расліны здрабніце ў кавамолцы ці растаўчыце ў ступцы. 1 ч. лыжку збору заліце шклянкай кіпеню і дайце настояцца ў тэрмасе 2-3 гадзіны. Піце настой з мёдам па шклянцы 1-2 разы на дзень на працягу 2-3 тыдняў пры сіндроме хранічнай стомленасці, пасля перанесеных хваробаў.
- Лісце крапівы двухдомнай, суніц лясных і траву скрыпеню змяшайце пароўну. Заліце 0,5 л кіпеню 1 ст. лыжку збору і дайце настояцца ў тэрмасе на працягу гадзіны. Гатовы настой працадзіце. Піце з мёдам па шклянцы 2-3 разы на дзень на працягу месяца пры слабасці, нізкім гемаглабіне, хуткай стамляльнасці.

ДЛЯ АПЕТЫТУ

- Змяшайце па 1 частцы суквецця крываўніку і травы святаянніку, 2 часткі лісця маліны звычайных. Сталовую лыжку збору заліце 0,5 л кіпеню і пакіньце настойвацца на 2 гадзіны. Піце па палове шклянкі з мёдам за 20—30 хвілін да яды 2-3 разы на дзень на працягу месяца.
- Вам спатрэбіцца па 1 частцы лісця трыпутніку і палыну, 2 часткі календулы. Прыгатуйце напой, як у папярэднім рэцэпце, і піце па той жа схеме.

СУПРАЦЬ КАШЛЮ

- Складзіце збор з 1 часткі травы падбелу, 2 частак травы крынічніку і 3 частак буквіцы лекавай. Усё добра перамяшайце, сталовую лыжку збору заліце шклянкай кіпеню, настойвайце на працягу гадзіны, дадайце чайную лыжку мёду. Піце па трэці шклянкі перад ядой 3-4 разы на дзень.

ЗАСПАКАЯЛЬНЫЯ

- Вазьміце пароўну травы мелісы і кветак рамонку аптэчнага. Заліце шклянкай кіпеню 1 ч. лыжку збору, настойвайце гадзіну. Піце з мёдам па шклянцы 1-2 разы ў другой палове дня на працягу месяца.
- Па 1 частцы размарыну звычайнага і руты пахучай, 3 часткі пладоў рабін добра перамяшайце. Заліце 0,5 л халоднай вады 1 ст. лыжку сумесі. Давядзіце да кіпення, пакіньце на 2 гадзіны настойвацца. Піце з лыжкай мёду 2 разы на дзень на працягу месяца.

СУПРАЦЬПАКАЗАННІ

На жаль, не ўсе людзі добра пераносяць мёд. Пры павышанай адчувальнасці да мёду і прадуктаў пчалаводства яго трэба ўжываць з асаблівай асцярожнасцю. Тое ж самае датычыцца і хворых на дыябет.

-2698-

САКРЭТЫ ПРЫГАЖОСЦІ

Пяць прадуктаў для здароўя валасоў

Тварог. Гэта крыніца бялку і кальцыю. Вельмі карысны тварог тым, у каго валасы сякуцца. Часцей ешце малатлусты тварог на сняданне, рабіце з яго маскі для валасоў.

Рыба. У ёй змяшчаюцца вітамін B_{12}, бялок і цынк, якія папярэджваюць выпадзенне валасоў.

Ялавічына. Як і ў рыбе, у ялавічыне змяшчаюцца бялок і цынк, а яшчэ жалеза. Яна карысная пры знясіленых валасах. Лепш ужываць тушанае і варанае мяса.

Свініна. Змяшчае вітамін В, цынк і пратэін. Усё гэта неабходна для здаровага бляску валасоў. Старайцеся есці свініну без тлушчу.

Яйкі. Крыніца бялку, які ў першую чаргу неабходны для прыгожых здаровых валасоў. З'ядайце 1-2 яйкі на тыдзень, лепш вараныя ці ў амлеце. Рабіце з бялку маскі для валасоў. Самая простая — узбіце злёгку бялок, уватрыце ў валасы, а праз 15 хвілін змыйце.

ПАДКАЗКІ СПРАКТЫКАВАНЫХ

Даглядаем трыкатаж

У халодную пару года ў трыкатажных вырабах мы адчуваем сябе цёпла і ўтульна. Аднак з-за таго, што любімыя джэмперы і світары мы апранаем пад верхняе адзенне, на іх ўтвараюцца галачкі, а пасля частага мыцця блякнуць фарбы і губляецца форма.

- Шарсцяныя вязаныя вырабы неабходна мыць асобна ад іншага адзення. Вязаныя рэчы можна замочваць у халаднаватай вадзе не больш чым на 30 хвілін, інакш яны садзяцца і збіваюцца. Любы трыкатаж пажадана мыць уручную і пры гэтым не церці, а толькі сціскаць. Яго нельга расцягваць і выкручваць.
- Парашок хутчэй растае ў гарачай вадзе, у якую трэба дадаць халодную да неабходнай тэмпературы. Лепш выкарыстоўваць мыйныя сродкі, якія не змяшчаюць адбельвальнікі, біядабаўкі, шчолачы і іх злучэнні, а таксама тыя, што не прызначаныя для мыцця шарсцяных вырабаў. Нельга сыпаць парашок непасрэдна на трыкатажную рэч.
- Для першага паласкання вырабаў з шэрсці вада абавязкова павінна мець тую ж тэмпературу, што і пры мыцці. Паласкаць трэба старанна, бо рэшткі мыйнага сродку, што засталіся ў вырабах, могуць сапсаваць іх колер. У апошнюю ваду для паласкання дадайце спецыяльную вадкасць, якая выдаліць статычную электрычнасць і надасць вырабу пушыстасць.

Калі на трыкатажных вырабах ёсць устаўкі з замшы, скуры ці футра, іх неабходна здаваць у хімчыстку.

- Вымыты трыкатаж ні ў якім разе нельга вешаць. Рэч неабходна спачатку злёгку адціснуць, затым закруціць у ручнік і адціснуць да паўсухога стану. Дасушвайце трыкатаж пры пакаёвай тэмпературы, расклаўшы на роўнай паверхні ў далечыні ад абагравальных прыбораў і сонечных прамянёў.
- Высушаныя вырабы можна злёгку адпарыць прасам. Калі рэч з доўгім ворсам, прасаваць трэба з левага боку, акрамя рэльефных узораў: пры адпарванні яны становяцца плоскімі.

- Утварэнне галачак на трыкатажы непазбежнае, аднак іх можна паспрабаваць выдаліць спецыяльнай шчоткай ці станком для галення без ліпкай палоскі. Для гэтага выраб трэба раскласці на цвёрдай гладкай паверхні і вельмі асцярожна, лёгкімі рухамі па ходзе нітак «пагаліць». Галачкі знікнуць, і ваша рэч стане як новая.

-2699-

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд + судоку (16 кастрычніка).

Па гарызанталі: Халва. Станцыя. Мар. Цана. Туя. Ліса. Гмах. Лісце. Граматыка. Кан. Мірт. Астма. Карп. Шаг. Апрош. Мур. Міна. Гама. Кета. «Нос». Сіта. Буерыст.

Па вертыкалі: Грош. Ястраб. Агуці. Сталагміт. Варта. Актан. Сцяг. Тампак. Млынар. Егіпет. Танга. Ост. Хлам. Ік. Раман. Трумо. Яхтсмен. Прас.

Судоку: адказы гл . у табліцы.

6	2	3	9	8	1	7	4	5
7	8	4	6	5	2	1	9	3
5	1	9	3	7	4	6	2	8
2	6	8	4	1	9	5	3	7
4	3	5	8	6	7	2	1	9
1	9	7	5	2	3	4	8	6
9	5	6	2	4	8	3	7	1
3	7	2	1	9	5	8	6	4
8	4	1	7	3	6	9	5	2

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.52	17.55	10.03
Віцебск —	7.45	17.42	9.57
Магілёў —	7.42	17.45	10.03
Гомель —	7.36	17.45	10.09
Гродна —	8.06	18.10	10.04
Брэст —	8.04	18.14	10.10

Месяц

Поўня ў 4.37.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Андрэя, Інакенція.*

К. *Іветы, Марлены, Тэкілы, Ігната, Севярына, Тодара, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

Дзве даты

23 кастрычніка

1940 год — нарадзіўся Пеле (Эдсан Аранціс ду Насіменту), славуты бразільскі футбаліст, трохразовы чэмпіён свету. У 2002 годзе прызнаны ФІФА лепшым футбалістам XX стагоддзя.



1956 год — у Венгрыі пачалося антысавецкае паўстанне: у гэты дзень дзясяткі тысяч жыхароў Будапешта выйшлі на вуліцы, патрабуючы вываду з краіны савецкіх войск, свабоды друку, шматпартыйнай сістэмы і г.д. Да вечара колькасць дэманстрантаў дасягнула 200 тыс. чалавек. На бок ужо ўзброеных дэманстрантаў перайшло некалькі армейскіх падраздзяленняў. Пры іх падтрымцы дэманстранты захапілі будынак нацыянальнага радыёцэнтра, дзе сакрэтная паліцыя была вымушана адкрыць агонь. Паўстаўшыя разбілі на дробныя кавалачкі гіганцкую статую Сталіна. З'явіліся першыя забітыя і параненыя. Адметнымі рысамі венгерскіх падзей сталі радыкалізм і непрымірымасць іх удзельнікаў, адбылося сапраўднае ўзброенае паўстанне супраць Савецкага Саюза і яго прыхільнікаў. Вуліцы залілася кроў, часам зусім нявінных ахвяр, як, напрыклад, падчас масавага лінчавання раз'юшаным натоўпам венгерскіх партыйных актывістаў і навабранцаў сакрэтнай паліцыі на пляцы Рэспублікі — ахвярамі «народнага» самасуду сталі 28 чалавек, з іх 26 — супрацоўнікі дзяржбяспекі. Венгерскі прэм'ер Імрэ Надзь, які вярнуўся да ўлады, паспеў у некалькі адпушчаных яму лёсам, гісторыяй і Крамлём дзён уручыць савецкаму амбасадару Юрыю Андропаву заяву пра выхад Венгрыі з Варшаўскага дагавора і яе нейтралітэце і паведаміць па радыё ўсяму свету пра вайну паміж венграмі і рускімі.

Цытата дня:

«Калі ваша дзіця не будзе адчуваць, што ваш дом належыць і яму таксама, ён зробіць сваім домам вуліцу».

Надзін дэ Ротшыльд, баранеса.

СУСТРЭЧА МАЛАДЫХ НА ПАРОЗЕ БАЦЬКОЎСКАЙ ХАТЫ

На сучасных гарадскіх вяселлях распаўсюджаны звычай завяршаць маршрут вясельнага картэжу ля парога сталовай, кафэ ці рэстарана, дзе маладых будуць сустракаць бацькі. Аднак не спяшайцеся ехаць туды адразу ж пасля рэгістрацыі шлюбу.

Давайце ўспомнім шлях маладых ад самага пачатку:

1. Вясельны абрад пачынаецца ў хаце жаніха.
2. Затым са сваёй дружынай жаніх едзе па нявесту.
3. Вясельны картэж у поўныя зборы паедзе ў загс — храм і наведае памятныя месцы.
4. З улікам таго, што рух вясельнага картэжу пабудаваны ў адпаведнасці з накірункам руху сонца, ён павінен пад'ехаць да хаты нявесты з правага боку. На парозе маладых сустрэнуць бацькі нявесты, і на працягу 1-2 дні вяселле будзе праходзіць у хаце маладой, з пераважным удзелам яе радні і некаторых запрошаных з боку жаніха.
5. Пасля таго, як у хаце нявесты будзе падзелены каравай, сабраны пасаг, маладыя паедуць працягваць вяселле ў хаце жаніха. Вясельны картэж і ў гэтым выпадку павінны выканаць агульнае патрабаванне: пад'ехаць да хаты «па сонцы». На парозе хаты іх сустрэнуць бацькі жаніха.

Нашым сучаснікам хочацца шчыра пажадаць закончыць рух вясельнага картэжу па крузе, тым самым замкнуць яго (кола) — а для гэтага неабходна вярнуцца, хай нават на некалькі хвілін, у бацькоўскую хату.

- Перад парогам хаты бацькі сустракаюць маладых хлебам-соллю.
- Хлеб-соль, з якім бацькі будуць сустракаць маладых, павінны ляжаць не на белай частцы ручніка, а на чырвонай, або на чырвоных яго канцах, зведзеных разам (сярэдзіну ручніка можна скласці ў некалькі разоў).
- Маці маладой трымае хлеб-соль, а бацька на падносе — бутэльку з гарэлкай і дзве чаркі. Бацька налівае маладым па чарцы гарэлкі (у ранейшыя часы гэта была медавуха), але піць яе нельга (!!!). Маладыя павінны паднесці чаркі да вуснаў, адчуць горкі смак і тут жа правай рукой выліць гарэлку цераз левае (!) плячо за спіну. З правага боку ў чалавека знаходзіцца анёл-захавальнік, а з левага — змей-спакуснік. Гэты рытуал паўтараецца. За трэцім разам чаркі неабходна разбіць, і зноў-такі правай рукой цераз левае плячо.
- Існуе прымета: шчаслівым і доўгім будзе шлюб у тым выпадку, калі абедзве чаркі разаб'юцца.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Прыходзіць хлопец у ваенкамат:

— Хачу служыць на флоце.

— А ты хоць плаваць умееш?

— А што, у вас караблёў няма?

☺

Я веру ў роўнасць. Лысыя мужчыны павінны жаніцца з лысымі жанчынамі.

☺

З тлумачальнай:

«Я, бялявая дурніца на «Маздзе», павярнула туды, куды захацела, чым справакавала ДТЗ. Са слоў даішніка запісана дакладна».

☺

Па выніках сацыялагічнага апытання, самым папулярным друкаваным выданнем сярод расіян з'яўляюцца грошы...

КАЛІ ХОЧАШ СА СМАКАМ БЕКОНУ, ТРЭБА КРЫХУ ПАЧАКАЦЬ

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 5179. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12